С. В. ГОВІН

# ДРУК ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

* ЛЯ ВЫТОКАЎ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ
* МАСАВАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ
* ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ «ЗМАГАННЯ»
* ЗА РОДНУЮ МОВУ, НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КУЛЬТУРУ
* ПАКАЗАЛЬНІК ВЫДАННЯЎ

С. В. ГОВІН

# ДРУК ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

(1921—1939 гг.)

Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна
Мінск 1974

**Говін С. В.**

Г57 Друк Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Мн., Выд-ва БДУ, 1974.

96 с. с илл.

У рабоце разглядаюцца пытанні ўзнікнення і развіцця масавага дэмакратычнага друку ў Заходняй Беларусі перыяду акупацыі яе буржуазна-памешчыцкай Польшчай (1921—1939 гг.), асвятляецца яго барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных Заходняй Беларусі, раскрываюцца характар і ўмовы гэтай барацьбы.

Работа будзе цікавай гісторыкам, журналістам, студэнтам гуманітарных факультэтаў. Бібліяграф. у падрадк. заўвагах.

Г $\frac{0610-029}{М\ 317-74}$ 43—74 002(9)+9(с3)

© Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. 1974 г.

## АД АЎТАРА

*На працягу амаль дваццаці гадоў (1921—1939) значная частка беларускіх зямель (Заходняя Беларусь) знаходзілася пад прыгнётам польскай буржуазіі і памешчыкаў. Гэта быў перыяд самаадданай барацьбы працоўных заходніх абласцей за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з Савецкай Беларуссю ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве. Немалаважную ролю ў гэтай барацьбе адыгралі Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (1922—1924 гг.), Беларуская сялянска-рабочая грамада (1925—1927 гг.), Беларускі сялянска-рабочы клуб «Змаганне» (1928—1930 гг.), Таварыства беларускай школы (1921—1936 гг.), якія выступалі за інтарэсы працоўных, заклікалі да светлай будучыні, абуджалі ў іх рэвалюцыйную свядомасць.*

*Кожная дэмакратычная арганізацыя мела свой друкаваны орган, які быў сродкам уплыву на працоўнае сялянства, рабочы клас і інтэлігенцыю. Дэмакратычная прэса шырока асвятляла жыццё рабочых і сялян, паказвала ўмацаванне брацкага саюза паміж імі, выступала за інтэрнацыянальныя сувязі паміж беларускім, польскім, літоўскім і ўкраінскім народамі.*

*Аўтар гэтай кнігі імкнуўся прааналізаваць ролю дэмакратычнага друку ў фарміраванні грамадскай думкі Заходняй Беларусі, у барацьбе за саюз рабочага класа і сялянства, у выпрацоўцы рэвалюцыйнага светапогляду працоўных мас.*

*Работа напісана на аснове матэрыялаў партыйнага архіва Інстытута гісторыі партыі*

*пры ЦК КПБ (ПА ІГП пры ЦК КПБ), Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Літвы (ПА ІГП пры ЦК КПЛ), Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР (ЦДАКР і СБ БССР), Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літоўскай ССР (ЦДА Літ. ССР), фондаў рэдкай кнігі і рукапісаў бібліятэк АН БССР і АН Літоўскай ССР, матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ДА Брэсцкай вобласці), Дзяржаўнага музея БССР, Брэсцкага гісторыка-краязнаўчага і Бярозаўскага гісторыка-рэвалюцыйнага музеяў, выданняў КПП, КПЗБ, КСМЗБ, дэмакратычных, буржуазных і нацыяналістычных партый і арганізацый, друку СССР, БССР, ПНР.*

*Аўтар шчыра ўдзячны былым дзеячам КПЗБ і навуковым работнікам В. Склубоўскаму (Беласток), П. Крынчыку (Слонім), Л. Война (Вільнюс), А. Бергман (Варшава), С. Татарыну (Зельвенскі раён), В. Ласковічу (Брэст), М. Арэхве, А. Мацко, У. Палуяну (Мінск) за іх парады і дапамогу пры напісанні гэтай работы.*

## ЛЯ ВЫТОКАЎ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ

Рэвалюцыйна-дэмакратычныя нацыянальна-вызваленчыя арганізацыі. Заходняй Беларусі і іх друк адыгралі ў час белапольскай акупацыі (1921—1939 гг.) значную ролю ў фарміраванні грамадскай думкі і згуртаванасці рэвалюцыйных сіл у барацьбе з польскімі абшарніцка-памешчыцкімі ўладамі, афіцыйнай і буржуазнай прэсай, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных і ўз'яднанне з БССР, у выкрыцці здрадніцкай ролі беларускай нацыяналістычнай буржуазіі.

Дэмакратычныя арганізацыі мелі друкаваныя органы, якія, пераадольваючы перашкоды і цяжкасці на сваім шляху, цэнзурныя рагаткі, выходзілі досыць рэгулярна ў Вільні, Гродна, Беластоку і іншых гарадах. Калі выданне газеты было немагчымым на тэрыторыі Заходняй Беларусі, яна друкавалася ў Львове, Варшаве, Берліне.

Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), Беларуская сялянска-рабочая грамада (БСРГ), Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне» (БСРПК «Змаганне») у сваёй дзейнасці скарыстоўвалі вопыт выдавецкай работы РСДРП(б), КПП, КПЗБ, польскіх дэмакратычных партый і неслі да працоўных словы праўды. Зразумела, што кіраўнікі дэмакратычных арганізацый і іх прэса не заўсёды былі паслядоўнымі ў ідэалагічных поглядах, але пад ідэйным уплывам КПЗБ яны пераадольвалі памылкі і станавіліся на марксісцкія пазіцыі.

Велізарны ўплыў на развіццё свядомасці шырокіх народных мас у барацьбе за свабоду і незалежнасць аказвала дэмакратычная прэса, у тым ліку і друк Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі.

Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя існавала каля двух гадоў. Яна ўтварылася пасля расколу партыі беларускіх эсэраў, у час падрыхтоўкі Польшчы да выба-

раў у сейм і сенат. Ініцыятарам стварэння БРА стала частка перадавой заходнебеларускай інтэлігенцыі, якая раней за іншых вызвалілася ад ілюзій «сужыцця»,— вядомы публіцыст і грамадскі дзеяч І. Лагіновіч, публіцыст, паэт і драматург Л. Родзевіч, грамадскія дзеячы А. Канчэўскі, А. Капуцкі.

БРА паставіла сабе мэтай рэвалюцыйную барацьбу ў Заходняй Беларусі за вызваленне яе з-пад улады белапольскіх акупантаў і далучэнне да Савецкай Беларусі.

Газета «Глос комуністычны», друкаваны орган КРПП, 26 лютага 1924 года пісала: «...належнае месца БРП[1] ёсць у братняй партыі, гэта значыць у Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, састаўной частцы Камуністычнай рабочай Польскай партыі».

Аднак БРА ў першы перыяд свайго існавання паўтарала многія тэзісы, якімі карысталася партыя беларускіх эсэраў: негатыўная пазіцыя адносна дыктатуры і гегемоніі пралетарыяту, ідэя рабоча-сялянскага ўрада як каліцыі «рэвалюцыйных» рабочых і сялянскіх партый пасля вызвалення, адсюль — тактыка адзінага фронту ўсіх так званых «сацыялістычных партый». І самае галоўнае, бадай,— адмаўленне класавага расслаення ў Заходняй Беларусі, існавання «сваёй» нацыянальнай буржуазіі, змен у сацыяльным складзе беларускай вёскі. Гэта вяло да тэорыі самабытнасці, асобных шляхоў у развіцці беларускага народа, да памылковага сцвярджэння, што нацыянальнае вызваленне працоўных Заходняй Беларусі ёсць і класавае вызваленне рабочых і працоўнага сялянства.

Як бачна, тэарэтычныя памылкі кіраўнікоў БРА — гэта памылкі партыі рускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якіх яшчэ ў 1902 годзе крытыкаваў У. І. Ленін у творы «Чаму сацыял-дэмакратыя павінна аб'явіць рашучую і бязлітасную вайну сацыялістам-рэвалюцыянерам?» Ён пісаў: «Палавінчатыя адносіны да рабочага руху непазбежна вядуць да фактычнага адхілення ад яго, і ў сілу гэтага адхілення партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў пазбаўлена ўсякага сацыяльнага базісу. Яна не апіраецца ні на адзін грамадскі клас, бо нельга назваць класам групы няўстойлівай інтэлігенцыі, якая называе «шыратой» сваю расплывістасць і беспрынцыпнасць»[2].

[1] Беларуская рэвалюцыйная партыя — так газета называе БРА.
[2] У. І. Ленін. Творы, т. 6, стар. 153.

У БРА на першых парах наглядаліся два напрамкі: тая частка арганізацыі, што складалася з некаторых інтэлігентаў і кулакоў, у сілу сацыяльнай неаднароднасці цягацела да эсэраўшчыны, другая ж — бядняцка-серадняцкая — да сацыялізма. Кіраўнікі БРА імкнуліся прымірыць барацьбу паміж імі. У. І. Ленін у тым жа творы пісаў, што апора ў роўнай меры як на інтэлігенцыю, так і на пралетарыят і сялянства, незалежна ад волі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, вяла «...да палітычнага і ідэйнага заняволення рускага пралетарыяту рускай буржуазнай дэмакратыяй»[3].

За ростам палітычнай свядомасці членаў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі ўважліва сачыла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, дапамагаючы кіраўнікам яе вызваліцца ад памылак. Уплыў КПЗБ на лідэраў БРА, зразумела, дадатна ўздзейнічаў на свядомасць усіх членаў арганізацыі. Менавіта КПЗБ і яе вядучая роля ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе змаглі стварыць у далейшым умовы пераходу БРА на пазіцыі КПЗБ.

Было яшчэ некалькі аб'ектыўных прычын, якія аказалі рэвалюцыянізуючы ўплыў на членаў БРА. І ў першую чаргу — вызваленне лідэраў БРА ад ілюзій выбараў у сейм і сенат 1922 года, якія праводзіліся пад знакам новага наступлення на правы народаў нацыянальных меншасцей.

Перыядычныя выданні БРА чакаў цяжкі лёс, тым не менш выходзілі яны рэгулярна, нягледзячы на пастаянныя канфіскацыі, вобыскі ў рэдакцыях, арышты і здзекі над супрацоўнікамі. Толькі ў 1923 годзе ў Вільні было закрыта 7 беларускіх газет, у тым ліку друкаваны орган БРА газета «Наш сцяг» (затым «Вольны сцяг»)[4].

На акупіраванай тэрыторыі правы друку рэгуляваліся распараджэннем камісара ўсходніх зямель «Аб часовых правілах для прэсы» ад 17 ліпеня 1919 года. Пасля прыняцця новай канстытуцыі (сакавік 1921 года) у артыкулах 104—105 былі абяцаны правы свабоды друку. 10 мая 1927 года было падпісана распараджэнне прэзідэнта аб друку. У лютым 1930, лістападзе 1938 гадоў прыняты новыя правы друку, але ўсе яны, як правіла,

[3] У. І. Ленін. Творы, т. 6, стар. 153.
[4] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ФДВ, адз. зах. 1303, стар. 41.

заставаліся толькі на паперы. Якія толькі захады, накіраваныя на тое, каб спыніць друкаванне радыкальных выданняў на мовах народаў меншасцей, не рабіліся. І ўсё гэта тлумачылася неабходнасцю аховы дзяржавы, ладу, захавання грамадскага парадку і грамадскай бяспекі, знешніх інтарэсаў, касцёла і рэлігіі. Зразумела, для ўрадавай ці паланафільскай прэсы такія бар'еры не былі перашкодай. Вось чаму на працягу двух з палавінай гадоў (1923—1925) было закрыта 15 беларускіх перыядычных выданняў, а з 300 нумароў газет 50 канфіскаваны. Не маючы магчымасці наладзіць выданне перыядычнага органа з-за штрафаў і канфіскацый, прыходзілася карыстацца выпускам аднадзёнак, але і яны мелі нялёгкі лёс.

Радыкальная прэса не фінансавалася дзяржавай. Выдавалася яна ў асноўным на сродкі працоўных, якія паступалі ад падпіскі ці добраахвотных збораў, а таксама на пасольскія адлічэнні. Беларускія паслы[5] адлічвалі са сваіх акладаў на патрэбы друку 100—300 злотых кожны месяц.

Распаўсюджвалася радыкальная прэса, як правіла, па падпісцы, але ўлады знаходзілі розныя «метады» перашкод на яе шляху. Газеты канфіскоўваліся нават мясцовай паліцыяй ці затрымліваліся паштовымі служачымі. Часта трэба было браць дазвол паліцыі на перасылку падпісчыкам нават не канфіскаваных нумароў.

Усё гэта вяло да таго, што кіяскёры і разносчыкі газет баяліся браць беларускія выданні для продажу, каб не папасці ў няміласць мясцовай паліцыі. Іх часта распаўсюджвалі самі работнікі рэдакцый, прадавалі ў час выступленняў на мітынгах паслоў Беларускага пасольскага клуба і г. д. Л. Родзевіч у 8 нумары органа БРА «Наш сцяг» (30 чэрвеня 1923 года) змясціў артыкул «Змагайся», у якім пісаў, што, нягледзячы на рэпрэсіі, прыцясненні, «кожная беларуская вёска тым ці іншым спосабам павінна атрымліваць сваю газету, мусіць чытаць сваю газету». У снежні 1924 года было распаўсюджана 5 тысяч «Інтэрпеляцый беларускіх паслоў», выдадзеных Беларускім пасольскім клубам, 560 экземпляраў іх атрымаў Беласток, 1680 — Брэст, 950 — Пінск, 420 — Баранавічы, 500 — Варшава[6].

---

[5] Паслы — так называліся дэпутаты польскага сейма.
[6] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 18, арк. 39.

Орган БРА карыстаўся паслугамі так званых «зіцрэдактараў»[7], якімі ў розныя часы былі Л. Рыдлеўскі, Г. Клімашэўская, М. Шыла, М. Груша і іншыя. Некаторыя з іх нават не раздзялялі думкі рэдакцыі, тым не менш падпісвалі газету да выхаду ў свет. Калі рэдакцыя ведала, што нумар будзе канфіскаваны, частку надрукаванага тыражу прыхоўвалі, а затым распаўсюджвалі нелегальна. Закрывалася адна газета, а рэдакцыя рыхтавалася ўжо да выдання наступнай: шукалі новага «зіцрэдактара», бралі дазвол, прычым назву мянялі толькі часткова, каб даць зразумець чытачу, што орган выходзіць па-ранейшаму. За час дзейнасці Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя выдала 83 нумары газеты, у тым ліку 5 аднадзёнак, 11 нумароў былі канфіскаваны.

Назву газета мяняла чатыры разы. Спачатку «Наш сцяг» выходзіў два разы на тыдзень. Новая справа давалася з цяжкасцю — не хапала ні літаратурных сіл, ні матэрыяльных сродкаў. Але з кожным нумарам газета заваёўвала ўсё большую папулярнасць сярод працоўных, праходзячы праз паліцэйскія кардоны да сваіх чытачоў у самыя аддаленыя куткі. Працоўныя пісалі ў газету, дапамагалі грашыма. Усё гэта давала магчымасць газеце быць бліжэй да жыцця. Яна пачала выходзіць тры разы на тыдзень.

Рэдакцыйную работу вялі: І. Лагіновіч, які пісаў перадавыя артыкулы і міжнародныя агляды, Л. Родзевіч рэдагаваў публіцыстыку і карэспандэнцыі; удзельнічалі І. Канчэўскі[8], С. Рак-Міхайлоўскі і іншыя паслы Беларускага пасольскага клуба, супрацоўнічалі М. Гарэцкі[9], У. Суліма. Матэрыялы змяшчаліся пад псеўданімамі. І. Лагіновіч, як правіла, падпісваўся сваім прозвішчам, ставіў ініцыялы ці псеўданім Лаўрыновіч[10]. Л. Родзевіч меў псеўданімы Р. Юргілевіч, Р. Юрг; І. Канчэўскі — І. Абдзіралавіч; С. Рак-Міхайлоўскі — Баўтручонак. Ёсць у газеце артыкулы, падпісаныя псеўданімам К. Фальке-

[7] Так звалі тых, хто падпісваў газету, але не аказваў на яе ніякага палітычнага ўплыву.

[8] Брат А. Канчэўскага, памёр у 1923 г. у Вільні.

[9] У 1923 годзе М. Гарэцкі пераехаў у Мінск.

[10] Э. Кучкоўская лічыць, што гэты псеўданім належыць С. Рак-Міхайлоўскаму. Мы павінны зазначыць, што такое сцвярджэнне няправільнае, бо яшчэ ў «Новым жыцці», газеце, якую рэдагаваў І. Лагіновіч, гэтым псеўданімам ён падпісаў 6 перадавых артыкулаў. Гл. «Навуковы зборнік». Беласток, 1964, стар. 140—141.

віч. Гэты аўтар добра разбіраўся ў марксісцка-ленінскай філасофіі і пісаў, як правіла, тэарэтычныя артыкулы[11].

І. Лагіновіч, выдавец і рэдактар «Нашага сцяга», не быў навічком у журналістыцы[12]. Ён працаваў карэктарам беларускага выдання, затым стаў рэдактарам-выдаўцом газеты «Новае жыццё», якая выходзіла з 3 сакавіка па 18 мая 1923 года. У другім нумары яе (10 сакавіка 1923 года) у артыкуле «Безрабоцце» ён папулярна тлумачыў прычыны беспрацоўя ў Польшчы, якія бачыў не ў спекуляцыях гандляроў, не ў імкненні рабочых, каб прамысловыя тавары прадаваліся даражэй, а прадукты сельскай гаспадаркі танней, а ва ўсім капіталістычным ладзе, у капіталістычнай сістэме гаспадарання, якая вяла эканоміку краіны да канкурэнцыі, перавытворчасці, крызісаў.

Затым выйшлі аднадзёнкі «Беларуская доля» (23 мая), «Зарава» (26 мая), шэсць нумароў газеты «Наша жыццё». У кожным з гэтых выданняў удзельнічаў І. Лагіновіч. Выступаючы на старонках дэмакратычнай прэсы, ён набываў вопыт журналіста.

Першы нумар «Нашага сцяга» выйшаў 5 чэрвеня 1923 года пасля некаторай падрыхтоўчай работы. У ім былі дакладна размеркаваны матэрыялы кожнага аддзела, рубрыкі. На першай паласе змяшчаліся перадавыя артыкулы і артыкулы на важнейшыя тэмы ў грамадскім жыцці Польшчы і замежных краін, на другой — матэрыялы на ідэалагічныя тэмы, на трэцяй — крытыка эндэкаў[13], пэпээсаўцаў[14], паказ работы сейма, жыцця працоўных, хроніка рэвалюцыйнай барацьбы, на чацвёртай — карэспандэнцыі чытачоў, матэрыялы аб жыцці працоўных у БССР, адказы чытачам. Рубрык было больш як 20. Толькі жыццё БССР асвятлялася ў наступных з іх: «З беларускага жыцця», «З цэлай Беларусі», «З Мінска», «З Савецкай Беларусі» («З Усходняй Беларусі»), «Па Гомельшчыне», «Па Віцебшчыне» і інш.

Тэматыку выступлення газеты можна падзяліць на некалькі груп. Гэта распрацоўка і папулярызацыя ідэа-

---

[11] Псеўданім не раскрыты.

[12] Адказваючы на пытанні анкеты дэлегата VI з'езда КПП, І. Лагіновіч у графе «прафесія і як доўга працуе» запісаў: «журналіст, з 1922 года».

[13] НД — партыя народных дэмакратаў.

[14] ППС — польская сацыялістычная партыя.

логіі, тактыкі БРА, у першую чаргу нацыянальнай праблемы, у тым ліку адносін да СССР і БССР, распрацоўка пытанняў узаемаадносін рабочага класа і працоўнага сялянства, работы сярод сялян; крытыка ППС, паказ работы КРПП, а таксама беларускіх арганізацый у Вільні; масавы рух у Заходняй Беларусі.

У перадавым артыкуле першага нумара газеты «Наш сцяг» (5 чэрвеня 1923 года), напісаным І. Лагіновічам, гаварылася аб прычынах наступіўшых цяжкасцей у жыцці заходнебеларускага народа. Аўтар выкрывае палітыку польскіх улад у час выбараў у сейм 1922 года, «дэмакратыю» польскай буржуазіі, якая нацыяналізм прыкрывала фігавым лістком дэмакратычнага лозунга аб роўнасці ўсіх нацыянальнасцей пад панаваннем «найдэмакратычнейшай у Еўропе рэспублікі».

Якія ж задачы былі выстаўлены ў артыкуле перад працоўнымі масамі? Газета заклікала да пільнасці, арганізаванасці беларускага народа. Артыкул заканчваўся страфою з верша Я. Купалы: «Гэй, наперад, покі сэрца б'ецца, рвецца на прастор! Годзе млеці ў паняверцы, гэй, да сонца, гэй, да зор!»

«Працоўная гушча», «усенародны ідэал», «сонца», «зоры» — вось такой расплывістай і неакрэсленай тэрміналогіяй карысталіся ў друку БРА яе ідэолагі ў першы перыяд існавання арганізацыі. Праўда, з метафарычнасцю ў некаторых артыкулах трэба таксама лічыцца, бо легальны орган у «сонцы» і «зорах» бачыў тую светлую будучыню, да якой заклікаў заходнебеларускі народ. «Крамолу» на старонкі газеты паліцыя не прапусціла б.

Найбольш поўна «Наш сцяг» імкнуўся асвятляць нацыянальнае пытанне — балючую і хвалюючую праблему. У другім нумары (9 чэрвеня) газеты быў змешчаны артыкул К. Фалькевіча: «Дэмакратыя, пралетарыят і нацыянальнае пытанне». Вызначаючы сутнасць заходнееўрапейскіх дзяржаў, аўтар артыкула сцвярджаў, што буржуазная дэмакратыя не зможа ніколі вырашыць нацыянальную праблему. Пасля першай сусветнай вайны толькі невялікая частка народаў атрымала права на сваё нацыянальнае самавызначэнне, аднак тыя, хто яго не атрымаў, не пераставалі быць народамі. Іх аўтар назваў «недзяржаўнымі» (народамі, якія не маюць сваёй дзяржаўнасці) і аднёс да іх заходнебеларускіх працоўных, якіх панская Польшча пазбавіла не толькі права на са-

мавызначэнне, але нават на самастойнае культурнае развіццё. Лозунгі аб федэрацыі, якімі кідаліся Пілсудскі і К°, аб роўнасці і свабодзе цяпер былі забыты. Гэта паказвала сапраўдны твар акупантаў.

Дзе ж выйсце? Якімі сродкамі заходнебеларускі народ зможа дабіцца свайго вызвалення? Толькі барацьбой. У якасці прыкладу ў артыкуле выстаўляўся СССР, дзе пралетарыят меў адвагу і волю на практыцы рэалізаваць, правесці ў жыццё тое, што прызнаваў справядлівым у тэорыі. Савецкі Саюз — вось адзіная дзяржава, якая даказала, што яна ўмела вырашае нацыянальную праблему на аснове раўнапраўя нацыянальнасцей, саюза рабочых і сялян кожнай нацыі пры дыктатуры пралетарыяту.

У цэлым правільны артыкул сцвярджаў, аднак, памылковыя думкі. Так, гады ваеннага камунізма, а затым нэпа ў СССР аўтар характарызаваў як гады «вялікарускага пралетарыяту і вялікадзяржаўя камуністычнай інтэлігенцыі», як перыяд «дэнацыяналізацыі» Беларусі «маскоўскімі цэнтралістамі».

Нацыянальнае пытанне, зразумела, было самым балючым, таму яшчэ ў першым нумары газеты, змяшчаючы артыкул «Аб нацыянальным пытанні», рэдакцыя папярэджвала, каб кожная сацыяльная партыя мела сваю выразную тактыку, бо нацыяналізм шкодны для пралетарскага руху. Газета пісала: «Польская буржуазія імкнецца разбіць пралетарскую еднасць, пасеяць нацыянальную нянавісць. Рабочыя пануючай нацыі павінны паказаць, што яны не згодны з тактыкай сваёй буржуазіі, пад буржуазнай уладай не можа быць і гутаркі аб нацыянальным вызваленні. Шлях да вызвалення як сацыяльнага, так і нацыянальнага — гэта барацьба з буржуазіяй. Трэба помніць, што пралетарыят вызваліцца ад панавання адной буржуазіі, дык не на тое, каб падпасці пад уладу сваёй буржуазіі»[15].

Да нацыянальнай праблемы газета звярталася ў артыкулах «Арыентацыя на сябе» (Лаўрыновіча, 20 чэрвеня), «Патрэбнасць класавай свядомасці» (Юргілевіча, 3 ліпеня), «Нацыянальнае пытанне і пралетарыят» (Кумельгана, 13 студзеня 1924 года). Вось артыкул «Нацы-

[15] «Наш сцяг», 1923, 5 чэрвеня.

янальнае пытанне і пралетарыят». У ім ужо няма і ценю той расплывістасці, што мелася спачатку пры вызначэнні суадносін класавай барацьбы з барацьбой нацыянальнай: «...Гэтае пытанне можа развязаць толькі пралетарыят у рамках сацыялістычнага гаспадарання,— пісала газета,— бо толькі сацыялістычны лад знішчыць усялякія формы вызыску і ўціску, у тым ліку і нацыянальнага. Сацыялізм жа павінен падыходзіць да вырашэння гэтага пытання з пункту гледжання прызнання поўнага права кожнай нацыянальнасці на самавызначэнне, і не толькі ў тэорыі, але на практыцы і ў сваёй штодзённай культуры павінен распачаць барацьбу за здзяйсненне гэтага лозунга.

Толькі пралетарыят можа адначасова з класавым вызваленнем здзейсніць і нацыянальнае вызваленне»[16].

Толькі сацыяльнае вызваленне, сацыялістычная рэвалюцыя дасць вырашэнне і другога пытання — нацыянальнага. І, як правіла,— арыентацыя на Савецкую Беларусь, на далучэнне да яе. Гэтая думка праходзіла нават праз артыкулы, якія, здавалася б, не распрацоўвалі вялікіх праблем. «Газета варшавска» ў адным са сваіх нумароў прапанавала для заходнебеларускага і заходнеўкраінскага народаў замест «гражданкі» (кірыліцы) увесці ў якасці абавязковай лацінку, якою карысталіся і некаторыя беларускія газеты. «Змаганне» змясціла артыкул «Замах на культуру»[17], у якім правільна пісала, што гэта будзе канчатковым падзелам беларускага народа не толькі ў існуючых межах, але і ў пісьменнасці, культуры, бо ўвядзенне лацінкі пазбавіць народ магчымасці карыстацца дасягненнямі, што здабыты ў БССР, дасягненнямі папярэдніх пакаленняў.

Орган БРА не раз падрабязна аналізаваў зямельную праблему ў Савецкай Беларусі, растлумачваючы новы зямельны Кодэкс, які ўступіў у сілу з 15 красавіка 1923 года[18]. Газета «Голас беларуса» у нумары ад 16 сакавіка 1924 года ў карэспандэнцыі «Ножніцы сходзяцца» з прыемнасцю пісала аб упарадкаванні цэн на прамысловыя і сельскагаспадарчыя тавары.

---

[16] «Змаганне», 1924, 13 студзеня.
[17] «Змаганне», 1923, 21 лістапада.
[18] Гл. «Зямельны Кодэкс у Савецкай Беларусі» («Наш сцяг», 1923, 9 чэрвеня).

Газета «Наш сцяг»[19] паведамляла аб уручэнні прадстаўнікамі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ноты польскаму паслу ў Маскве аб уваходзе БССР у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Уважлівыя адносіны да жыцця Савецкага Саюза, асабліва да навукі і культуры, змяшчэнне матэрыялаў побач з тымі, што расказвалі аб праследаваннях і арыштах у Заходняй Беларусі, аб закрыцці школ, бібліятэк, пераконвалі чытачоў ў праваце сістэмы сацыялізма, гартуючы іх сілы да новай барацьбы. У невялікім малюнку-рэпартажы з Мінска аб уступных экзаменах у першы дзяржаўны універсітэт (БДУ)[20] паказвалася тое новае, што прыйшло да моладзі Савецкай Беларусі— упэўненасць у сваіх сілах, цяга дзяцей рабочых і сялян да ведаў. Побач — невялічкі артыкул Р. Юргілевіча «Хто вучыць нашых дзяцей?», у якім расказвалася, што адзін польскі настаўнік, відаць, атручаны нацыяналістычнай прапагандай, выказваў пагардлівыя адносіны да беларускага працоўнага народа[21].

Такія матэрыялы, зразумела, выхоўвалі ў працоўных нянавісць да прыгнятальнікаў.

Пытанні тэорыі і тактыкі орган БРА распрацоўваў, як правіла, у газетах, што выходзілі перыядычна. Адначасова ж інфармавалі чытача аб падзеях у жыцці працоўных, аб рэвалюцыйнай барацьбе.

Праз артыкулы газеты «Жанчына і класавая барацьба» (9 чэрвеня), «Вёска спіць» (3 ліпеня), «Паслы і грамадзянства» (3 кастрычніка) і іншыя праводзілася думка аб класавай барацьбе, саюзе рабочых і сялян, брацкіх інтэрнацыянальных сувязях і сумеснай барацьбе заходнебеларускага, украінскага, польскага, літоўскага і яўрэйскага пралетарыяту.

Аднак нацыяналістычныя ноткі калі-нікалі прабіваліся на старонкі газеты, асабліва ў першы час існавання БРА. 20 чэрвеня 1923 года «Наш сцяг» змясціў перадавіцу Лаўрыновіча «Арыентацыя на сябе». Прычынай для яе напісання паслужыў артыкул украінскай газеты «Громадський голос», у якім гаварылася пра старыя дэкларацыі Антанты аб прызнанні за Усходняй Галіцыяй аўтаноміі і які заклікаў украінскі народ арыентавацца на

[19] «Наш сцяг», 1923, 22 ліпеня.
[20] «Вольны сцяг», 1923, 30 верасня.
[21] «Наш сцяг», 1923, 13 чэрвеня.

«рабочыя масы». Лаўрыновіч рабіў вывад, што ўкраінскі народ можа выбіраць у нацыянальна-вызваленчай барацьбе: абапірацца на нацыянальную буржуазію ці на рабочы клас. У Заходняй жа Беларусі нацыянальная буржуазія настолькі слабая, што арыентуецца на буржуазію пануючай нацыі — польскую. Аўтар заклікае абапірацца на працоўныя масы і тую частку інтэлігенцыі, якая спачувала ім. «Арыентацыя толькі на сябе, бо працоўныя сяляне і рабочыя элементы складаюць галоўную масу нашага народа,— піша ён.— А з гэтага вынікае, што наша нацыянальная ідэалогія павінна быць неразрыўна з ідэалогіяй працоўнай, сялянска-рабочай.

Такая «арыентацыя на сябе»— адзіная дарога для ўсяго беларускага адраджэнскага руху. Яна адна толькі і можа ўсцерагчы наш рух ад памылак і не даць яму збіцца на пагібельны шлях»[22].

Недакладныя фармуліроўкі ў вызначэнні класаў уносілі блытаніну ў ідэалогію арганізацыі. Калі дапоўніць яе яшчэ і «арыентацыяй на сябе»— становішча рабочых і сялян было зусім не зразумелым. Аднак пад пастаянным уздзеяннем Кампартыі погляды кіраўнікоў БРА змяняліся і яна ўсё часцей пачала заклікаць да адзіных інтэрнацыянальных дзеянняў з польскім пралетарыятам.

БРА імкнулася выпрацаваць у асяроддзі сялянства свядомасць барацьбітоў, аб'яднаць яго ў класавай барацьбе. 3 жніўня 1923 года ў 20 нумары «Нашага сцяга» быў змешчаны артыкул «Вёска спіць», які заклікаў да сумеснай барацьбы: «Трэба зліватца разам вёска з вёскай, гміна з гмінай, абапіраючыся на рабочы клас. Таму мы слабыя, што кожны ідзе асобна: рабочыя сабе, а сяляне сабе. Тутака (У Польшчы.— *С. Г.)* бедната вясковая нічым не розніцца ад беднаты мясцовае. Вось таму нам трэба разам ісці, бо выпадае адна дарога.

Чым хутчэй беларускія сяляне паразумеюцца з беларускімі, польскімі і яўрэйскімі працаўнікамі (рабочымі.— *С. Г.*), тым хутчэй здабудуць яны паляпшэнне сваёй долі. Бо вялікая сіла ў яднанні»[23].

Газета выкрывала тых, хто імкнуўся супрацьпаставіць сялянства рабочаму класу. У артыкуле «Сяляне і рабочыя» тлумачылася палітыка павышэння цэн, рас-

---

[22] «Наш сцяг», 1923, 20 чэрвеня.
[23] «Наш сцяг», 1923, 3 жніўня.

крывалася сапраўднае аблічча капіталізму. Цэны на збожжа і іншыя прадукты сельскай гаспадаркі былі нізкімі, а на прамысловыя — высокімі. Гэтыя абставіны капіталісты і абшарнікі тлумачылі тым, што вінаваты тут, маўляў, рабочыя, якія ўвесь час патрабуюць павышэння зарплаты, прымушаючы фабрыкантаў павялічваць цэны на фабрычныя тавары. У сапраўднасці ж справа абстаіць інакш: «Прычыны высокіх цэн не ў высокай заработнай плаце, яна менш цяпер, чым перад вайной, а ў высокіх даходах капіталістаў і гандлёвых пасрэднікаў, якія на рынках устанаўліваюць высокія цэны»[24].

Гарадскі рабочы таксама зацікаўлены ў ніжэйшай цане вопраткі і абутку, бо ён таксама купляе іх са свайго мізэрнага заробку. Падводзячы вынікі, газета піша аб тым, што рабочыя і сяляне павінны аб'яднацца і арганізавана выступаць супраць капіталу, дабівацца даваеннай платы для рабочых, кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем прадуктаў прамысловасці і земляробства, што дазволіць спыніць рост дарагоўлі і несуразмернасць аплаты, працы і цэн тавараў.

Кумельган у артыкуле «Працоўныя гарадоў і вёсак» пісаў, што ад дарагоўлі цяжка як рабочым, так і сялянам. Цэны ж узвінчваюцца таму, што ў Польшчы нездаровая фінансавая палітыка. Адна з галоўных прычын — падзенне курсу польскай маркі. І газета не магла аб гэтым маўчаць. Інфляцыя польскай маркі была страшэннай. Для фінансавання ваенных выдаткаванняў была выпушчана велізарная колькасць папяровых грошай. У пачатку кастрычніка 1923 года карабок запалак каштаваў 500 марак (раней 120), кілаграм солі — 5000 (1000), літр бензіну — 7000 (700), літр газы — 5000 (350), чыгуначныя тарыфы ўзраслі на 100 працэнтаў, паштова-тэлеграфныя — на 200[25]. Рабочы-беларус атрымліваў каля 200 тысяч марак у дзень. Гэта была мізэрная зарплата, бо каб купіць боты, яму трэба было працаваць амаль паўгода[26].

Польскі ўрад у красавіку 1924 года ў момант часовай стабілізацыі правёў грашовую рэформу. Марка была заменена злотым па курсу: 1 злоты — 1,8 мільёна марак[27].

[24] «Вольны сцяг», 1923, 3 кастрычніка.
[25] «Вольны сцяг», 1923, 5 кастрычніка.
[26] «Змаганне», 1923, 16 снежня.
[27] «Polityka», 1970, 30 мая, стар. 11.

Цяжкае эканамічнае становішча, палітычнае бяспраўе выклікалі незадавальненне сялян і рабочых. 12 верасня 1923 года забаставалі 150 рабочых тартака ў Жардэлі Вішнёўскай гміны Валожынскага павета. З кожным месяцам на тартаку змяншалася заработная плата, ствараліся ўсё больш невыносныя ўмовы для працы і жыцця. Пражытачны мінімум рабочага складаў чвэрць таго, што лічыўся «нармальным». Не вытрымаўшы жорсткай эксплуатацыі і здзекаў, рабочыя вырашылі стварыць на тартаку прафесіянальны саюз. Калі аб гэтым даведалася паліцыя, у бараках кожную ноч пачалі рабіць вобыскі, правяраць дакументы, арыштоўваць ні ў чым не павінных людзей[28].

Газета сваім словам дапамагала бастуючым. У адным з артыкулаў яна выказала шчырае прывітанне тартачнікам, якія ўступілі на шлях арганізаванай барацьбы за свае правы, і жадала ім поспехаў. Забастоўка працягвалася больш месяца і закончылася перамогай, патрабаванні рабочых прадпрыемства былі задаволены.

Газета Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі выступала за павышэнне актыўнасці паслоў Беларускага пасольскага клуба, бо першыя крокі ў вызначэнні пасольскай тактыкі мелі велізарнае значэнне, яна вучыла паслоў з сеймавай трыбуны змагацца за правы працоўных. Але беларускія паслы ў першы перыяд не праяўлялі вялікай актыўнасці.

З 1922 года, з часу масавых арыштаў на Беласточчыне і Гродзеншчыне, у астрогах сядзелі беларускія палітвязні, якіх абвінавачвалі ў выступленнях супраць існуючага ладу. Рыхтаваўся так званы «працэс 45». 8 чэрвеня 1923 года ў Гродна з Варшавы выехаў пасол сейма С. Баран — старшыня Гродзенскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпеўшым ад вайны. Па дарозе дадому ён быў арыштаваны паліцыяй. У яго забралі паперы, грошы, дакументы. Праз два дні С. Баран быў адпраўлены ў Беласток. Яго далучылі да ўдзельнікаў «працэсу 45»[29].

З пратэстам супраць беспрэцэдэнтнага кроку паліцыі, якая парушыла закон пасольскай недатыкальнасці, выступілі прадстаўнікі камуністычнай фракцыі С. Круліюўскі і С. Ланцуцкі, а беларускія паслы прамаўчалі.

[28] «Вольны сцяг», 1923, 11 верасня, 14 лістапада.
[29] «Наш сцяг», 1923, 13 чэрвеня.

У час следства над беларускімі палітычнымі вязнямі ў Беластоку адміністрацыя прымяняла фізічную сілу. 53 вязні аб'явілі галадоўку, патрабуючы аддзяліць іх ад крымінальнікаў, права свабодных (а не праз краты) сустрэч з роднымі і інш. У выніку шасцідзённай галадоўкі памёр беларус Бандарчук. Тады адміністрацыя пачала прымяняць «штучнае кармленне». Палітзняволеных падвяргалі пабоям, здзекваліся над імі. З жанчынамі абыходзіліся так, як і з мужчынамі, і яны хадзілі з акрываўленымі ратамі, у сіняках.

Аднаму са зняволеных удалося перадаць на волю ліст. Ён пісаў: «Звяртаюся да паслоў Беларускага пасольскага клуба з мальбою аб абароне... Прышліце камісію дактароў, прыязджайце самі. Паглядзіце на «збаўленых ад голаду» ахвяр гуманнасці астрожнай адміністрацыі... Аўгення Матэйчук і Захаровіч пасля паноўніх «кармленняў» зусім аслабелі... раты ў іх разарваны... твары папухлі...»[30]

Ліст быў напісаны ў пачатку жніўня. Змясціўшы яго, «Вольны сцяг» зрабіў прыпіску ад рэдакцыі, у якой паведамлялася, што ў Беластоцкі астрог выязджаў пасол П. Валошын, які ўстанавіў, што факты здзекаў над вязнямі-беларусамі сапраўды мелі месца. У картцы Бандарчука было запісана, што памёр ён ад запалення лёгкіх. Абследаванне памёршага паказала, што ў яго было выкалана вока, пашкоджана глотка. Пасля заканчэння галадоўкі памерлі яшчэ два палітвязні-беларусы.

У пахаванні Бандарчука і яго таварышаў прынялі ўдзел тысячы рабочых Беластока — палякаў і беларусаў, якія разам выйшлі на вуліцы горада, каб выказаць свой гнеў і нянавісць да ўлад.

І зноў — толькі паслы камуністычнай фракцыі С. Крулікоўскі і С. Ланцуцкі ўнеслі ў сейм прапанову аб стварэнні сеймавай камісіі з 13 чалавек для расследавання фактаў катавання і здзеку над беларускімі палітычнымі вязнямі ў Беластоку. Паслы Беларускага пасольскага клуба прамаўчалі і на гэты раз.

23 чэрвеня 1923 года газета выступіла з артыкулам «Чаму маўчаць беларускія паслы?». 28 жніўня старшыня Беларускага пасольскага клуба Б. Тарашкевіч напісаў «Адкрытае пісьмо да міністра ўнутраных спраў».

---

[30] «Вольны сцяг», 1923, 31 жніўня.

Пісьмо было апублікавана 31 жніўня ў газеце «Вольны сцяг». Б. Тарашкевіч ад імя БПК патрабаваў неадкладнага расследавання бесчалавечнасці польскай дэфензівы.

Улады не адказалі на пратэсты, а камісія так і не была створана. Але гэта ўскалыхнула працоўныя масы


ВОЛЬНЫ СЬЦЯГ

№ 10. Вільня, Серада, 3-га кастрычніка 1923 г. Год I.

Паслы і грамадзянства.

Рыс. 1.

і яшчэ раз дало магчымасць беларускім паслам пераканацца ў тым, што менавіта сеймавая трыбуна павінна стаць адной з форм барацьбы супраць прыгнёту.

Першыя вынікі сеймавай барацьбы, а разам з тым і тактычныя заданні на будучае выстаўляў і артыкул Лаўрыновіча «Паслы і грамадзянства», змешчаны ў «Вольным сцягу» 3 кастрычніка 1923 года (рыс. 1). Артыкул быў напісаны па справаздачы Беларускага пасольскага клуба да гадавіны яго дзейнасці. Лаўрыновіч выкрываў тактыку ўрада генерала Сікорскага ў адносінах да народаў нацыянальных меншасцей як ашуканскую. Чаму беларускія паслы не могуць выканаць ніводнага пункту сваёй праграмы? — «...бо польскі сейм, польскі ўрад, польскае грамадства без розніцы кіраўнікоў і партый супрацівяцца нашым дамаганням, ламаючы нават пастановы Версальскага трактату, якія абавязваюць

Польшчу забяспечыць правы нацыянальных меншасцей. Бо польскае грамадзянства яшчэ не вылечылася ад тае цяжкае хваробы, якая называецца звярыным нацыяналізмам, і, нягледзячы на балючыя ўдары за гэта ў заграмічнай палітыцы, Польшча ўсё яшчэ летуціць аб поўным вынішчэнні нацыянальных меншасцей у межах свайго гаспадарства»[31].

У артыкуле даводзілася, што са слабым, несвядомым, неарганізаваным улады не лічацца. Толькі сумленны голас паслоў і народа праб'е сцяну, якою адгарадзілася польская грамадскасць ад нацыянальных меншасцей.

Артыкул заклікаў да падтрымкі паслоў беларускім народам. Але занадта многа ўвагі аддавалася сеймавай барацьбе, якая не давала ніякіх вынікаў. І зноў — заклік «арыентавацца на сябе», бо, маўляў, польскае грамадства адгарадзілася сцяною ад меншасцей. На самай справе гэта было не так. Лепшыя прадстаўнікі польскага народа — камуністы, члены камуністычнай фракцыі ў сейме першымі з сеймавай трыбуны выступілі з патрабаваннем даць незалежнасць заходнебеларускаму народу, даць магчымасць самім працоўным вызначыць свой лёс. «Прабіць сцяну» магла толькі рэвалюцыйна-вызваленчая барацьба беларускіх працоўных мас у інтэрнацыянальным саюзе з класавай барацьбой польскага пралетарыяту.

Артыкул меў шэраг іншых памылак: заклікаў увязваць дзейнасць БПК з дзейнасцю Беларускага нацыянальнага камітэта, не раздзяляў беларускіх паслоў на тыя групоўкі, што ўтварыліся ў клубе ў гэты час.

Другі артыкул Лаўрыновіча «Аб тактыцы ў сейме» быў змешчан 12 кастрычніка. Выпрацоўваючы тактычныя задачы барацьбы паслоў у сейме, аўтар зводзіў іх, аднак, да яўна няправільнага курсу: абавязковая апазіцыя, каб не даваць ураду падстаў абцяжарваць БПК адказнасцю за сваю палітыку. Такая думка вяла да апраўдання пасіўнасці беларускіх паслоў, да тактыкі старонніх назіральнікаў, што не спрыяла актывізацыі Беларускага пасольскага клуба.

Ідэйныя разыходжанні ў складзе беларускіх паслоў усё раслі. Штуршком для раздзелу паслужыў артыкул пасла камуністычнай фракцыі сейма С. Круліноўскага, змешчаны ў аднадзёнцы «З рабочага фронту», у якой

[31] «Вольны сцяг», 1923, 3 кастрычніка.

рэзка крытыкавалася малаактыўная работа Беларускага і Украінскага пасольскіх клубаў. С. Крулікоўскі пісаў, што, не маючы выразнай сацыяльнай праграмы, нельга весці паслядоўную рэвалюцыйную барацьбу і за нацыянальныя правы свайго народа. 23 лістапада газета «Змаганне» змясціла пераказ артыкула С. Крулікоўскага з доп ісам ад рэдакцыі: «Час аб'яднацца з тымі, хто на сваім сцягу напісаў сярод іншых сацыяльных лозунгаў таксама лозунг самавызначэння народа без ўсякіх агаворак». У гэтым жа нумары газеты быў надрукаваны перадавы артыкул «Малы парламент», які заклікаў беларускіх паслоў пасля года работы без праграмы ажывіць сваю дзейнасць, прычым перавага аддавалася рабоце паслоў, што стаялі на сацыял-дэмакратычных пазіцыях. 10 студзеня «Змаганне» змясціла артыкул пад крыптанімам К. М. «Наспеўшая патрэба», які падводзіў вынікі дыскусіі аб пасольскай тактыцы і адкрыта прапанаваў вырашыць праблему класавай арганізацыі — стварыць рабоча-сялянскую сацыялістычную партыю, у праграме якой на першы план ставіліся б задачы сацыяльнага вызвалення заходнебеларускага народа.

Паслы Б. Тарашкевіч, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын у канцы лютага — пачатку сакавіка 1924 года стварылі ў БПК фракцыю незалежных сацыялістаў, якая была бліжэй да надзённых патрэб працоўных. Менавіта паслы гэтай фракцыі і сталі затым стваральнікамі адной з буйнейшых у Польшчы арганізацыі — Беларускай сялянска-рабочай грамады. Артыкулы «Трэба склікаць Усебеларускі з'езд Заходняй Беларусі» (27 ліпеня), «Малы парламент» (23 лістапада), «Наспеўшая патрэба» (10 жніўня 1923 года) распрацоўвалі тактыку барацьбы гэтай арганізацыі.

З 23 нумара «Наш сцяг» увёў рубрыку «Слаўныя сацыялісты», у якой меркавалася знаёміць масавага чытача з заснавальнікамі навуковага сацыялізма. Першы артыкул быў прысвечаны К. Марксу. Заканчваўся ён словамі: «Праўду навукі, гэтага волата думкі, мы бачым на кожным кроку, і яго покліч «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» штораз шырэйшы мае послух, штораз шчыльней яднае працоўных»[32].

---

[32] «Наш сцяг», 1923, 10 жніўня.

Газета друкавала вытрымкі з твораў класікаў марксізма-ленінізма: «вызваленне рабочых ёсць справа рук саміх рабочых», «першым абавязкам рабочага класа ёсць заваяванне сабе палітычнай улады» і іншыя, папулярныя кароткія тлумачэнні тэрмінаў «клас», «фашызм», «дыктатура пралетарыяту».

Орган Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, нягледзячы на некаторыя памылкі ў ідэалогіі і вызначэнні тактыкі барацьбы, карыстаўся вялікай павагай у працоўных. Гэта было адзінае ў 1923—1924 гадах легальнае выданне, якое несла працоўным праўдзівую інфармацыю аб іх жыцці і барацьбе. Газету чыталі сяляне, рабочыя і інтэлігенцыя. Уважліва сачылі за ёю, дапамагалі, патрабавалі і непакоіліся, калі не атрымоўвалі яе. Так, падпісчыкі Палачанскай гміны Валожынскага павета ў заметцы «Што рабіць?» пісалі ў рэдакцыю, што не атрымалі яшчэ ні аднаго нумара «Нашага сцяга», хоць выйшла ўжо 10, якія рэгулярна высылаюцца падпісчыкам, некаторым — нават заказной аплатай[33]. 25 ліпеня газета змясціла пісьмо падпісчыка С. Грынкевіча, у якім той прапанаваў змяшчаць матэрыялы па гісторыі Беларусі, больш увагі ўдзяляць творчасці чытачоў і г. д. Рэдакцыя прыняла парады чытача і прасіла іншых падпісчыкаў выказаць свае заўвагі і прапановы.

Рос матэрыяльны фонд выдання. Сяляне, рабочыя дасылалі ў рэдакцыю апошнія грошы, збіраючыся па некалькі сем'яў, каб падпісацца на газету. У другім нумары «Наш сцяг» паведамляў, што група беларусаў Вішнёўскай гміны пагадзілася з трывалай і ўдалай барацьбой газеты за вызваленне рабоча-сялянскага працоўнага люду ад прыгнечання і слала 50 тысяч марак на патрэбы газеты[34]. У час выступленняў паслоў БПК на мітынгах праводзіліся зборы ў так званы «прэсавы фонд». Так, у мястэчку Кузніца на Гродзеншчыне 27 верасня 1923 года было сабрана каля 100 тысяч марак, у Зельве 30 верасня — 251 тысяча марак[35].

Беларускія газеты нацыянальна-вызваленчага напрамку былі бяльмом на вачах ва ўлад. За час ад 1 студзеня да 10 кастрычніка 1923 года было канфіскавана

---

[33] «Наш сцяг», 1923, 11 ліпеня.
[34] «Наш сцяг», 1923, 9 чэрвеня.
[35] «Вольны сцяг», 1923, 5 кастрычніка.

18 нумароў. 13 жніўня 1923 года рэдакцыя «Нашага сцяга» отрымала афіцыяльнае ўведамленне віленскага камісара ўрада аб тым, што 8 жніўня віленскі акруговы суд зацвердзіў канфіскацыю на 17 нумар. Рэдакцыі было забаронена выдаваць газету да канчатковага разбору справы (17 нумар быў выдадзены 27 ліпеня, канфіскаваны за перадавы артыкул «Трэба склікаць Усебеларускі з'езд Заходняй Беларусі»). У перыяд паміж 27 ліпеня і 18 жніўня выйшла яшчэ 7 нумароў «Нашага сцяга», 12 жніўня газета была закрыта. У другой палове жніўня было выдадзена некалькі аднадзёнак, а ў верасні — лістападзе — 21 нумар газеты «Вольны сцяг».

З канца 1923 да студзеня 1924 года быў выдадзены 31 нумар газеты «Змаганне», 3 лютага — апошні нумар газеты БРА: аднадзёнка «Наша змаганне».

Друкаваны орган БРА, як і дзейнасць арганізацыі, не быў аднародным і паслядоўным да канца як у пытаннях тэорыі, так і ў пытаннях тактыкі.

## МАСАВАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ Ў 1925—1927 гг.

Ідэйныя разыходжанні лідэраў груповак усё больш і больш раздзялялі Беларускі пасольскі клуб, які ў час выбараў прытрымліваўся адзінай тактыкі. Згодніцкая палітыка беларускай буржуазіі вяла да расколу. Баючыся выкрыцця, нацыяналістычныя элементы заяўлялі аб аўтаноміі, свабодзе, а на самой справе вялі замаскіраваную барацьбу супраць рэвалюцыйнага руху.

Вялікі ўплыў на дзеячоў левага крыла Беларускага пасольскага клуба аказвала дзейнасць КПЗБ. З лістапада 1924 года пачаў выходзіць друкаваны орган ЦК КПЗБ — газета «Чырвоны сцяг», са снежня 1924 года тэарэтычны орган — часопіс «Бальшавік». Партыя і яе нелегальныя выданні аказвалі вялікае ўздзеянне на дэмакратычны рух, на выдзяленне з БПК рэвалюцыйна-дэмакратычных элементаў у самастойную фракцыю. «Пачынаючы з 1924 года,— гаварыў у справаздачы на III канферэнцыі КПЗБ адзін з кіраўнікоў кампартыі Л. Араншгам,— мы вядзём кампанію за раскол сеймавых фракцый па класавых швах... І толькі тады, калі лепшыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі ўбачылі, што палітыка адзінай сеймавай фракцыі вядзе да згоды з польскім

урадам, яны вырашылі адкалоцца, і ў пачатку 1925 года мы дабіліся гэтага расколу»[36].

Беларускі пасольскі клуб, выступіўшы ў якасці нацыянальнай фракцыі, шырока павёў работу як у Вільні, так і ў правінцыі. Яго сакратарыяты былі створаны ў 15 гарадах і мястэчках: Навагрудку, Гродна, Баранавічах, Стоўбцах, Ваўкавыску, Лідзе, Нясвіжы, Пружанах, Крынках і інш. Дэмакратычная прэса пачала ўважліва сачыць за яго работай. З'яўляюцца рубрыкі «Сейм», «З сейма», «Вакол сейма», «Праца беларускіх паслоў на правінцыі» і іншыя, у якіх вядзецца агляд работы польскага сейма, друкуюцца прамовы паслоў, іх сеймавыя запытанні.

Сваім удзелам у сейме прадстаўнікі заходнебеларускіх мас праследавалі некалькі мэт: выказваць пратэст беларускага народа Рэчы Паспалітай супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, выкарыстоўваць сейм як трыбуну для стварэння міжнароднага рэзанансу. Аднак разрозненыя ідэйныя погляды кожнай з груп хутка зрабілі немагчымым тое ўяўнае адзінства, якое існавала раней. Гэтае раздваенне абясцэньвала як тактыку ідэйных пратэстаў і дэманстрацый, так і тактыку практычнай парламенцкай работы. Ды і доўгі кампраміс быў немагчымы, бо ён вёў да абязлічвання сродкаў і метадаў барацьбы. Між тым прэса ў гэты час не заўсёды была ў авангардзе барацьбы. У. Суліма ў «Новым жыцці» 22 красавіка 1923 года змясціў памылковы артыкул «Беларускі клуб у польскім сейме», у якім зазначыў, што ўся польская грамадскасць і ўсе партыі, без выключэння, вялі барацьбу, каб не дапусціць беларусаў да ўдзелу ў выбарах і прадстаўніцтва іх у сейме. Узнікае пытанне: чаму «ўся польская грамадскасць»? Аўтар фактычна адобрыў тактыку «безадказнай апазіцыі» Беларускага пасольскага клуба, якая вяла, аднак, да пасіўнага нагляду, а не да актыўнай барацьбы.

Дзейнасць БПК як арганізацыі са сваёй платформай пачынаецца з 23 студзеня 1923 г., калі старшыня клуба Б. Тарашкевіч упершыню выступіў у сейме, выставіўшы праграмныя патрабаванні БПК, у тым ліку і нацыянальнага напрамку: неадкладнай забароны штучнай палані-

---

[36] Цыт. па кн. Т. Глинская. КПЗБ — руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924—1928 гг. Мінск, 1965, стар. 82.

зацыі, ліквідацыі асадніцтва, перадачы ўсіх лясоў у карысць дзяржавы і неадкладнага выдання закона, нарміруючага высекі лесу з мэтай захавання ляснога масіву ад знішчэння, увядзення зямельнай рэформы, якая ахоўвала б перш за ўсё інтарэсы мясцовага малазямельнага і беззямельнага насельніцтва, надзялення яго зямлёю без выкупу, звароту рэпатрыянтам[37] канфіскаванай дзяржавай зямлі, адбудовы разбураных у час вайны вёсак і мястэчак, дапамогі рэпатрыянтам, паляпшэння зямельнай культуры праз арганізацыю агранамічных і рамесна-тэхнічных школ, свабоды арганізацыі у галіне гаспадарчага жыцця, неадкладнага выдання законаў, забяспечваючых беларускаму насельніцтву культурную і асветную аўтаномію, дапушчэння беларускай мовы ў самаўрадах[38], адміністрацыі і судзе, неўмяшання адміністрацыйных улад у рэлігійнае жыццё, стварэння адміністрацыі з мясцовых прадстаўнікоў, увядзення дэмакратычных самаўрадаў, судоў прысяжных і выбарных судоў міру, тэрытарыяльнай арганізацыі войск[39].

Выступаючы ў сейме 13 чэрвеня 1924 года ў час дыскусіі, Б. Тарашкевіч заявіў, што бюджэт Польшчы — гэта бюджэт вайны, што падаткі вядуць да збяднення вёскі, што ў школах існуюць жорсткія ўмовы. Такі вывад Тарашкевічу дапамагло зрабіць наведванне ў якасці пасла Пінскага і Косаўскага паветаў Палескага ваяводства, дзе ён убачыў галечу беларускага сялянства.

Тэзісы «палітычнай незалежнасці», здзяйснення прынцыпу «самавызначэння народа» Б. Тарашкевіч паўтараў усё часцей. І ён і іншыя левыя члены Беларускага пасольскага клуба станавіліся на перадавыя пазіцыі ў нацыянальна-вызваленчым руху.

Легальнымі дэмакратычнымі выданнямі, блізкімі да тактыкі рэвалюцыйнай часткі БПК, сталі ў гэты час газеты «Сын беларуса», «Голас беларуса» і «Сялянская праўда», неафіцыяльныя органы БПК (рыс. 2). ЦК КПП імкнуўся стварыць легальную беларускую газету, але гэта задума не ўдалася. Кампартыя выразшыла перанесці свой уплыў на органы БПК, але сувязь яе з легальнай

---

[37] Рэпатрыянты — вярнуўшыеся на радзіму палонныя, бежанцы, перасяленцы.

[38] Самаўрады — мясцовыя органы ўпраўлення.

[39] Гл. А. Бергман. Беларуская сялянска-рабочая грамада (1925—1927 гг.), «Навуковы зборнік». Беласток, 1964, стар. 110—111.

беларускай прэсай таксама, на жаль, была не пастаянная.

У маі 1926 года ЦК КПЗБ пастанавіў: выдзеліць для работы ў гуртках БСРГ сваіх членаў. Хутка яны былі ва ўсіх гуртках і фактычна кіравалі імі. У адным з матэрыялаў ЦК КПЗБ чытаем: «Арганізацыйны камітэт Грамады быў створан фактычна партыяй. Партыя імкнулася


СЯЛЯНСКАЯ ПРАЎДА

Выходзіць тры разы у тыдзень.

№ 13. Вільня, Серада. 29-га кастрычніка 1924 г. Год I.

**Першы крок.**

**Аб чым пішуць.**

Рыс. 2.

да таго, каб лепшыя сілы Грамады ўцягнуць у свае фракцыі і запэўніць сабе кіраўніцтва ў Грамадзе. І належыць сцвердзіць, што ў гэтай справе КПЗБ многага дабілася»[40].

Восенню 1926 года часопіс «Бальшавік» у артыкуле «Беларуская сялянска-рабочая грамада», у якім разглядалася работа гэтай масавай арганізацыі, прызнаваў дзейнасць БСРГ грунтоўнай. Адзначалася асабліва паспяховая дзейнасць БСРГ у праводзімых масавых кампаніях — за амністыю палітзняволеных, школьнай, у барацьбе з Беларускім сялянскім саюзам, ППС (на Палессі) і інш. Аднак БСРГ крытыкавалася менавіта за арганізацыйныя захапленні, за няўважлівасць да палітычнай работы. У артыкуле адзначалася: «БСРГ мала

[40] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 230, арк. 27.

вядзе барацьбу за штодзённыя інтарэсы вёскі, і няправільна было б тлумачыць гэта з'явішча маладым векам арганізацыі. У «Народнай справе» — друкаваным органе Грамады — пісалася: «Нам трэба арганізавацца, а як будзем мець за сабой масу, тады прыступім да працы.

Палітычная арганізацыя павінна займацца ў першую чаргу і палітычнай работай. Якраз гэта ў Грамадзе галоўнае — і ў змаганні за надзённыя патрэбы, і ў барацьбе з сацыял-здраднікамі — паднімаць палітычнай барацьбой свядомасць вёскі, увязваючы кожную акцыю з рэвалюцыйнай барацьбой»[41].

Тэарэтычны орган партыі крытыкаваў нацыяналістычную накіраванасць некаторых артыкулаў грамадоўскай прэсы, ставіў задачу перавыхавання беларускай інтэлігенцыі, якая ішла ў Грамаду.

На памылкі некаторых артыкулаў органа БСРГ указваў і I з'езд КПЗБ. У справаздачы ЦК КПЗБ гаварылася: «У грамадоўскай прэсе... друкуецца рад артыкулаў, якія прадстаўлялі сабою глыбока апартуністычныя, глыбока памылковыя артыкулы, на якія мы павінны былі рэагаваць самым рашучым чынам... З'яўленне такіх артыкулаў стала магчымым на фоне дыферэнцыяцыі, што пачалася ў вёсцы»[42].

Такім чынам, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі імкнулася кіраваць дзейнасцю БСРГ, што вяло да большай яе рэвалюцыйнасці ў барацьбе за інтарэсы працоўных мас[43].

Беларуская сялянска-рабочая грамада ў сваю чаргу вялікую ўвагу ўдзяляла прэсе. Ужо ў «Інструкцыі аб тым, як стварыць арганізацыю БСРГ на месцах» адзначалася, што найлягчэй і найлепш вучыць працоўныя масы вёскі і горада класаваму змаганню, узнімаць у іх рэвалюцыйную свядомасць праз распаўсюджванне газеты. Грамада прапанавала абмяркоўваць у гуртках пытанні распаўсюджвання газеты, выдзяляць з ліку найбольш падрыхтаваных членаў Грамады спецыяльных людзей, якія б знаёмілі са зместам грамадоўскіх газет, заахвочвалі б сялян выпісваць іх. Газета — гэта зброя ў палітычнай барацьбе. У інструкцыі прадугледжвалася многае: выпісваць газе-

---

[41] «Бальшавік», 1926, верасень-кастрычнік, стар. 15—16.

[42] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 183, арк. 56—57.

[43] Больш падрабязна аб рэвалюцыйнай дзейнасці БСРГ гл. у кн. У. А. Палуян. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мінск, 1967.

ту ўскладчыну, калі не хапае грошай; прадаваць яе ў дні кірмашоў у мястэчках, пільнаваць, каб газета даходзіла без перашкод; спраўляцца, хто не дапускае яе да працоўных, знаходзіць віноўных. «Няхай не страшаць вас канфіскацыі нашых газет, бо заўсёды будзем старацца, каб наступны нумар не быў канфіскаваны, каб дайшоў да нашых чытачоў. А калі нам зачыняць адну газету, пастараемся выдаваць другую газету як часопіс нашае сялянска-рабочай Грамады»[44].

БСРГ выдавала два разы на тыдзень перыядычны орган, сатырычны двухтыднёвік, неперыядычныя бюлетэні Беларускага пасольскага клуба (затым Беларускай сялянска-рабочай грамады), кіравала студэнцкімі выданнямі і некаторымі газетамі вучняў Віленскай беларускай гімназіі, выдавала адозвы, пракламацыі, лістоўкі, звароты і інш.[45]

Для зручнасці чытачоў выданні БСРГ друкаваліся як кірыліцай, так і лацінкай. Газеты, якія выходзілі кірыліцай, мелі тыраж да 8 500 экземпляраў, сатырычны двухтыднёвік «Маланка»—3 тысячы, «Народны звон» (лацінкай) — 2 тысячы (рыс. 3).

Толькі за шэсць гадоў (1921—1927) польскія ўлады закрылі 22 беларускія газеты[46]. Закрыты былі і ўсе выданні БСРГ. Паслы неаднаразова рабілі запытанні ў сейме аб праследаваннях беларускай прэсы. С. Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч часта наведвалі аддзел друку камісарыята паліцыі Вільні. Але ўлады, як правіла, не адказвалі на запытанні і інтэрпеляцыі. Польскія ўлады рабілі ўсё, каб ліквідаваць беларускую радыкальную прэсу. А. Войцік, афіцыяльны выдавец «Сялянскай праўды» (1924), быў зняволены ў астрозе, хварэў, але ні разу не быў пакладзены ў шпіталь. Не лепшыя былі адносіны і да іншых асуджаных беларускіх выдаўцоў. Усё гэта рабілася, каб запалохаць тых, хто ішоў працаваць у беларускую прэсу. Газеты знішчаліся на пошце, іх не ўручалі падпісчыкам, у час рэвізій забіралі нават неканфіскаваныя нумары, тэрарызаваліся падпісчыкі.

З 1924 года адміністратарам беларускай радыкальнай прэсы працавала Л. А. Войцік, у абавязкі якой уваходзі-

---

[44] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ФДВ, адз. зах. 1406, стар. 9.

[45] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 230, арк. 29.

[46] Гл. У. А. Палуян. Беларуская сялянска-рабочая грамада, стар. 18.

ла даставаць паперу, весці бухгалтэрыю, дамаўляцца з гаспадаром друкарні. Органы БСРГ мелі сваіх наборшчыкаў — сярод іх беларусы Дудка, Рэшатаў, латыш Магнус. Кожны месяц адміністратар рабіла пісьмовую справаздачу паслу С. Рак-Міхайлоўскаму аб расходах




Рыс. 3.

на выданне газеты, бо даводзілася ўлічваць кожны грош[47].

Першыя 10 экземпляраў газеты накіроўвалі на прагляд у аддзел друку, які на працягу гадзіны павінен быў вырашыць: канфіскаваць газету ці не. Аддзел друку, звычайна, ніколі не адказваў адразу. Рабілі гэта на наступны дзень, калі ўвесь тыраж быў надрукаваны, адасланы на пошту, дзе на газеты ўжо наклеілі

[47] З пісьма Л. А. Войцік ад 8 верасня 1969 года, якое захоўваецца ў мяне.— *С. Г.*

паштовыя маркі, а набор у друкарні разабралі. Такім чынам, выдаўцы трацілі велізарныя грошы на паперу, фарбы, набор, паштовыя расходы. Пасля трох-чатырох канфіскацый газету закрывалі, вось чаму выхад 20—30 нумароў лічыўся для выдаўца сапраўдным святам. Міністэрства ўнутраных спраў 10 ліпеня 1926 года направіла ваяводам тайнае пісьмо, у якім прапанавала ўзмацніць кантроль за дэмакратычнымі выданнямі, у тым ліку і за беларускімі.

Радыкальная прэса вытрымлівала не толькі ўдары паліцыі, буржуазнай польскай прэсы, але і выданняў беларускай буржуазіі — нацыяналістаў, паланафілаў, клерыкалаў. Пасля разгрому Грамады беларуская нацыянальная буржуазія выдавала 20 органаў, з іх 18 у Вільні. Радыкальных выданняў выходзіла толькі два — газета «Праца» і сатырычны часопіс «Маланка». Вытрымаць такую канкурэнцыю магла толькі прэса, якая сапраўды адказвала надзённым патрабаванням працоўных.

Аднак выданні Грамады не былі нечым адзіным у ідэйных адносінах і да канца паслядоўнымі. БСРГ як арганізацыя сялянская ў асноўным выражала ідэалогію сялянства, і многія артыкулы, надрукаваныя ў газеце, не выходзілі за рамкі інтарэсаў сялянскай рэвалюцыйнай дэмакратыі. У цэлым жа друк БСРГ, хоць і не быў выразнікам адкрыта марксісцка-ленінскай ідэалогіі, усё ж у асноўных рысах правільна асвятляў эканамічнае становішча працоўных, класавую барацьбу з пазіцый марксізма. Гэта давала магчымасць прэсе Грамады быць папулярнай сярод працоўных Заходняй Беларусі. Нават «Дзённік віленскі» 25 лістапада 1928 года пісаў, што беларускі друк, які раней ледзь трымаўся, з узнікненнем Грамады ўзмацніўся.

КПЗБ уважліва сачыла не толькі за ідэйным ростам членаў Грамады, але і за яе прэсай. Тры разы сакратарыят ЦК КПЗБ прымаў рэзалюцыі па пытаннях грамадоўскіх выданняў.

1925—1928 гады былі перыядам стварэння беларускімі нацыяналістамі шматлікіх груповак і арганізацый. У адной з рэвалюцый ЦК КПЗБ адзначаў: «Хістанні ў радах нацыянальна-вызваленчага руху патрабуюць стварэння ў партыйнай і *легальнай* (курсіў наш.— *С. Г.)* прэсе крытыкі ўсіх памылак: аб ролі беларускага кулака і беларускай буржуазіі.., аб асаблівай небяспецы для на-

цыянальна-вызваленчага руху... групы Луцкевіча — Астроўскага і аб... лозунгах інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі і «бяскроўнай рэвалюцыі» шляхам масавага каапераванння»[48].

У другой рэзалюцыі адзначалася, што газета БСРГ недастаткова піша аб барацьбе з тэрорам, што няма ў ёй накіроўваючых артыкулаў, няўмела вядзецца барацьба з беларускімі згоднікамі, недастаткова выкрываецца пераход Беларускага сялянскага саюза і Беларускай хадэцыі на бок польскага фашызму. Адзначаліся наступныя факты, якія прапагандавалі беларускія нацыяналісты і міма якіх прайшла газета БСРГ, не аправергла: а) абвінавачванні з боку беларускіх нацыяналістаў у іх прэсе кіраўнікоў Грамады ў супрацоўніцтве з дэфензівай; б) хвалебныя гімны «аб рэформах» урада ў нацыянальным пытанні; в) выстаўленне ўсёй ППС як радыкальнага польскага руху; г) рабскі тон беларускай рэакцыйнай прэсы ў адносінах да ўрада («мы не будзем рабіць закідаў і пагражаць, мы хочам звярнуць увагу кіраўнікоў польскай дзяржавы...»); д) спроба адцягнуць увагу мас ад барацьбы за беларускую школу.

Адзначаліся і недахопы прэсы Грамады: недастаткова выкрывалася палітыка фашысцкага ўрада ў нацыянальным пытанні, не друкаваліся артыкулы, якія б заклікалі да барацьбы беларускія сялянскія масы. Недастаткова асвятлялася рабочае жыццё, не было накіроўваючых артыкулаў для батракоў. ЦК КПЗБ паставіў перад прэсай Грамады наступныя задачы: 1) барацьба з фашысцкай дыктатурай і выкрыццё яе; 2) кампанія супраць тэрору ўлад і пагрозы вайны; 3) выкрыццё нацыянальнай палітыкі буржуазна-памешчыцкіх улад у адносінах да нацыянальных меншасцей; 4) рашучая барацьба са згоднікамі; 5) барацьба за частковыя патрабаванні сялян і батракоў; 6) большая папулярызацыя СССР[49]. «Партыя не толькі дапамагала літаратурай,— успамінаў Ф. Каравацкі,— у якой выкрывалася дробнабуржуазная нацыяналістычная сутнасць беларускіх нацыяналістаў, але і ў практычнай прапагандысцкай і арганізацыйнай рабоце выкарыстоўвала цыркуляры, якія паступалі ў райкомы, падрайкомы, партыйныя гурткі. У пачатку 1926

---

[48] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 98, арк. 121.
[49] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 301, арк. 20.

года Віленскі АК КПЗБ разаслаў цыркуляр, у якім вызначаў пазіцыю камуністаў у адносінах буржуазных партый і легальных рэвалюцыйных арганізацый»[50].

ЦК КПЗБ выдзеліў са свайго складу прадстаўніка, які непасрэдна кіраваў грамадоўскімі выданнямі. Працяглы час такім прадстаўніком быў Я. Бабровіч.

Першай газетай, якая выступіла ад імя Беларускай сялянска-рабочай грамады, стала «Жыццё беларуса». Яна выходзіла з 19 жніўня па 12 лістапада 1925 года. Рэдагаваў газету да 7 нумара Я. Туркевіч, а затым, пасля канфіскацыі двух нумароў (№ 2 і № 7),— У. Варава. Выйшла 20 нумароў. Газета смела і паслядоўна ставілася да розных пытанняў жыцця і барацьбы, на што адразу ж звярнулі ўвагу і ўлады, бо затым нумары —14, 15 і 19 былі канфіскаваны. «Жыццё беларуса» не раз звярталася да працоўных пісаць аб здзеках, прыцясненнях, гвалтах, ствараць супольны фронт барацьбы за сваё вызваленне. Для таго, каб прыцягнуць на бок газеты чытача, рэдакцыя завяла новыя рубрыкі: «Сельскагаспадарчы аддзел», «Юрыдычныя парады» і інш. Амаль у кожным нумары газеты змяшчаліся пісьмы, карэспандэнцыі з розных куткоў, расказвалася аб катаваннях палітвязняў, аб неабаснаваных арыштах і штрафах.

Пасля канфіскацыі 7 нумара рэдакцыя была рэарганізавана, склад яе папоўніўся новымі супрацоўнікамі. «Жыццё беларуса» ўсебакова асвятляла жыццё як вёскі, так і горада. У нумары ад 14 кастрычніка 1925 года ў рубрыцы «З жыцця вясковага пралетарыяту» была змешчана карэспандэнцыя з двара Малыя Баніты Радашкоўскай гміны Вілейскага павета, дзе расказвалася аб эксплуатацыі, якой падвергла мясцовае насельніцтва абшарніца Халхоўская. Атрымаўшы ўрадавую пазыку, яна рашыла перарабіць бровар на фабрыку тканін. Каб не браць рабочых, Халхоўская наймала мясцовых сялян, якіх з'яўлялася на работу гэтулькі, што ўсіх выкарыстаць яна не магла, але затое змяншала плату. Жанчына за дзень атрымлівала 80 грошаў, мужчына —90[51]. Змясціў-

---

[50] Ф. К. Каравацкі. Барацьба камуністаў за ўплыў у легальных арганізацыях. Зб. «У суровыя гады падполля». Мінск, 1958, стар. 74—75.

[51] Для параўнання: самая танная паркалёвая хустка каштавала 1 злоты 50 грошаў —2 злотых. Значыць, каб купіць хустку, трэба было працаваць 2—3 дні, а чаравікі —3 тыдні.

шы карэспандэнцыю, газета дадавала, што ў многіх месцах беларускія рабочыя і сяляне не могуць знайсці нават і такой работы.

Апошні нумар газеты «Жыццё беларуса» выйшаў 12 лістапада, а літаральна праз шэсць дзён —18 лістапада з'явілася новая газета «Беларуская ніва», орган Грамады. Газета выходзіла 4 месяцы, да 16 красавіка 1926 года. Афіцыяльным рэдактарам-выдаўцом яе стаў І. Марцінеўскі. У 1925 годзе было выдадзена 13 нумароў, у 1926— яшчэ 22, такім чынам, «Беларуская ніва» выйшла 35 разоў. Яе рэдакцыя мела магчымасць святкаваць выхад у свет ажно 30 нумара. Газета павінна была выходзіць 3 разы ў тыдзень, але частыя канфіскацыі перашкаджалі рэгулярнасці яе выпуску. Мела яна каля 3 тысяч падпісчыкаў.

«Беларуская ніва» імкнулася найбольш поўна выкарыстоўваць жанры — ад карэспандэнцыі і артыкула да верша, заметкі, дарожных нататкаў. Газета аб'ектыўна асвятляла жыццё ў Савецкай краіне. У 21 (34) нумары 13 сакавіка 1926 года было змешчана 6 карэспандэнцый з Савецкай Беларусі ў рубрыцы «З Радавай Беларусі»: «Барацьба з непісьменнасцю», паведамленні аб адкрыцці новага педагагічнага тэхнікума ў Мазыры, новых кніжках, што выйшлі ў Беларускім выдавецтве, павелічэнні ў 1924—1925 гадах на 9 працэнтаў пасяўных плошчаў, нарыхтоўкі лесу для сялян і адбудове. Як бачым, газета і гэтую рубрыку пачынае весці больш шырока і змястоўна, расказваючы аб поспехах будаўніцтва сацыялізма ў БССР не толькі праз паказ культурных здзяйсненняў, але і праз паказ усяго жыцця — эканамічнага і палітычнага. Характэрнымі ў гэтым напрамку былі дарожныя нататкі пасла сейма П. Мятлы «Падарожжа ў СССР і БССР»», якія былі змешчаны ў нумарах 12 (25) 13 лютага і 14 (27) 20 лютага 1926 года з працягам. Але працяг так і не з'явіўся, бо на 35 нумары «Беларуская ніва» была закрыта. П. Мятла праўдзіва пісаў аб развіцці ў Савецкім Саюзе сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гандлю, становішчы сацыяльнага забеспячэння, жыцці сялян, старэйшага і малодшага пакаленняў — камсамола, адзначаў яго бадзёрасць, імкненне наперад, веру ў сваю будучыню, вялікі працоўны энтузіязм і адданасць сацыялістычным ідэалам.

У нумары 9 (19) у студзені 1926 года газета змясціла

перадавы артыкул «Сяляне і работнікі», у якім, гаворачы аб неабходнасці аб'яднання дзвюх галоўных сіл — рабочых і сялян, зноў звярталася да прыкладу Савецкага Саюза і Савецкай Беларусі, дзе рабочыя і сяляне з яскравай відавочнасцю даказалі сваю сілу і згуртаванасць. Газета пісала, што заходнебеларускага селяніна цяпер цяжка запалохаць, ён пачынае разумець, што пакуль працоўныя горада не аб'яднаюцца з сялянствам, датуль і аб якой-кольвечы змене ў іх жыцці немагчыма гаварыць.

Заканчваўся артыкул словамі з апавядання Цёткі «Прысяга над крывавымі разорамі» трох сыноў старога селяніна Мацея — парабка, рабочага і селяніна, што прысягнулі даць народу зямлю: «Мы дамо, мы сіла — мы права!»

Многа ўвагі «Беларуская ніва» ўдзяляла школе на роднай мове. Амаль у кожным нумары так ці інакш ставілася школьнае пытанне. Барацьба за родную школу з'яўлялася адной з форм барацьбы за дэмакратычныя патрабаванні. У 9 нумары газета змясціла матэрыял «Новы плебісцыт», у якім паказвала, як улады «імкнуцца» адкрываць беларускія школы. У 1925 годзе было пададзена 15 тысяч дэкларацый на адкрыццё 412 беларускіх школ. Але яны не былі прыняты да ўвагі. У гэтым жа нумары газета паведамляла аб пасяджэнні 12 снежня 1925 года сейма, на якім абмяркоўвалася запытанне БПК, БСРГ, Украінскага і Нямецкага клубаў, Яўрэйскага кола наконт цыркуляра міністра асветы Грабскага аб выкладанні ў прыватных няпольскіх гімназіях усіх прадметаў па-польску, у тым ліку агульнай гісторыі і геаграфіі, што пярэчыла ўмовам Версальскага пагаднення і Рыжскага мірнага дагавора. Сейм і на гэты раз «не змог» вырашыць пытанне. Запытанне было здадзена ў камісію па асвеце, дзе яму далі адпаведны «ход»,— яно было пахавана.

«Беларуская ніва» завяла цікавую рубрыку «На чорную дошку», у якой пісала аб фактах здзекаў з дзяцей. У вёсцы Празарокі (на Дзісненшчыне) працавалі два настаўнікі, прайшло два месяцы вучобы, а ў дзяцей ні разу не прагледзелі дамашнія заданні. Карэспандэнт газеты пісаў, што яму самому прыйшлося паглядзець сшыткі і ён ледзь не абамлеў, убачыўшы там рашэнні задач па арыфметыцы: 10—8=18, 10—7=17 і г. д. Сяляне, пе-

раканаўшыся, што дзеці, ходзячы ў школу, толькі марна трацяць час, самі пачалі па вёсках вучыць іх[52].

Цікавым і змястоўным быў апошні, 12 нумар за 1925 год, які выйшаў 30 снежня. У вялікім рэдакцыйным артыкуле «За мінулы год. Беларускае палітычнае жыццё за 1925 год» разглядалася палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі, дзейнасць паслоў БСРГ, Беларускага пасольскага клуба. На трэцяй паласе змяшчаліся паведамленні аб XIV з'ездзе Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) і пераказ справаздачнага даклада І. В. Сталіна. Шасціпалосны нумар быў канфіскаваны за палітычны агляд і артыкул «Паміж Захадам і Усходам».

У 17 (30) нумары газета выкрывала фінансавую палітыку панскай Польшчы. У перадавым артыкуле «Красамоўныя факты» пісалася аб адносінах да народнай асветы. Па дзяржаўнаму бюджэту Міністэрству асветы адпускалася 402 мільёны злотых, выдаткавана ж было толькі 270. У выніку — звольнена з працы 1000 настаўнікаў, закрыты 34 курсы з 42 па падрыхтоўцы настаўнікаў, ліквідавана 6 настаўніцкіх семінарый, 6 гімназій, 70 штатных пасад у сярэдніх школах, 26 кафедр у вышэйшых навучальных установах.

Зменшаны быў бюджэт і Міністэрства земляробства. А куды выдаткоўваліся грошы? На падрыхтоўку вайны, утрыманне войска, паліцыі, чыноўнікаў. Рэдакцыя на аснове звестак, узятых з «Кур'ера варшаўскага», падлічыла, што кожны восьмы-дзевяты чалавек ў Польшчы не ўдзельнічаў у стваральнай працы і знаходзіўся на ўтрыманні. Такога не было ні ў адной краіне свету.

«Беларуская ніва» друкавала артыкулы, карэспандэнцыі, заметкі аб мітынгах і выступленнях паслоў. 21 лютага такі мітынг адбыўся ў Брэсце, на якім выступілі паслы Б. Тарашкевіч і П. Валошын. На мітынгу была прынята рэзалюцыя з 11 пунктаў, прададзена 200 нумароў газеты[53].

18—21 лютага ў Глыбокім, Гродна, Брэсце Б. Тарашкевіч і П. Валошын зрабілі справаздачу. «Пасля кожнага такога «справаздачнага мітынгу»,— пісаў «Кур'ер віленскі»,— праходзіла распіхванне сярод прысутных «Бю-

[52] «Беларуская ніва», 1925, 16 снежня.
[53] «Беларуская ніва», 1926, 3 сакавіка.

летэняў» і афіцыйнага органа «Беларускай нівы». Як бачна з вышэйсказанага, Грамада не губляе часу, нягледзячы на тое, што мае ў сейме толькі чатырох паслоў»[54]. На мітынгу ў Глыбокім, на якім выступіў П. Мятла, была прынята рэзалюцыя з патрабаваннямі перагляду новага статута аб зямельнай рэформе; вызвалення ад падаткаў усіх працоўных і пералажэння гэтага цяжару на капіталістаў і абшарнікаў, скасавання пакарання смерцю і дарадчых судоў і поўнай амністыі для ўсіх палітычных вязняў; спынення на беларускіх землях асадніцтва: роспуску цяперашняга сейма і сената; падтрымкі БСРГ[55].

16 сакавіка 1926 года «Беларуская ніва» была закрыта. Некаторы час Грамада не мела магчымасці выдаваць свой друкаваны орган, таму выйшлі аднадзёнкі: 18 сакавіка —«За праўду», 25—«На прадвесні», 1 красавіка—«Наш кліч» (на 6 старонках).

9 красавіка 1926 года выйшаў першы нумар газеты БСРГ «Беларуская справа», якая пакінула прыкметны след у гісторыі друку Грамады. «Беларуская справа» выходзіла ў найбольш адказны перыяд яе дзейнасці — арганізацыйнага росту і станаўлення.

Перадавы артыкул першага нумара быў названы «Праграма і тактыка». Газета папулярна тлумачыла праграму і тактыку польскіх і заходнебеларускіх нацыяналістычных дробнабуржуазных партый: «Цяпер у нас натварылася гэтулькі палітычных партый і груп,— пісала газета,— што вясковаму чалавеку дужа цяжка ў іх разабрацца: якая з іх чаго варта, якой можна верыць і за якой трэба ісці? Бо кожная з гэтых партый і груп абвяшчае сваю праграму так, што, здаецца, у ёй ёсць усё, чаго жадае вёска».

Артыкул крытыкаваў праграму Беларускага сялянскага саюза з яго лозунгамі «незалежнасці беларускіх зямель» у федэрацыі з суседзямі, «зямлі сялянству без выкупу», «аб'яднання ўсіх беларускіх працоўных сіл» і г. д. На самай справе Беларускі сялянскі саюз, як і Польская сацыялістычная партыя, толькі пісаў свае «баявыя» лозунгі, бо праграма і тактыка БСС мелі два розныя бакі. Лідэры БСС падбухторвалі сялян не яднацца з рабочы-

---

[54] «Kurier Wileński», 1926, 20 сакавіка.
[55] «Беларуская ніва», 1926, 3 сакавіка.

мі, быццам бы тыя адбіраюць у сялян зямлю і аддаюць яе абшарнікам, а з-за частых забастовак так дорага каштуюць прамысловыя тавары і г. д. «Мала пісаць пенкныя праграмы,— працягвала газета,— трэба ва ўсёй дзейнасці палітычнай партыі, у штодзённай працы і ў партыйнай прэсе сапраўды праводзіць у свядомасць народу і ў жыццё тыя лозунгі, якія напісаны ў праграме партыі. Трэба, каб партыя, якая хоча, каб народ ішоў за ёй, ужо цяпер, сёння, злучала працоўных горада і вёскі да мэты, якая з'яўляецца супольнай і сялянству і рабочым»[56].

Тыраж газеты паступова рос. Яе прынцыповая палітыка, асабліва ў час майскага перавароту 1926 года, прыцягвала ўвагу чытачоў. У красавіку—маі тыраж газеты дасягнуў васьмі тысяч экземпляраў.

«Беларуская справа»— адна з першых газет радыкальнага напрамку, у якой адбыўся раздзел функцый адказнага рэдактара і выдаўца. Калі выдавец (пасол сейма П. Мятла) стаяў у кіраўніцтва газетай, дык адказны рэдактар, як правіла, толькі падпісваў газету. Зроблена гэта было так, каб выдавец мог без асаблівых цяжкасцей знайсці новага рэдактара ў выпадку, калі стары падвяргаўся арышту ці ішоў у падполле.

«Беларуская справа» з чэсцю выйшла з майскага крызісу. Яшчэ 22 красавіка 1926 года (№ 3) газета змясціла артыкул «Замах справа ці замах злева?» Спасылаючыся на «Кур'ер поранны», яна пісала аб тым, што кааліцыя буржуазных партый павінна хутка распасціся. Але незалежна ад таго, хто стане на чале ўрада — правіца генерала Сікорскага і К° ці «лявіца» маршала Пілсудскага і К°,— народу ад гэтага не стане лягчэй, бо ні першы, ні другі не споўняць мар і надзей працоўных. «Я пайду з маімі арміямі на Усход так далёка, як захачу...» Вось чаго хацеў стары Пілсудскі... Дык і даў працоўнаму народу толькі выключна тое, чаго хацеў, што мо' настолькі любіць сам: Вайну, Бойню, Кроў, кінуўшы ўкаханы «польскі люд» на рабаванне польскага абшарніцтва ў Польшчы ды на Усходзе,— пісала газета. ...Калі Гісторыя мае ўжо жаданне паставіць у Польшчы «апошнюю стаўку на Пілсудскага», дык з гэтага відаць, што гэтай наравістай пані (гісторыі.— *С. Г.*) аканчальна надаела

[56] «Беларуская справа», 1926, 9 красавіка.

ўжо версальская неразбярыха, якая цягнецца ўжо залішне доўга...»

Праўда, і ў кіраўніцтве БСРГ у час перавароту ў маі 1926 г. да Пілсудскага на нейкі момант узнікла давер'е. Гэта не здзіўляе, бо нават КПП і КПЗБ у першы час выказаліся за падтрымку «сацыяліста» Пілсудскага. Так, у 9 нумары (19 мая) «Беларускай справы» з'явіўся перадавы артыкул «Пасля перамогі», які паказваў гэту разгубленасць, часовую дваякасць поглядаў: меркаванне падтрымкі Пілсудскага і разам з тым сцвярджэнне, што ён нічога не дасць заходнебеларускім працоўным.

«Маршалак Пілсудскі,— пісала газета,— выступіў за тое, каб у «Польшчы не было лішне шмат несправядлівасці для тых, хто сваю працу дае другім, каб у Польшчы не было лішне шмат бяспраўя», на жаль, затрымаўся на паўдарозе, калі на вуліцах Варшавы за народную справу абільна пралілася кроў сялян і рабочых палякаў разам з беларусамі, украінцамі, яўрэямі.

Тым часам выступленне рэвалюцыйнага войска, на якім апіраецца м. Пілсудскі, стварыла такое становішча, калі сталася зусім немагчыма стварэнне сялянска-рабочага ўрада».

У гэтай заяве, апублікаванай на старонках газеты, БСРГ выставіла наступныя патрабаванні, да якіх, на яе думку, павінен быў прыслухацца ўрад: роспуск сейма і сената, новыя выбары пасля поўнага ачышчэння адміністрацыі ад усіх рэакцыйных элементаў, адмену пакарання смерцю, увядзенне поўнай амністыі для ўсіх палітзняволеных, безадкладнае выданне закона аб перадачы без выкупу ўсёй зямлі сялянам, скасаванне асадніцтва, безаткладнае ўвядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю, пералажэнне падаткаў на багатыя класы, поўнай перамены курсу ў нацыянальнай палітыцы ў духу самавызначэння народаў і сапраўднага раўнапраўя.

Як бачна, і заява з 9 нумара «Беларускай справы» і іншыя артыкулы, крытыкуючы дзейнасць Пілсудскага — «збавіцеля беларускага народа», яшчэ маюць надзею і веру ў лаяльнасць правадыра польскай рэакцыі, у яго добрыя адносіны да нацыянальных меншасцей.

28 мая, праз некалькі дзён пасля перавароту, выступаючы перад членамі сейма і сената, Пілсудскі гаварыў: «Цяпер варункі зложыліся так, што я мог бы не дапус-

ціць вас у залу нацыянальнага збору, кпючы з вас усіх. Але я раблю спробу, ці можна яшчэ ў Польшчы правіць без бізуна»[57].

Пілсудскі абысціся без бізуна не мог. Гэта паказалі першамайскія падзеі. Стачкі, дэманстрацыі, мітынгі адбыліся ў многіх кутках Заходняй Беларусі.

28 красавіка «Беларуская справа» першую паласу прысвяціла Першамаю, змясціўшы артыкулы «Сімвал перамогі» і «Проці новага наступу». Газета пісала, што ва ўсім свеце ідзе няспынная барацьба паміж капіталам і працай, што там, дзе існуе капітал, існуе і класавая барацьба працоўных, растуць свядомыя сілы горада і вёскі. Рабочыя павінны ў дзень Першамая выставіць патрабаванні дапамогі беспрацоўным, удовам, інвалідам, выступіць супраць новых звальненняў, за 8-гадзінны рабочы дзень, за павелічэнне заработнай платы, супраць новых падаткаў, разгрому рабочых арганізацый, закабалення вёскі. Газета заклікала сялян весці барацьбу за свае і рабочыя інтарэсы, за дапамогу батракам, самаўрады, свабоду арганізацыі сялян.

Першамайскія дэманстрацыі адбыліся ў Гродна, Баранавічах, Беластоку, Лідзе, Кобрыне, Брэсце. Вуліцы многіх іншых гарадоў Польшчы і Заходняй Беларусі былі заліты крывёю. У Вільні было паранена 12 дэманстрантаў, з іх 8 цяжка, 9 чалавек арыштавана[58]. У Баранавічах было арыштавана каля 40[59].

Пасля перавароту рэпрэсіі ўзмацніліся яшчэ больш. Часовае захапленне Пілсудскім рассейвалася. У перадавым артыкуле «Да нармальнае працы» газета пісала: «Так ужо наладжана жыццё народаў, што даюць толькі тым, хто мае сілу сам узяць, а ў слабых адбіраюць і тое, што яны маюць, ды не могуць самі ўтрымаць...»[60]

Менавіта другое паўгоддзе 1926 года стала перыядам найбольш буйнага росту БСРГ. У гэтым несумненную ролю адыграла і расчараванне палітыкай фашысцкага ўрада Пілсудскага.

Якраз у дні майскага перавароту былі прыняты праграма і статут Грамады. БСРГ паставіла перад гурткамі задачу палітычнага і арганізацыйнага выхавання кожна-

[57] «Беларуская справа», 1926, 4 чэрвеня.
[58] «Беларуская справа», 1926, 6 мая.
[59] Там жа.
[60] «Беларуская справа», 1926, 12 чэрвеня.

га члена. У артыкуле «Вёска арганізуецца» «Беларуская справа» пісала: «Першай задачай унутранага жыцця кожнае арганізацыі Грамады будзе палітычнае ўзгадаванне яе сяброў, палітычнае ўзгадаванне вёскі наогул. Другая задача — гэта арганізацыя вёскі дзеля штодзённага змагання за яе правы»[61].

Звярталася ўвага на выхаванне палітычнай свядомасці сялянства. Газета сцвярджала, што падзел зямлі яшчэ не вырашыў сялянскага пытання. Толькі сацыяльнае вызваленне і цесны саюз рабочых і сялян дапамогуць ім дасягнуць сваёй мэты — вызвалення.

У час, калі беларуская нацыяналістычная буржуазія. у тым ліку і дробная, пераходзіла на бок фашысцкага ўрада Польшчы, на падтрымку яго, асабліва ў нацыянальным пытанні, газета ўсё больш смела ставіць задачу інтэрнацыянальнага з'яднання змагаючыхся народаў. Аб'яднанне працоўных беларускай зямлі ў адзінай рэспубліцы таксама вырашаецца праз супольны саюз раўнапраўных народаў, які выцякае як з эканамічнага, так і з палітычнага жыцця. «Сучаснае жыццё народаў выразна развіваецца ў кірунку гаспадарчага аб'яднання нацыянальных тэрыторый. Толькі ж розныя нацыяналізмы і супярэчнасці ў інтарэсах буржуазіі перашкаджаюць такому аб'яднанню»[62],— пісала газета.

«Беларуская справа»— орган, разлічаны ў асноўным на сялянскія масы, імкнуўся стаць блізка да ўсіх працоўных Заходняй Беларусі. З шостага нумара ў газеце вялася рубрыка «Рабочае жыццё», у якой друкаваліся хроніка, карэспандэнцыі, падборкі аб жыцці і барацьбе рабочых. Такія матэрыялы былі змешчаны ў нумарах 9, 12, 16, 24, 25. Праўда, газета больш інфармавала чытача аб пачатку забастоўкі і выстаўленых патрабаваннях, чым задавальненні іх, тым не менш гэтыя публікацыі вучылі рабочы клас Заходняй Беларусі згуртаванасці.

Газета стала ініцыятарам масавай кампаніі па вызваленню палітычных вязняў. У адным з нумароў яе была апублікавана невялічкая заметка аб тым, што быццам бы ўрад збіраецца даць амністыю тым палітычным вязням, якіх прызнае годнымі для вызвалення астрожная адміністрацыя. «Беларуская справа» выступіла

---

[61] «Беларуская справа», 1926, 31 ліпеня.
[62] Там жа.

супраць такога «вызвалення». У артыкуле «Справа палітычных вязняў»[63] газета пісала, што 99 працэнтаў палітзняволеных складаюць рабочыя і сяляне, прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Урад Пілсудскага выпусціў з турмаў тых, хто не выступаў супраць урада, пакінуўшы там рабочых і сялян. «Амністыю далі, але... чорнай сотні. Гэта іронія». З 20 нумара газета пачала перыядычна асвятляць барацьбу за амністыю. У 23 нумары быў змешчан зварот да сялян і рабочых змагацца за сваіх братоў, сяброў і таварышаў, што сядзелі ў турмах.

Рухам за вызваленне палітычных вязняў кіраваў «Міжпартыйны сакратарыят барацьбы за амністыю для палітычных зняволеных», які складаўся з прадстаўнікоў шасці левых партый і БСРГ. Выдавалася нелегальная газета «Амністыя», якая, вядома, пападала і ў гурткі Грамады.

Барацьба за амністыю была часткаю змагання супраць тэрору польскіх улад, вось чаму С. Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч, П. Мятла, Ю. Сабалеўскі не толькі прымалі ўдзел у рабоце «Міжпартыйнага сакратарыята», але і пісалі адозвы. У гурткі дасылаліся друкаваныя бланкі-ўзоры пратэстаў. У перыяд з 31 кастрычніка па 7 лістапада 1926 года БСРГ былі арганізаваны 22 мітынгі, на якіх патрабавалі амністыю для палітвязняў[64].

Пачаткам гэтай дзейнасці паслужыла адозва, складзеная кіраўнікамі Грамады. «Грамадзяне, сяляне, рабочыя і працоўная інтэлігенцыя,— гаварылася ў ёй,— магутным голасам дабівайцеся амністыі, вызвалення ўсіх палітычных вязняў. Усюды збірайце свае подпісы. Памятайце, што кожны ваш подпіс мае значэнне для лёсу вашых сыноў, братоў, сясцёр. Не пакідайце тых, якія жыцця свайго не шкадуюць у барацьбе за лепшую долю працоўных, за зямлю для народа, за вольнасць для прыгнечаных нацыянальнасцей»[65]. І працоўныя адклікаліся. Толькі ў перыяд з 29 лістапада 1926 по 4 студзеня 1927 года пісьмы, у якіх выказвалася падтрымка барацьбы за амністыю, у Цэнтральны сакратарыят Грамады прыслалі 329 гурткоў[66], а разам з польскімі і заходнебеларус-

---

[63] «Беларуская справа», 12 чэрвеня.
[64] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 104, арк. 17.
[65] Там жа.
[66] Гл. А. Сталевіч. Супраць фашысцкай акупацыі (Дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады ў масах). Мінск, 1930, стар. 22.

кімі радыкальнымі партыямі Грамада сабрала да 100 тысяч подпісаў-пратэстаў.

Шырока асвятляла газета міжнароднае жыццё, пісала пра буйнейшую ў Англіі забастоўку вуглякопаў, што працягвалася 7 месяцаў, у якой удзельнічала да мільёна чалавек.

Адразу ж пасля закрыцця ў 1926 годзе «Беларускай справы» пачала выходзіць «Народная справа», фактычна той жа друкаваны орган Грамады. «Народная справа» карысталася поспехам у працоўных.

Чацвёрты нумар газеты быў прысвечаны забастовачнаму руху вуглякопаў у Англіі. Газета змясціла артыкул «Сезонны трыумф сусветных штрэйкбрэхераў», у якім пісала, што Англія штомесячна адпраўляла вялікую колькасць паліва на экспарт у краіны Скандынавіі, Міжземнага мора, Паўднёвай Амерыкі. Польскі ўрад выкарыстаў становішча ў Англіі. Раней польскі вугаль не куплялі, бо ён быў значна даражэй і за англійскі і за нямецкі. Цяпер жа нават англійскія капіталісты вымушаны былі купляць вугаль у Польшчы, што давала добры прыбытак ураду, стабілізавала курс злотага. Калі ў маі 1926 года ў Англію было вывезена некалькі дзесяткаў тысяч тон, дык пастаўкі ў чэрвені склалі 281 тыс., у першай палавіне ліпеня — 306 тыс. тон. Польшча стала міжнародным штрэйкбрэхерам у той час, калі прафсаюзы многіх краін збіралі грошы ў фонд дапамогі англійскаму пралетарыяту. У 35 нумары газета аб'явіла аб зборы сродкаў у дапамогу англійскім вуглякопам. Газета адзначала, што ў барацьбе англійскіх забастоўшчыкаў выяўляецца адзінства, якое злучае сілы працоўных многіх краін.

Газета працягвала выкрыццё палітыкі ўрада Пілсудскага, асвятляла міжнародныя падзеі, шмат увагі ўдзяляла паказу жыцця Савецкай Беларусі. Яе аўтарамі станавіліся ўсё новыя і новыя людзі, рабочыя, сяляне. П. С. Пестрак, вядомы цяпер пісьменнік, менавіта ў «Народнай справе» ўпершыню спрабаваў свае сілы як публіцыст, даслаўшы 28 кастрычніка 1926 года карэспандэнцыю «Банда Пілсудскага».

«Народную справу» змяніла «Наша справа», апошняя газета, што выходзіла ў перыяд дзейнасці Грамады.

Да канца 1926 года Беларуская сялянска-рабочая грамада вырасла амаль у 100-тысячную магутную арганізацыю. Ідэі БСРГ пранікалі ўсюды.

За невялікі тэрмін Грамада правяла некалькі масавых кампаній, сярод якіх выдзяляліся барацьба за амністыю і вызваленне палітвязняў, за беларускую школу, за павелічэнне заработнай платы і г. д. Арганізацыя стала настолькі магутнай і аўтарытэтнай, што польскія ўлады пачалі баяцца пашырэння дзейнасці БСРГ. Пачаліся арышты, праследаванні кіраўнікоў гурткоў, забарона сходаў. Адным з дзікіх разгулаў польскага фашызму стаў разгром павятовага з'езда БСРГ Бельскага павета ў вёсцы Стара-Беразова Арлянскай гміны.

4 нумар «Нашай справы», які расказваў аб нападзе паліцыі на з'езд, быў канфіскаваны, 6 нумар, які выйшаў толькі 15 снежня, змясціў паведамленне «Справа аб нападзе на з'езд Грамады ў Бельскім павеце — у сейме», у якім гаварылася, што БСРГ 10 снежня 1926 года падала тэрміновае запытанне ў сейм адносна беспрэцэдэнтнага акту польскіх улад. Яго падпісалі Беларускі, Украінскі пасольскія клубы, паслы камуністычнай фракцыі і іншыя — каля 50 чалавек. Запытанне, зразумела, было адкладзена сеймам.

У наступных нумарах газета змяшчала пратэсты гурткоў БСРГ, ТБШ і іншых арганізацый з усёй Польшчы. «Там, дзе ўжываюцца самыя жорсткія рэпрэсіі, імкненне да арганізацыі не змяншаецца ў масах, а ўзмацняецца. У «пакараныя» гурткі ўступаюць усё новыя члены, месца пасаджаных за краты дзеячоў займаюць новыя людзі»[67],— пісала газета.

10 снежня 1926 г. «Наша справа» змясціла фатаграфіі паслоў П. Мятлы і П. Валошына — ахвяр паліцэйскага беззаконня. Перадавы артыкул нумара рэдакцыя азаглавіла «Гартуйма нашы сілы».

15 снежня Галоўная Управа ТБШ[68] надрукавала «Адкрытае пісьмо да старшыні Савета Міністраў Польскае дзяржавы маршала Пілсудскага». У адрас газеты і Цэнтральнага сакратарыята Грамады ішлі сотні пісьмаў-пратэстаў, прывітанняў параненым паслам. Вось пісьмо гуртка БСРГ з вёскі Пужычы Жыдамлянскай гміны Гродзенскага павета: «З газеты «Наша справа» мы даведаліся, што нашы беларускія няўстанныя барацьбіты — паслы Мятла і Валошын — сталі ахвярамі нападу на павятовым з'ездзе ў Бельшчыне.

[67] «Наша справа», 1926, 4 снежня.
[68] «Наша справа», 1926, 15 снежня.

Гэты выпадак і перанясенне мук нашых вялікіх дзеячоў адчувае кожны з нас, беларусаў, у сваім сэрцы і гатовы ў кожны момант падставіць свае грудзі за сваіх глыбока паважаных паслоў.

Вітаем Вас, дарагія паслы! Вітаем Вас за Вашу цвёрдасць духа, за моцную і цвёрдую абарону свайго становішча! Вітаем Вас як правадыроў беларускага народа,— і будзьце ўпэўнены, што Вы не адны, а тысячы з Вамі, з Вамі ўся Беларусь! Жадаем Вам, дарагія паслы Мятла і Валошын, хуткага выздараўлення.

Хай жыве Беларусь! Хай жывуць паслы! Хай жыве Беларуская сялянска-рабочая Грамада!»[69]

Два нумары газеты — 6(15) і 7(16), якія выйшлі ў студзені 1927 года, прысвячаліся масавым арыштам членаў Грамады. 6 (15) нумар адкрываўся шапкай «Масавыя арышты ва ўсёй Польшчы. Арышты беларускіх паслоў і культурных дзеячоў». 19 студзеня лік арыштаваных па няпоўных даных складаў 153 асобы[70]. Апошні нумар 7(16) выйшаў 22 студзеня 1927 года з падборкай матэрыялаў на ўсю першую паласу «Водгукі масавых арыштаў».

«Наша справа» з асаблівай сімпатыяй адносілася да БССР і СССР. Цікавым у гэтым сэнсе быў пераднавагодні нумар, які выйшаў 24 снежня 1926 года. У перадавым артыкуле, азаглаўленым «На развітанне», супрацьпастаўляліся факты жыцця працоўных у Польшчы, іншых краінах капіталістычнага свету і ў СССР. Газета пісала, што на Захадзе з кожным годам павялічваецца барацьба паміж працай і капіталам, з аднаго боку — нарастае фашызацыя (Італія, Польшча, Літва), з другога — павялічваецца барацьба працоўных за волю і ўладу. У якасці прыкладу газета прыводзіла сямімесячную барацьбу вуглякопаў Англіі. Толькі СССР будуе светлае жыццё. «У БССР,— адзначала газета,— звыш 4 тысяч беларускіх школ, некалькі дзесяткаў тэхнікумаў, 4 вну, адкрыты другі беларускі тэатр у Віцебску...»

Газета была закрыта. Аднак літаральна праз 4 дні А. Эйсак выдаў новую газету Грамады «Наш голас». З 11 нумароў 5 былі канфіскаваны. Газета паведаміла на ўсю Заходнюю Беларусь аб новым зладзейскім акце польскіх улад — расстрэле дэманстрацыі ў Косаве.

---

[69] «Наша справа», 1926, 15 снежня.
[70] «Наша справа», 1927, 19 студзеня.

Газета неаднаразова выкрывала дзейнасць урада «санацыі», які вёў наступленне не толькі на палітычныя, але і эканамічныя правы працоўных.

Пасля закрыцця «Нашага голасу» грамадоўцы выдалі яшчэ 4 нумары газеты «Наша воля» (з 4 па 12 сакавіка, пад кіраўніцтвам М. Машары) і аднадзёнку «Наш водклік» (16 сакавіка, выдавец М. Закржэўскі)[71].

Кіраўніцтва Грамады выдавала: «Бюлетэнь клуба БСРГ» (выходзіў з 11 ліпеня 1925 года. Выдана 16 нумароў), газету «Народны звон» лацінкай на беларускай мове з 1 снежня 1926 па 28 сакавіка 1927 года (выйшла 8 нумароў) і гумарыстычны двухтыднёвы часопіс «Маланка» са студзеня 1925 да 26 снежня 1928 года. У 1927 годзе выйшла 10 нумароў (апрача канфіскаваных), у 1928 годзе — 18.

«Маланку» рэдагавалі ў розны час Я. Касяк, М. Луцэвіч, Я. Маразовіч. Часопіс высмейваў польскі ўрад, беларускіх нацыяналістаў, служак польскіх улад. Вось, напрыклад, два сатырычныя паведамленні з рубрыкі «Свежыя навіны»: «Кажуць, што з прычыны частых канфіскацый беларускіх газет віленская адміністрацыйная ўлада маніцца выпісаць з заграніцы адумнёную машынку-аўтамат, якая без помачы чалавека магла б канфіскаваць па некалькі газет у дзень». Або: «Кажуць, што адказны рэдактар газеты «Думка працы» мае атрымаць тытул «ганаровага абываццеля» на... Лукішках за пабіццё ім сусветнага рэкорду ў галіне атрыманых канфіскацыяў»[72].

Афармленне газеты несла асаблівую сэнсавую нагрузку. З правага боку назвы была намалявана вёска, з левага — горад (намёк на рабоча-сялянскі саюз), а паміж імі — зямны шар, спавіты маланкамі. Цікава рабілася і першая паласа. Яна, як правіла, мела вялікі малюнак, які сімвалічна выражаў падзеі дня. Вось, напрыклад, малюнак у № 17 (25 снежня 1926 года) «Дзядэк польскі» (Дзед Мароз — Пілсудскі). Малюнак названы «Святочны падарунак беларусам». «Дзядэк» вешае цацкі і кажа: «Хай ведаюць беларусы, што я і пра іх дбаю. Вось мая для ўсіх святочная ёлка з падарункамі. Хай пацешацца!»

[71] М. Машара, А. Зубовіч, К. Шаблоўская і іншыя — усяго 8 чалавек — затым былі арыштаваны, сядзелі ў турме больш як два гады.

[72] «Маланка», 1928, 5 сакавіка.

А на ёлцы надпіс: «Зямельная рэформа — асаднікам, папам — унія, усім — устава «крэсова», прэсе — кара ў 5 тысяч злотых, канфіската; дзецям — асвета пры цьмянай свечцы, паслам —«недатыкальнасць», грамадзянам — падаткі, рабочым — бяспраўе, голад, нам — кароль».

У 1928 годзе сакратаром рэдакцыі часопіса стаў Міхась Васілёк. Разам з ім працаваў Я. Маразовіч, які падпісваўся псеўданімам Янка Маланка і часта змяшчаў сатырычныя вершы. Супрацоўнічалі І. Дварчанін, У. Паўлюкоўскі[73], Я. Пачопка, Ж. Янка, Башкір і інш. М. Васілёк пісаў: «Працаваць доўга ў рэдакцыі мне не давялося. Аднаго разу ноччу паліцыя сцягнула мяне соннага з рэдакцыйнага стала, дзе я спаў (ложка не было), зрабіла ў рэдакцыі вобыск, забрала ўсе падшыўкі «Маланкі», а нас з рэдактарам арыштавала... Часткова я быў задаволены тым, што хоць трохі ў дэфензіве і паламалі бакі, але дамоў прывязлі бясплатна, бо грошай на дарогу ў мяне не было. У апошнія часы паліцыя забараніла ўсім ранейшым падпісчыкам «Маланкі» выпісваць «камунізуенцы» часопіс. Знаходзіліся смельчакі, якія прысылалі падпіску, але такіх было вельмі мала, і гэтых грошай нам з рэдактарам на пражыццё не хапала»[74].

Мастакамі ў часопісе працавалі графікі Я. Горыд, В. Сідаровіч, Я. Маразовіч. Першым сярод іх быў Язэп Горыд. «Сацыяльна напоўненыя, палітычна завостраныя карыкатуры Горыда трапна выкрывалі прадстаўнікоў пануючых класаў, дзяржаўнай адміністрацыі Польшчы на чале з маршалкам Пілсудскім. Выразная сваёй мастацкай формай, горыдаўская сатыра раскрывала антынародную сутнасць палітыкі буржуазных міністраў, клерыкальных дзеячоў, прадажных журналістаў, паслугачоў санацыйнага рэжыму з ліку «сваіх» беларускіх згоднікаў — усіх душыцеляў вызваленчага руху працоўных»[75],— пісаў аб ім А. Ліс.

«Маланка» канфіскоўвалася па любой прычыне. Іншы раз часопіс канфіскоўваўся яшчэ задоўга да выхаду. Гэта не давала магчымасці выдавацца рэгулярна. Пасля восьмага нумара, які выйшаў 25 жніўня, толькі 22 кастрычніка рэдакцыя выдала сатырычную аднадзёнку «Пя-

---

[73] Пісаў пад псеўданімам Улад-Ініцкі.

[74] М. Васілёк. Аўтабіяграфія. Зб. «Пра час і пра сябе». Мінск, 1966, стар. 69—70.

[75] Арсень Ліс. Пётра Сергіевіч. Мінск, 1970, стар. 23.

кучая маланка» з матэрыяламі, канфіскаванымі ў нумарах 9—10: «Закрыццё Радашковіцкай гімназіі», «Спадарова» лекцыя». 11 нумар выйшаў 5 снежня 1928 года. Праўда, 30 лістапада рэдакцыя выдала другую аднадзёнку —«Новая маланка», канфіскаваную ўладамі за фельетон «Усемагутны паліцыянт» і карыкатуру пад назвай «Часы змяняюцца».

Высмейваючы фашысцкую Польшчу і яе парадкі, рэдакцыя імкнулася выкарыстоўваць кожную магчымасць часопіса, нават рубрыку «Наша пошта». Вось некалькі адказаў, якія пацвярджаюць думку: «С. Слёзнікаву: Карыкатуру і верш «Адчыніце вастрожныя дзверы» змясціць не можам, бо баімся, што гэтыя дзверы не адчыняцца, але зачыняцца за нашым рэдактарам»[76]. «Я Саладусе: Жарты вашы вельмі добрыя. Чытаючы іх, мы смяяліся шчыра, але ў «Маланку» змясціць не можам, сканфіскавалі б напэўна»[77]. «К. Слабому: Хоць вы «Слабы», а пішаце «моцныя» жарты, за іх пан пракурор і 129 арт. К. К. не пашкадуе! Нічога не падыйшло»[78].

Ад пачатку выдання двухтыднёвіка (студзень 1926 года) да 26 снежня 1928 года выйшла 40 нумароў «Маланкі», 7 было канфіскавана. Тыраж часопіса вырас да 3000 экземпляраў.

Пачэснае месца ў шэрагу грамадоўскіх газет займае і двухтыднёвік «Народны звон»— сялянска-рабочая газета, разлічаная на католікаў, якія жылі ў межах Заходняй Беларусі.

Газета мела клішыраваны загаловак: на фоне заводскіх комінаў і бабак жыта двое людзей, якія сімвалізавалі рабочага і селяніна, білі ў вялікі звон. Назва газеты была надрукавана чырвонымі літарамі.

У артыкуле першага нумара «Ад рэдакцыі» гаварылася: «Выпускаючы ў свет першы нумар новай беларускай газеты, зразумела, мусім перш-наперш прадставіцца чытачам: хто мы такія, якая наша праграма, што напісана на нашым штандары.

На нашым штандары напісана: барацьба за нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы беларускага народа»[79].

Далей газета пісала, што толькі ў барацьбе можна

---

[76] «Маланка», 1926, 15 снежня.
[77] «Маланка», 1928, 30 красавіка.
[78] «Маланка», 1928, 31 мая.
[79] «Народны звон», 1926, 7 снежня.

заваяваць лепшую долю, але трэба ведаць, як весці яе. Падкрэслівалася, што для БСРГ (газета адкрыта не называла сябе яе органам) няма розніцы паміж праваслаўнымі і каталікамі, бо ўсе тыя, хто гаворыць на роднай мове — дзеці адной маці — Беларусі. Газета заклікала да салідарнасці і згоды паміж працоўнымі ўсіх народаў, да барацьбы за зямлю, «сапраўдны і добры» самаўрад, за родную школу, крэдыт і эканамічную дапамогу сялянам, за абарону правоў рабочых, супраць непамерных падаткаў, палітыкі асадніцтва, прыцяснення з боку паліцыі і адміністрацыі, супраць усялякае несправядлівасці і крыўды. «Годзе век цярпець»— вось лозунг, пад які газета заклікала стаць працоўныя масы.

Як бачна, «Народны звон» не мог адкрыта гаварыць моваю марксістаў. Тут невыразнасць фармуліровак: «пакрыўджаных і прыгнечаных», «пануючыя і прыгнятаючыя», «варштаты працы», «сапраўдны і добры самаўрад» і г. д. і разам з тым папулярнае тлумачэнне ідэй сацыялізма, заклік да аб'яднання і барацьбы. Гэтай тэме быў прысвечаны і артыкул Жука. «Трэба ісці ў сялянска-рабочыя арганізацыі,— пісаў аўтар,— якія ў салідарнасці з працоўнымі ўсяго свету вывядуць на сапраўдны шлях вызвалення і загояць усе набалеўшыя раны»[80].

Газета мела рубрыкі: «Фельетон», «З усяго свету (апошнія навіны)», «Польшча», «СССР», «З беларускага жыцця», «У Радавай Беларусі», «Віленская хроніка», «Хроніка з Заходняй Беларусі», «Карэспандэнцыі».

Толькі ў першым нумары ў рубрыцы «У Радовай Беларусі» змяшчалася 19 паведамленняў: аб стыпендыях для беларускай моладзі, аб продажы кніг, аб адкрыцці 100 новых школ, аб увядзенні факультэтаў журналістыкі, аб колькасці студэнтаў у вышэйшых навучальных установах Савецкай Беларусі.

Газета была закрыта 7 красавіка 1927 года пастановай Віленскага акруговага суда.

Такім чынам, дзейнасць Грамады працягвалася з 30 чэрвеня 1925 па 30 сакавіка 1927 года. За гэты час было выдадзена каля 240 нумароў газет, «Бюлетэня» і часопіса «Маланка», з якіх больш 50 было канфіскавана. З газет найбольш паслядоўнымі ў палітычных патрабаваннях былі «Народная справа», «Наша справа» і «Наш го-

[80] «Народны звон», 1926, 7 снежня.

лас», якія выходзілі ў самы адказны і напружаны момант у дзейнасці БСРГ.

Многа зрабіў для развіцця дэмакратычнай прэсы пасол П. Мятла, які на працягу некалькіх месяцаў быў выдаўцом газет. У склад рэдакцый увaходзілі дзеячы Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, Ул. Самойла, Я. Бабровіч («Сымон») — прадстаўнік ЦК КПЗБ пры кіраўніцтве Грамады і фактычны рэдактар газет.

Рэдакцыйны штат складаўся з афіцыяльнага рэдактара (звычайна «зіцрэдактара», які нават не правіў пісьмы чытачоў), адміністратара, які вёў улік паступленняў, купляў паперу, аплачваў друкарню, экспедытара (займаўся дастаўкай газет на пошту) і чатырох наборшчыкаў, якія працавалі ў друкарні. Такі невялікі штат тлумачыўся адным: матэрыяльнымі цяжкасцямі.

Грамадоўскі друк стаў трыбунай для масавай паэзіі. У адным з нумароў газета «Наш голас» у «Паштовай скрынцы» пісала, што рэдакцыю закідаюць вершамі, а змяшчаць усе няма магчымасці. І ўсё ж на старонках газет друкаваліся вершы, накіраваныя супраць прыгнятальнікаў. Яны заклікалі прачнуцца ад спячкі, падняцца на барацьбу. Часта даводзілася карыстацца прыёмамі інверсіі, звароту да мінулага, каб праз яго паказаць цяжкі сучасны лёс працоўных.

Як успамінаў заходнебеларускі паэт Алесь Салагуб, грамадоўскі рух выклікаў вялікі рэвалюцыйны ўздым. Ён абуджаў патрэбу пісаць, а з лепшых селькораў выраслі новыя сілы ў літаратуры. Гісторыя захавала тамы пратэстаў, часта вершаваных. Пісалі з-пад Белавежы, Гродна, Беластока, Вільні. Лепшае друкавалася. Рэдакцыя магла выбіраць сапраўды добрыя рэчы, напісаныя даволі сакавіта і красамоўна[81].

Справядлівым з'яўляецца сцвярджэнне П. Пестрака аб тым, што ў час дзейнасці БСРГ заходнебеларуская мастацкая літаратура, асабліва паэзія, перажывала свой першы этап —«пераход ад масава-самадзейнай творчасці да прафесіянальна-аўтарскай»[82].

1925—1927 гады адкрылі заходнебеларускаму чытачу

---

[81] Гл. Алесь Салагуб. Мастацкая літаратура Грамады. «Полымя рэвалюцыі», 1933, № 1.

[82] Падрабязней гл. аб гэтым Піліп Пестрак. Кастрычнікам народжаная. Гісторыка-рэвалюцыйная тэма ў творчасці беларускіх пісьменнікаў. «Літаратура і мастацтва», 1970, 30 студзеня.

імёны М. Васілька, П. Пестрака, М. Машары, А. Салагуба, В. Таўлая, маладога М. Засіма і інш. У 1927 годзе літаратары Заходняй Беларусі паспрабавалі аб'яднацца, стварыўшы прагрэсіўную арганізацыю «Веснаход». У яе ўвайшлі і некаторыя прадстаўнікі беларускай нацыянальнай літаратуры. Але статут арганізацыі не быў зацверджаны ўладамі, а, значыць, арганізацыя не была афіцыяльна прызнана. У 1928 годзе яе прадстаўнікі выдалі зборнік «Рунь веснаходу», у якім выступілі з творамі М. Васілёк, М. Машара, П. Пестрак, А. Бартуль, і інш. Тым не менш няўдалая спроба 1927—1928 гадоў была ажыццёўлена праз пяць гадоў стварэннем новай прагрэсіўнай арганізацыі, калі ў заходнебеларускую літаратуру прыйшлі М. Танк, А. Рэдзька, А. Іверс (І. Д. Міско), Н. Тарас, Г. Новік, П. Граніт (І. Івашэвіч), С. Крывец, А. Мілюць, П. Сушко і інш.

Грамада пакінула прыкметны след у гісторыі заходнебеларускага дэмакратычнага руху. Да гэтага часу нават Еўропа не ведала падобнага прыкладу, калі б за кароткі тэрмін была створана амаль 100-тысячная арганізацыя. Грамада паказала адзін з лепшых прыкладаў арганізацыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, выкарыстання кампартыяй легальных форм барацьбы для аб'яднання і згуртавання народных мас. Грамада мела вялікі ўплыў на шырокія народныя масы Заходняй Беларусі, ускалыхнула, далучыла іх да палітычнага жыцця. БСРГ падняла класавую свядомасць працоўных, усяліла ў іх упэўненасць у свае сілы, у магчымасць паспяховай барацьбы з замежнай акупацыяй, паказала шляхі і метады гэтай барацьбы. Сваёй дзейнасцю яна аказала вялікі ўплыў на ўсё наступнае развіццё рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Далучаючы да актыўнай палітычнай барацьбы шырокія слаі працоўных, Грамада садзейнічала стварэнню і выхаванню шматлікага актыву з працоўных сялян. Актыў, які вырас у яе радах, на працягу многіх гадоў служыў асноўнай крыніцай папаўнення КПЗБ[83].

Беларуская сялянска-рабочая грамада была разгромлена, аднак распаўсюджванне дэмакратычнай прэсы не

---

[83] Гл. В. Полуян, И. Полуян. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии. Минск, 1962, стар. 119.

спынілася. Да арганізацыі Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне», створанага пасля выбараў у сейм 1928 года, прайшоў значны час, і, каб кіраваць узрастаючай барацьбой працоўных горада і вёскі, патрэбен быў перыядычны друкаваны орган. У гэты час выходзіць газета «Наша праўда», а затым —«Праца». 15 разоў выданне мяняла назву. У агульнай колькасці выйшла 118 нумароў, 51 з іх канфіскаваны. Польскія ўлады «пабілі» свой «рэкорд», бо цяпер замест 3—4 канфіскоўваўся кожны другі нумар беларускай радыкальнай газеты.

Нягледзячы на жорсткія ўмовы, дэмакратычныя газеты імкнуліся несці да чытача праўду, клікаць да барацьбы. Яны мелі ад 6 да 8 тысяч сталых падпісчыкаў. Гэта нямала, улічваючы рэпрэсіі супраць былых грамадоўцаў, выкліканыя падрыхтоўкай панскай Польшчы да новых выбараў.

Першай сярод гэтых газет была «Наша праўда» (выйшла 50 нумароў). Ад 1 да 19 нумара рэдагаваў яе (з'яўляўся «зіцрэдактарам») селянін з Гродзеншчыны С. Л. Татарын[84].

Газета ўважліва сачыла за падзеямі ў самой Польшчы, імкнучыся нават праз нязначныя факты выкрываць каланіяльную палітыку Пілсудскага. Вось адзін з прыкладаў, як «Наша праўда», умела выкарыстоўваючы паведамленні буржуазных газет, прымяняла іх у выхаванні свядомасці працоўных. «Пшэглёнд віленскі» ў нумары ад 24 жніўня 1927 года (артыкул «Гмінныя выбары») паводле статыстычных даных аб выбарах у самаўрады з глыбокім неспакоем заяўляў аб росце ўплыву левых сіл у Віленскім ваяводстве, дзе членаў кампартыі было выбрана 5,5 працэнта, прыхільнікаў былой Грамады 9,9, прыхільнікаў НПХ[85] —1,5— усяго 17 працэнтаў. Газета «Наша праўда» ў 41 нумары, каменціруючы гэтыя лічбы, пісала, што нават яны не адлюстроўваюць праўды, бо 90 тысяч беларусаў у Віленскім ваяводстве былі пазбаўлены выбарчых правоў як былыя члены Грамады, а выбары мно-

[84] Серафім Лук'янавіч Татарын, член КПЗБ з 1925 года. З 1926 года працаваў у БСРГ, ТБШ, «Змаганні». У 24 гады пачаў падпісваць газету. Затым сядзеў у Лукішках, у Вронках, Картуз-Бярозе. Жыве ў вёсцы Вострава Зельвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Доўгі час настаўнічаў, цяпер на пенсіі. У рабоце выкарыстаны некаторыя дакументы, прадстаўленыя нам С. Л. Татарыным.— *С. Г.*

[85] НПХ — незалежная сялянская партыя Польшчы.

гіх беларусаў, кандыдатаў у склад гмінных самаўрадаў, быліануляваны, і ні адзін войт з ліку беларусаў не быў зацверджан Віленскім староствам.

Газета нацыяналістаў «Беларускі дзень» у адным з артыкулаў пісала, што беларусы, маючы сваіх Янку Купалу і Якуба Коласа, не маюць яшчэ сваіх Міцкевічаў, свайго Шаўчэнкі, называла здабыткі беларускай культуры і навукі парасткамі, а не самой навукай і культурай. У 11 нумары «Наша праўда», даючы водпаведзь нацыяналістычнай газеце, пісала, што не толькі славянскія народы — велікарусы, украінцы, чэхі,— але і неславянскія бачаць на нашым Парнасе і Міцкевічаў і Шаўчэнкаў. Выдатны рускі паэт Валерый Брусаў захапляўся творамі Купалы і перакладаў іх.

Увесь культурны свет бачыць, як за мяжой, якая падзяліла беларускі народ, працуюць тысячы беларускіх школ, у тым ліку чатыры вышэйшыя, бачыць, як рукамі народа ствараецца беларуская нацыянальная культура.

Усе тыя, хто хоча пераканаць масы ў слабасці беларускага народа, даюць толькі доказ сваёй уласнай нікчэмнасці. Ім беларускі народ адкажа глыбокай пагардай[86].

«Наша праўда» існавала на працягу некалькіх месяцаў 1927 года. Гэтае адзінае ў 1927 годзе радыкальнае выданне на беларускай мове несла ў масы праўду аб жыцці і барацьбе.

Шэраг газет, якія мы разглядаем як адно выданне пад агульнай назвай «Праца», 1 кастрычніка 1927 года адкрыўся газетай «Наша праца», якую падпісаў у свет Т. Ліхач. Выдавалі яе паслядоўнікі Грамады, тыя, хто стаў затым прыхільнікамі пасольскага клуба «Змаганне», пераемніка БСРГ.

Перадавы артыкул першага нумара «Не пакладайце рук!» быў прысвечаны барацьбе за школу на роднай мове. За час кампаніі па збору дэкларацый іх было сабрана звыш 10 тысяч на сотні школ. Аднак у Віленскай школьнай акрузе збіраліся адкрыць толькі 14 беларускіх і 10 так званых «утраквістычных» (двухмоўных) школ. На самай справе і гэтыя адзінкавыя школы не былі адкрыты. Газета крытыкавала палітыку ўрада ў адносінах да беларускіх настаўнікаў, якіх пазбаўлялі работы

[86] «Наша праўда», 1927, 11 мая.

ў школе і якія вымушаны былі шукаць любую працу, у тым ліку і фізічную.

Газета ўважліва адносілася да жыцця вёскі, да ўмацавання брацкай салідарнасці паміж рабочымі і сялянамі. Перадавы артыкул другога нумара «Вёска — рабочым» газета прысвяціла забастоўцы, што пачалася на запалкавай фабрыцы ў Гродна. Яе падтрымаў прафесіянальны саюз рабочых хімічнай прамысловасці на ўсёй Заходняй Беларусі; у Вільні, Пінску і іншых гарадах былі праведзены грашовыя зборы. Хутка да забастоўшчыкаў далучыліся рабочыя Пінска, а затым і многіх прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці цэнтральнай Польшчы.

Забастоўка працягвалася некалькі месяцаў. Сяляне вырашылі аказаць дапамогу сваім братам-рабочым. Газета паведамляла, што з розных куткоў Гродзеншчыны для забастоўшчыкаў пачалі паступаць прадукты. Заканчваўся артыкул словамі: «Так вёска паказала, што яна глыбока верыць у правільнасць палітыкі адзінства працоўнага фронту, так сяляне не на словах, а на справе выяўляюць перамогу ў масах сялянска-рабочай ідэалогіі»[87]. Трэці нумар газеты быў канфіскаваны за некалькі артыкулаў, у тым ліку і прысвечаны вёсцы —«Метамарфозы» («Перараджэнне нашае вёскі») — артыкул аб змене настрояў у вёсцы, аб далучэнні яе да грамадскага жыцця. Перадавы артыкул гэтага нумара «Асаблівая ўзаемнасць» быў прысвечаны польска-літоўскаму канфлікту. І хоць нумар быў канфіскаваны, у наступным газета зноў паведаміла аб гэтым канфлікце, бо ён праліваў святло і на польска-беларускія адносіны.

Справа выглядала так. Віленскія буржуазныя газеты надрукавалі быццам бы пісьмо 28 польскіх настаўнікаў з Літвы (Коўна) аб тым, што літоўскія ўлады пазбавілі іх працы і пасадзілі ў турму. Яны звярталіся да сваіх «братоў» з заклікам аб дапамозе, бо іх «душаць, пазбаўляюць грамадзянскіх правоў за тое, што яны выкладалі польскім дзецям навуку ў роднай мове... Як гэта было падобна на беларускую мову і школу! На самай жа справе польскія «настаўнікі» ў Коўна адкрыта заклікалі Пілсудскага акупіраваць і тую частку Літвы, што яшчэ не была занята. Віленскія «браты» пачалі склікаць мітынгі,

[87] «Наша праца», 1927, 5 кастрычніка.

сходы, выпускаць адозвы. У ноч з 4 на 5 кастрычніка ў Вільні і ў тых паветах, дзе жылі літоўцы, былі праведзены арышты і вобыскі. Улады зачынілі настаўніцкую літоўскую семінарыю ў Вільні, 48 прыватных школ таварыства «Рытас», арыштавалі старшыню таварыства Краўяліса і іншых яго членаў[88].

9 лістапада, напярэдадні сёмай гадавіны акупацыі Вільні палякамі, сюды прыехаў сам Пілсудскі разам з многімі міністрамі, членамі ўрада. Палякі, што жылі на Ковеншчыне, выпусцілі спецыяльную адозву, у якой заклікалі маршалка далучыць усе літоўскія землі да Польшчы.

«Наша праца» толькі расказала аб гэтых падзеях, не каменціруючы іх. Але кожнаму беларусу станавіліся зразумелымі дзеянні польскіх улад. Яны яшчэ раз пераконвалі ў тым, што толькі пастаянная і няспынная барацьба прывядзе народ Заходняй Беларусі да вызвалення.

У канцы 1927 года ў Польшчы праходзілі выбары ў самаўрады, яны мелі вялікае значэнне, бо з'яўляліся як бы генеральнай рэпетыцыяй перад выбарамі ў сейм 1928 года. І працоўныя масы рабілі ўсё, каб у мясцовыя органы ўвайшлі прадстаўнікі ад народа. Газета «Наша праца» актыўна асвятляе гэта пытанне. У 6 нумары яна падвяла вынікі выбараў у Лодзі, Калішы, Кельцах, Уладзіміры-Валынскім. У гэтым жа нумары газета пісала аб выбарах у Гродна. Аб'яднаны рабочы блок тут атрымаў 2010 галасоў, ці 5 мандатаў, што гаварыла аб значнай перамозе аб'яднаных сіл рабочага класа.

Аднак ужо 22 кастрычніка 1927 года газета паведамляла, што ў Гродна былі арыштаваны ўсе пяць дэпутатаў «Аб'яднанага рабочага блоку». Улады паказвалі, як яны адносяцца да імкнення працоўных мас вырашаць справы праз сваіх пасланцоў у мясцовых органах.

У наступным нумары «Наша праца» пісала: «Рост свядомасці і арганізаванасці сялянска-рабочых мас, які выявіўся пры выбарах у самаўрады, вывеў з раўнавагі ўсё абшарніцтва і буржуазію Польшчы, яе прэса крычыць аб паляванні мас, аб небяспецы злева.

Абшарніцтва, пазбаўленае «дэмакратычнага» спосабу абароны сваіх інтарэсаў праз самаўрады, прымушана

[88] «Наша праца», 1927, 11 кастрычніка.

абараняць гэтыя інтарэсы паміма іх, прымушаючы ўрад адкрыта выявіць сваю класавую сутнасць»[89].

КПЗБ імкнулася кіраваць выбарамі ў самаўрады, а затым і іх работай. Часопіс «Бальшавік» рабоце мясцовых органаў прысвяціў некалькі артыкулаў[90]. КПЗБ надавала самаўрадам вялікае значэнне, але галоўнае заключалася ў шырокай агітацыі сярод выбаршчыкаў на прадпрыемствах, фабрыках і заводах, у вёсках, маёнтках і фальварках. Агітаваць трэба было не на пасяджэннях гмінных рад і павятовых сеймікаў, а на мітынгах, перадвыбарчых сходах, дэманстрацыях — вось той шлях, па якому павінны былі ісці рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы Заходняй Беларусі.

«Наша праца» часта карысталася метадам супастаўлення, друкуючы матэрыялы аб палітыцы польскіх улад, паказваючы цяжкае эканамічнае становішча і побач — матэрыялы аб Савецкай Беларусі. У нумары за 26 кастрычніка 1927 года газета змясціла матэрыял «Дзяржаўныя даўгі Польшчы». Надрукаваны ён быў у сувязі з новай пазыкай Польшчы ў ЗША 62 мільёнаў долараў. Пазыка была зроблена на кабальных умовах —7 працэнтаў гадавых. Польшча пайшла на такі крок не з дабра. Газета друкавала лічбы ўсіх відаў даўгоў Рэчы Паспалітай, рабіла падлік, што толькі дзяржаўных даўгоў на плечы кожнага працоўнага кладзецца па 150 злотых.

І літаральна ў наступным, 9 нумары, у рубрыцы «За граніцай» быў змешчаны артыкул «Бюджэт у СССР», дзе расказвалася аб бюджэце Савецкай краіны на 1927/1928 год, абвешчаным Народным камісарыятам фінансаў. Бюджэт павысіўся ў параўнанні з даваенным 1913 годам на 85 мільёнаў рублёў, на 9 працэнтаў больш, чым у 1926/1927 годзе. Газета пракаменціравала і размеркаванне бюджэту. Так, на армію ў Савецкім Саюзе ідзе 15 працэнтаў, у той час як у царскай Расіі ішло 27, а ў Польшчы — адна трэць. Астатняя частка ў СССР ідзе на эканамічнае і культурнае развіццё. У раздзеле «З Радавае Беларусі» газета надрукавала артыкул «Універсітэцкі гарадок», у якім паведамлялася, што пры Народным камісарыяце асветы створана спецыяльная будаўнічая камісія, якая кіруе будаўніцтвам Універсітэцкага

[89] «Наша праца», 1927, 26 кастрычніка.
[90] Гл. «Бальшавік», 1927, № 4—5 (19) і інш.

гарадка ў Мінску. Архітэктурны план 12 карпусоў гарадка зрабілі дойліды Масквы і Мінска (нават і тут паказ брацкіх сувязей народаў Савецкага Саюза, бескарыслівай дапамогі рускага народа беларусам). Завяршыць будаўніцтва намячалася за чатыры гады. Кошт будоўлі складаў 1 мільён 453 тысячы рублёў[91].

Артыкул, надрукаваны ў гэтым жа нумары, паведамляе аб тым, што Польшча робіць пазыку на велізарную суму грошай, а ў другім — Савецкая Беларусь адпускае велізарную суму грошай на будаўніцтва свайго універсітэта.

Польскія ўлады прымянялі суровыя рэпрэсіі супраць беларускіх выданняў. Віленскае староства не раз прасіла пракурора акруговага суда аб арыштах рэдактараў. Аб прэсе вялася вострая дыскусія і ў сейме. Сейм адной са сваіх пастаноў скасаваў дэкрэт аб дадатковых абмежаваннях для прэсы. Урад Пілсудскага не прызнаў гэты дэкрэт. Маршал сейма Ратай, паведамляючы ўраду аб пастанове сейма, прапанаваў надрукаваць пастанову ў «Дзённіку ўставаў» (дзяржаўны зборнік новых законаў і пастаноў), але Пілсудскі і міністр унутраных спраў Мэйштовіч адмовіліся друкаваць яе, спаслаўшыся на тое, што пастанова не «мела падставы з канстытуцыяй». У верасні 1927 года Ратай напісаў прэм'ер-міністру другое пісьмо, якое таксама не было прынята.

Супраць прэсы зноў прымяняліся рэпрэсіўныя меры. Па ўсёй Польшчы пракацілася хваля пратэстаў. Многія легальныя газеты пераходзілі на нелегальнае становішча. У Варшаве і іншых гарадах пачалі з'яўляцца газеты-лісткі, газеты-адозвы. 28 верасня 1927 года кіраўніцтва саюза варшаўскіх журналістаў аднагалосна прагаласавала: публічна пратэставаць супраць скасавання ўладамі сеймавай пастановы.

Радыкальная беларуская прэса ў 1927 — 1928 гадах цярпела неверагодную жорсткасць і прыцясненні. Амаль кожны другі нумар газет канфіскоўваўся. Цяпер рэдакцыі чакалі святкавання выхаду ў свет 10 нумара, але газеты, як правіла, закрываліся раней. У час выбараў у сейм і сенат у 1928 годзе беларускія радыкальныя газеты 9 дзён канфіскоўваліся запар[92]. Ад сярэдзіны лютага

---

[91] «Наша праца», 1927, 26 кастрычніка.

[92] Гл. А. Салагуб. Мастацкая літаратура Грамады. «Полымя рэвалюцыі», № 1, 1933, стар. 156.

да сярэдзіны сакавіка 1928 года радыкальныя выданні не выходзілі зусім, бо кожны нумар іх канфіскоўваўся. Між тым яшчэ ў 1914 годзе У. І. Ленін пісаў: «Кожны разумее, што палітычная газета ёсць адна з асноўных умоў для ўдзелу любога класа сучаснага грамадства ў палітычным жыцці краіны наогул, а ў прыватнасці і для ўдзелу ў выбарчай кампаніі»[93].

Выданні, якія выходзілі ў гэты час, няцяжка пералічыць: «Маланка»— двухтыднёвы гумарыстычны часопіс, адзіны орган, які працягваў традыцыі Грамады; «Родныя гоні», «Саха», «Студэнцкая думка»— месячныя часопісы і два штотыднёвікі беларускіх клерыкалаў — адзін для католікаў, другі — для праваслаўных. Уся прэса, за выключэннем «Маланкі», мела яўна буржуазна-нацыяналістычную афарбоўку.

11 студзеня газета «Думка працы» назвала выбарчую праграму беларускай нацыяналістычнай буржуазіі «Праграмным трафарэтам». Яе прадстаўнікі ў сваёй платформе, выкарыстоўваючы розныя дэмакратычныя лозунгі, імкнуліся звесці беларускія масы са шляху рэвалюцыйнай барацьбы, што было на руку Пілсудскаму і яго кампаніі. У артыкуле «Надзеі паноў Умястоўскага і Гурына і іх аргументацыя» газета пісала: «Гурын і Умястоўскі збіраюцца стаць адзінымі прадстаўнікамі беларускага народа ў час выбараў. У адной з перадавіц «Беларускага дня»—«Перад выбарамі»— яны пішуць, што ў Заходняй Беларусі ёсць чатыры блокі на выбары: «Хіена» (польская правіца), блок нацыянальных меншасцей, грамадоўскі і... дэмакратычны. Тры першыя — праціўнікі маршала, значыць яны загінуць на выбарах. Толькі Гурын і Умястоўскі ў тым ліку маюць шчасце папасці ў сейм.

Дабіваюцца яны гэтага не салодкімі абяцаннямі, як Ярэміч і Рагуля, а страшаць: мы за маршала, паспрабуйце ісці супраць нас.

...Мы лічым занізкім для сябе адказваць, а звяртаемся да беларускіх працоўных гушчаў — будзьце гатовы да выбараў, выкарыстайце ваша адзінае права паказаць сваю волю, без хістанняў гатуйцеся стаць адзіным фронтам працоўных! Ганіце прэч усіх прадажнікаў, панскіх наймітаў і здраднікаў, якія хочуць на нашай не-

---

[93] У. І. Ленін. Творы, т. 18, стар. 174.

свядомасці выехаць, каб пасля нанава прадаваць нас. Будзем стойкімі!»[94]

Чаго толькі не рабіла беларуская «жоўтая прэса» у час перадвыбарчай кампаніі. «Народ», «Наша бацькаўшчына» і «Хрысціянская думка» ксяндза Станкевіча, «Сялянская ніва» Ярэміча і Рагулі, «Беларускае слова» Умястоўскага і Гурына ашалела кідаліся на радыкальны друк, дапамагаючы ўраду ў канфіскацыях.

Дэмакратычныя сілы імкнуліся выкарыстаць кожную спрыяльную магчымасць у барацьбе. Асноўны змест «Маланкі» першых месяцаў 1928 года — падрыхтоўка да выбараў. У нумары 3 (5 сакавіка) газета змясціла «Казку аб «наўчоным спадару» (Янка Станкіўчык па дакументах), Ярэме-баламуце і Чатырку-чмуце». Фельетон высмейваў «беларускіх працаўнікоў» Станкевіча, які агітаваў на Лідчыне, Ярэміча — на Свянцяншчыне і Чатырку—на Навагрудчыне. Мы прыводзім вытрымкі з «Казкі», напісанай з сарказмам, згубным для беларускіх «спадароў»: «З даўніх пор людзі кажуць, што калі дрэнна жывецца, дык Люцыпар вінават (пякельны начальнік — заўвага рэдакцыі.— *С. Г.*). Выклікаў ён Спадара, Ярэму і Чатырку, каб ішлі ў Заходнюю Беларусь за мандатамі.

Ярэма на кірмашы ў мястэчку: «Сяляне,— кажа,— вы дурні! Вас чмуцяць розныя прайдзісветы. Не слухайце іх! А слухайце толькі мяне, я іду з нямецкай і яўрэйскай буржуазіяй. У іх шмат долараў і гольд-марак. А, вядома, хто грошы мае — той усё мае. Бачыце, якое я пуза маю! Хто мне яго даў? — грошы! Я купіў дачу ў Калеціі пад Вільняй. За што купіў? — за грошы! А цяпер хачу завесці ў сябе малочную гаспадарку. А за што ўсё гэта?— за грошы!

Дык бачыце, ўсё робіцца толькі за грошы. А калі я буду багаты, дык і вам мо' што-колечы перападзе.

А дзеля гэтага галасуйце за...»

Ярэма не закончыў, бо тысячы рук абхапілі яго футру і сцягнулі з возу»[95].

Выбары ў сейм закончыліся паражэннем «беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам». З 444 дэпутацкіх мандатаў блок атрымаў усяго 123, астатнія атрымалі тыя,

[94] «Думка працы», 1928, 11 студзеня.
[95] «Маланка», 1928, 5 сакавіка, стар. 4.

хто крытыкаваў палітыку Пілсудскага. Кампартыя Польшчы атрымала 1 мільён 296 тысяч 840 галасоў (у 5 разоў больш, чым на выбарах 1922 года), з іх 328 тысяч 832— галасы працоўных Заходняй Беларусі (26 працэнтаў)[96], не лічачы 70 006 ануляваных галасоў у Лідскай і Брэсцкай акругах.



ДОЛЯ ПРАЦЫ

Гульня у дэмакратыю.

КАМУНІКАТ

Беларускага Сялянска-Работн. Пас. Клюбу

Рыс. 4.

У склад сейма ад КПП увайшлі 7 дэпутатаў. Па спісах рабоча-сялянскага блока Заходняй Беларусі ў сейм увайшлі І. Е. Гаўрылік, І. Дварчанін, А. Стагановіч, па спісу ўкраінскага «Сельроба-лявіцы» ў Брэсцкай акрузе — І. Грэцкі. Да спіса далучыўся Ф. Валынец (прайшоў па спісах беларускіх нацыяналістаў). У лютым 1929 года А. Стагановіча замяніў П. С. Крынчык. Такім чынам, у сейме беларускія радыкальныя паслы выступілі ў складзе: І. Дварчанін, І. Гаўрылік, І. Грэцкі, Ф. Валынец і П. Крынчык, якія адразу ж уступілі ў кантакт з камуністычнай фракцыяй сейма.

Газета «Голас працы» у першым жа нумары (14 красавіка) у перадавым артыкуле «Што паказалі выбары» пісала аб марных надзеях Ярэміча, Станкевіча і іншых,

[96] Т. Глинская. КПЗБ — руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924—1928 гг. Минск, 1965, стар. 176.

якія разлічвалі правесці ў сейм 35 беларускіх паслоў (у сапраўднасці было праведзена пяць).

Газета «Воля працы» (выходзіла і пад назвай «Доля працы», рыс. 4) паведаміла, што ў Найвышэйшы суд у Варшаве да 20 лютага паступіла 783 скаргі на прыцясненні. Гэта быў своеасаблівы рэкорд, бо пасля выбараў 1922 года за ўвесь час было атрымана толькі 336 скарг[97]. Тут жа праз «Паштовую скрынку» газета дасылала адказы 35 карэспандэнтам, якія пісалі ў газету перадвыбарчыя карэспандэнцыі.

Беларуская дэмакратычная прэса не раз адзначала, што выбары ў сейм не ёсць нешта вянчаючае справу. Гэта адна з магчымасцей паказаць працоўным масам сваю палітычную падрыхтаванасць, момант мабілізацыі ў пэўны час свядомых сіл. Не выказваліся вялікія надзеі і на новы сейм. Газета-аднадзёнка «Красавік», выдадзеная Я. Германовічам роўна праз месяц пасля выбараў, 5 красавіка 1928 года пісала: «Сейм ёсць трыбуна, з якой працоўныя масы могуць таксама чуць і шчырае слова, сочачы за якім яны могуць таксама чуць і бачыць усю фальш і брахню розных прытворных прыяцеляў, як розныя папээсы, стронніцтвы хлопскія (нібы сялянская партыя), вызваленцы і інш., якія, крычучы голасна аб сваіх добрадзействах, фактычна з'яўляюцца добрай прыладай у руках буржуазіі для панавання над працоўнымі». Газета засцерагала ад наіўных думак аб тым, быццам бы буржуазія добраахвотна здасць свае пазіцыі. Толькі ўпартая штодзённая барацьба працоўных за свае чалавечыя правы, толькі арганізаванасць, вытрымка, разуменне свайго становішча і сваіх задач маглі прывесці да перамогі.

Друк БСРГ і друк грамадоўскага напрамку пасля яе разгрому арыентаваўся на масавага чытача, выступаў за правы працоўных Заходняй Беларусі.

## ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ «ЗМАГАННЯ»

Беларускі пасольскі клуб «Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых», які ўзнік у 1928 годзе і працаваў пад непасрэдным кіраўніцтвам КПП і КПЗБ, наладзіў кантак-

---

[97] «Воля працы», 1928, 17 сакавіка.

ты з паслам і камуністычнай фракцыі. У першыя дні работы ён зрабіў тры запытанні ў сейм: па справе выбарчых прыцясненняў, арышту паслоў у дзень адкрыцця сейма і спынення суда над Грамадой. У першым нумары газеты «Голас працы» (14 сакавіка 1928 года) была надрукавана адозва да беларускага народа. Паведамлялася, што сейм на пасяджэнні 31 сакавіка прыняў пастанову аб утварэнні «надзвычайнай камісіі», якая на працягу трох месяцаў будзе правяраць правільнасць пратэстаў выбаршчыкаў. Адозва была складзена на аснове запытання ў сейме аб выбарчых гвалтоўніцтвах і заклікала працоўных дасылаць у клуб свае пратэсты. Запытанне, праўда, не было прынята, як не было прынята і другое, ад 30 сакавіка 1928 года, у якім патрабавалася неадкладнае вызваленне паслоў і дзеячоў Грамады, асуджаных акруговым судом у Вільні. Яго падпісалі 14 паслоў — Грэцкі, Хам, Дварчанін, Гаўрылік, Валынец, Стагановіч і інш.

У пачатку мая 1928 года Беларускі пасольскі клуб «Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых» памяняў назву на Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне», а 30 мая І. Дварчанін у сейме зачытаў «Дэкларацыю Беларускага сялянска-рабочага клуба», змешчаную затым у чацвёртым нумары газеты «Зара працы»[98]. Нумар быў канфіскаваны.

Хоць фармальна БСРПК «Змаганне» і не быў арганізацыяй, якая існавала па-за сеймам (клуб не меў ні сваёй афіцыяльна аб'яўленай і зацверджанай праграмы, ні статута), дзейнасць яго была непасрэдна звязана з жыццём народа, з барацьбой за яго надзённыя інтарэсы і патрабаванні, за тактычныя лозунгі і палітычныя ўстаноўкі Беларускай сялянска-рабочай грамады.

Сакратарыяты клуба былі створаны ў многіх гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі — Лідзе, Вілейцы, Маладзечна, Слоніме, Баранавічах, Навагрудку, Вішнёве, Ашмянах, Комава, Гродна, Брэсце, Пінску і інш.[99] Але перашкоды з боку ўлад і раскольніцкая дзейнасць беларускай нацыяналістычнай інтэлігенцыі не далі магчымасць павятовым камітэтам стаць дзейснымі арганізатарамі вызваленчага руху. Яны абмежаваліся распаўсюджваннем дэмакратычнай прэсы, радыкальнай літаратуры.

---

[98] «Зара працы», 1928, 13 чэрвеня.
[99] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 301, арк. 9.

Польскія ўлады праводзілі ў Заходняй Беларусі новыя рэпрэсіі. План ліквідацыі БСРГ пашыраўся і далей — на ліквідацыю БСРПК «Змагання»[100]. Больш замаскіраванымі былі дзеянні беларускіх ренегатаў — нацыянал-сацыялістаў, згоднікаў. Беларускія нацыяналістычныя групоўкі ўплывалі на частку інтэлігенцыі. Яны мелі шырокія выдавецкія магчымасці. Вось чаму клубу «Змаганне» патрэбна было весці паўсядзённую барацьбу з імі. Кампартыя, імкнучыся больш шырока выкарыстоўваць легальныя формы барацьбы, з'явілася ініцыятарам стварэння клуба. Так, у адным з дакументаў ЦК КПЗБ гэтага часу гаварылася: «Зараз жа ў Вільні прыняць меры да стварэння і легалізацыі радыкальнай палітычнай арганізацыі з баявых грамадоўцаў (Вясковаму аддзелу вызначыць склад ініцыятыўнай групы, распрацаваць платформу і ўстаў яе). Гэта работа павінна весціся таксама і ў іншай форме — па лініі газеты «Наша праца». Трэба зараз жа прыступіць да арганізацыі з'езда сімпатыкаў «Нашай працы» пад маркай абмеркавання напрамку газеты і г. д. Першы ж ці адзін з наступных з'ездаў пакладзе асновы новай сялянскай радыкальнай партыі»[101].

Тут жа прапанавалася ўдзяляць большую ўвагу рабоце ў кааператывах — арганізацыях гурткоў сялянскай самадапамогі. Гэтыя арганізацыі былі нешматлікія і, як правіла, знаходзіліся пад уплывам нацыяналістаў. ЦК КПЗБ вырашыў перайменаваць існаваўшы ў Вільні «Камітэт дапамогі ахвярам стыхійных выпадкаў» у аддзел агульнапольскай арганізацыі «Самадапамогі». Звярталася ўвага на работу ў самаўрадах і па ўзмацненню кампаніі барацьбы з голадам, адзначалася роля, якую павінна была адыграць прэса. «Шырока разгарнуць кампанію ў прэсе,— гаварылася у дырэктыве,— выдаваць спецыяльныя адозвы і камунікаты клуба, у якіх патрэбна асвятляць памер голаду, падкрэсліваць, што голад з'яўляецца вынікам акупацыйнай палітыкі фашысцкага ўрада, дэмаскуючы ўсе мерапрыемствы фашысцкай дыктатуры, кабальны характар урадавай «дапамогі», а таксама дэмагогію сацыял- і нацыянал-фашыстаў,

[100] За ўдзел у Грамадзе ў маі 1928 года быў арыштаваны пасол І. Грэцкі. У чэрвені — А. Стагановіч. Яго месца ў сейме заняў П. Крынчык.

[101] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 142, воп. 1, сп. 156, арк. 99—100.

змяшчаючы карэспандэнцыі з галодных раёнаў, у якіх асаблівую ўвагу звярнуць на асвятленне фактаў выступленняў мас у барацьбе з фашысцкай дыктатурай»[102].

ЦК КПЗБ імкнуўся ў любых абставінах, пры любой магчымасці выкарыстоўваць легальную трыбуну. Клубу былі зроблены заўвагі на недахопы зваротаў: у іх не гаварылася аб падрыхтоўцы імперыялістычных колаў да вайны, не крытыкавалася беларуская санацыя, не выстаўлялася кіруючая роля рабочага класа. У адозве, прысвечанай Першамаю, гэтыя недахопы былі выпраўлены. Вось лозунгі, якія былі выстаўлены клубам: «Супраць эксплуатацыі, здзеку і крыўды сялян і рабочых; за зямлю без выкупу працоўнаму сялянству; за 8-гадзінны працоўны дзень; за поўнае самавызначэнне народаў, за беззваротную дапамогу галадаючым; за поўнае вызваленне ад падаткаў галадаючых, беззямельных і малазямельных сялян і за вызваленне з астрогаў правадыроў БСРГ і ўсіх палітзняволеных; за свабоду сялянска-рабочай прэсы; супраць фашызму, супраць імперыялістычнай вайны; няхай жыве саюз сялян і рабочых усіх нацыянальнасцей, няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад»[103].

У верасні 1930 года БСРК «Змаганне» на рускай і беларускай мовах выдаў адозву да ўсіх рабочых і сялян, да ўсіх працоўных мас Заходняй Беларусі ў сувязі з прадстаячымі новымі выбарамі. У час перадвыбарчай кампаніі было разаслана 35 400 экземпляраў гэтай адозвы[104]. Яна была пабудавана на супастаўленні фактаў эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця панскай Польшчы і СССР, раскрывала сутнасць беларускай нацыяналістычнай буржуазіі. «Беларускія нацыянал-фашысты,— пісалася ў адозве,— бароняць інтарэсы беларускай буржуазіі і кулацтва і ў цесным саюзе з польскімі капіталістамі і абшарнікамі пад камандай фашысцкай дыктатуры напружваюць усе сілы для барацьбы з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам, з беларускімі працоўнымі масамі для арганізацыі вайны, паднявolення БССР пад маскай утварэння «Незалежнай буржуазнай беларускай рэспублікі» ў федэрацыі з фашысцкай Польшчай. Гэта найбольш небяспечныя во-

---

[102] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 383, арк. 21.
[103] Там жа, арк. 22.
[104] Там жа, сп. 156, арк. 123.

рагі для беларускіх працоўных мас, бо ідуць да гэтых мас пад маскай абаронцаў іх інтарэсаў, пад маскай барацьбы за нацыянальнае вызваленне»[105]. БСРК «Змаганне» заклікаў весці барацьбу за зямлю без выкупу, за самавызначэнне, саюз рабочых і сялян, паднявольных народаў у адзіным інтэрнацыянальным фронце.

Улады бачылі магутную падрыхтоўчую работу і, баючыся новага шырокага пад'ёму рэвалюцыйнага руху, кідалі за краты беларускіх паслоў. 25 жніўня 1929 года ў Вільні паліцыя арыштавала 9 сакратароў павятовых клубаў, увесь склад Цэнтральнага сакратарыята, яго тэхнічных работнікаў, нават двух наведвальнікаў — усяго 16 чалавек. Арыштаваныя прасядзелі два тыдні на Лукішках[106]. Затым кожны з іх атрымаў яшчэ па два месяцы арышту «адміністрацыйным парадкам».

30 студзеня 1930 года ў сакратарыяце БСРПК улады зрабілі рэвізію, забралі пішучыя машынкі, арыштавалі многіх работнікаў клуба. Арышты прайшлі па ўсёй Заходняй Беларусі. У Глыбокім, напрыклад, быў зняволены сакратар павятовага камітэта С. Ігнатовіч і яшчэ восем сялян. Пасля допросаў сялян вызвалілі, а С. Ігнатовіч быў адпраўлены ў турму Лукішкі[107].

4 лістапада 1930 года на адзін год турмы ў Гродна быў асуджан пасол П. Крынчык, 12 лістапада І. Дварчанін атрымаў шэсць гадоў астрогу[108]. 15 лістапада С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла і М. Бурсевіч выдалі адозву, у якой пісалі: «3 мая 1930 года ўрад Пілсудскага яшчэ больш жорстка пачаў праследаваць нацыянальна-вызваленчы рух. У астрозе яшчэ Валошын, кінуты за краты паслы «Змагання» Валынец, Дварчанін, Гаўрылік і Крынчык, тысячы ў турме, разбіваецца ТБШ і яе члены, ліквідаваны спіскі рабоча-сялянскага блоку.

Беларускі народ павінен гуртавацца. Ён адкіне такіх, як Акінчыц, які быў выпадкова ў Грамадзе, а цяпер у кулацка-буржуазнай групе Астроўскага — Луцкевіча і К°. Стаў нават на чале Цэнтрасаюза, каб баламуціць масы ў час выбараў. Не выйдзе.

Зацверджаны сеймам гадавы бюджэт да 3 мільярдаў злотых, сцягваемых з вас крывавых падаткаў, ідзе на

[105] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 156, арк. 19—20.
[106] «Наша газета», 1929, 15 верасня.
[107] «На варце», 1930, 13 сакавіка.
[108] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 156, арк. 87.

паліцыю, астрогі, войска і ўзбраенне... Не праз сейм вядзе дарога да вызвалення, а праз упартую барацьбу з буржуазным ладам, праз барацьбу за штодзённыя патрэбы»[109].

З адозвай да беларускіх працоўных выступіў былы кіраўнік БСРГ Б. Тарашкевіч, які заклікаў змагацца супраць фашысцкай дыктатуры, за поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных, галасаваць за скасаваны спіс «Змагання» № 8. І працоўныя падтрымалі тых, хто змагаўся за іх правы. Толькі ў Лідскай акрузе ў мінулыя выбары было прызнана несапраўднымі 70 000 галасоў, пададзеных за кандыдатаў рабоча-сялянскага блока. Цэнтральны выбарчы камітэт БСРПК «Змаганне» звярнуўся да працоўных Лідчыны з вялікай адозвай яшчэ мацней згуртавацца вакол клуба.

У пачатку кастрычніка акруговыя камітэты былі створаны ў Лідзе, затым у Слоніме, Валожыне, Маладзечна. Людзі, якія працавалі ў іх, падвяргаліся праследаванням. У Слоніме было арыштавана 3 чалавекі, у Валожыне —2, у Маладзечне староства наогул адмовіла ў легалізацыі камітэта[110]. У Косаве ў камітэце працаваў П. Пестрак (затым ён быў арыштаваны, выйшаў з турмы толькі у 1933 годзе).

У час выбараў была створана шырокая сетка выбарчых камітэтаў, 16 сакратарыятаў на месцах[111].

Аднак фашысцкі ўрад Польшчы так і не змог дасягнуць галоўнай мэты — аслабіць адзінства беларускіх працоўных. Ні тэрор, ніануляванне спісаў рабоча-сялянскага блока не змаглі зламаць іх волю. 14 працэнтаў ад агульнай колькасці галасоў было пададзена за кандыдатаў, прадстаўнікоў працоўных мас[112].

Амаль на працягу ўсяго 1931 года вялося следства па справе клуба, а ў пачатку 1932 года быў аб'яўлены прыгавор паслам «Змагання». У лютым 1932 года ЦК КПЗБ выдаў на беларускай мове лістоўку «Прысуд паслам «Змагання», у якой заклікаў працоўных стаць у абарону Дварчаніна, Валынца, Гаўрыліка і Крынчыка. Самі былыя паслы не здаваліся, вялі барацьбу. 10 сакавіка 1932 года яны звярнуліся з адозвай да працоўных склікаць

---

[109] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 156, арк. 87.
[110] Там жа, сп. 110, арк. 132.
[111] Там жа, сп. 265, арк. 46.
[112] Там жа.

масавыя сходы, выбіраць першамайскія камітэты, арганізоўваць дружыны масавай самаабароны.

Выданні БСРПК «Змаганне»— газеты «Праца», «Беларуская газета», «Свет», «Світанне» і іншыя адыгрывалі значную ролю ў згуртаванні працоўных, у мабілізацыі іх на масавыя кампаніі. Выданні «Змагання» былі канфіскаваны 25 разоў, аднак газеты «Свет», «Світанне», «Наша газета», «Праца», «На варце» даходзілі да шырокіх мас. Аб кожным факце тэрору ўлад у адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху дэпутацкая фракцыя «Змагання» паведамляла праз сеймавую трыбуну і свой друк[113].

Віленская абшарніцкая газета «Слова» ў 1929 годзе цынічна пісала, што БСРПК «Змаганне» не выдае нават сваёй газеты. У абарону клуба выступіла газета «Савецкая Беларусь», якая 18 чэрвеня 1929 года ў артыкуле «Чаму маўчыць радыкальная беларуская прэса ў Заходняй Беларусі» пісала аб тым, што ў час дзейнасці БСРГ газеты канфіскоўваліся за палітычны напрамак. Цяпер жа яны забараняліся без усялякіх на гэта прычын. Паліцыя стаяла з гатовымі распараджэннямі аб канфіскацыі ўжо каля друкарскіх машын. Рабіліся санітарныя агляды, якія іншы раз зацягваліся на месяцы. Так, у Вільні, у друкарні Левіна (Нямецкая вуліца, 22), дзе ў асноўным друкаваліся радыкальныя выданні, была зроблена санітарная праверка. Нягледзячы на тое, што яна была лепшай у Вільні і што рабочыя не выказвалі незадавальнення ўмовамі працы, гаспадару далі штраф у 3 000 злотых за «антысанітарныя ўмовы». Затым друкарню закрылі. Праз некаторы час яна зноў была адкрыта, але Левін адмовіўся друкаваць выданні БСРПК «Змаганне». Гаспадары друкарняў у Вільні, Гродна, Беластоку таксама адмаўляліся друкаваць беларускія дэмакратычныя выданні. Вось чаму маўчала беларуская прэса. У 1929 годзе ў Вільні на беларускай мове (гражданкай і лацінкай) выходзіла 13 газет і часопісаў, з іх радыкальнымі былі толькі 2 выданні, у 1930— адпаведна 14 і 1, у 1932—12 і 1, у 1933—13 і 2. «Беларуская крыніца» ў першым нумары (10 студзеня 1931 года) са злараднасцю пісала, што ў 1930 годзе не было чуваць тых, хто прывык

---

[113] Гл. аб гэтым: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии. Минск, 1966, стар. 194.

увасабляць у сабе ўвесь беларускі рух (маюцца на ўвазе дэмакратычныя выданні).

КПЗБ уважліва сачыла за газетай БСРПК «Змаганне» і іншымі радыкальнымі выданнямі, кіравала імі.

У час ад 12 сакавіка да 27 лістапада 1928 года газета БСРПК «Змаганне» мяняла назву восем разоў. Выйшла 78 нумароў, 33 былі канфіскаваны. Тыраж газеты складаў да 7 000 экземпляраў.

Самай стойкай і паслядоўнай была газета «Голас працы», якая выходзіла ў красавіку — маі 1928 года. З 14 нумароў 3 былі канфіскаваны, але гэта не перашкодзіла ёй весці непрымірымую барацьбу. Газета шырока асвятляла судовы працэс над дзеячамі Грамады, рабочы рух, асабліва ў першамайскія дні 1928 года.

21 красавіка ў газеце быў перадрукаваны матэрыял віленскага «Слова» аб рашэнні кампартыі і ППС-лявіцы выступіць сумесна ў дзень святкавання Першамая. 28 красавіка ў перадавым артыкуле «Перад Першым маем» было напісана: «Свята Першае мая зарадзілася ў абставінах зразумення працоўнымі гушчамі свайго цяжкага становішча, зразумення патрэбы барацьбы за сваё вызваленне. Гэта сапраўднае свята для ўсіх». У заключэнне газета пісала, што беларусы ў гэты дзень таксама павінны змагацца за свае правы. Некалькі нумароў газеты былі канфіскаваны: 8 нумар — за артыкул «1 Мая ў Вільні», перадавы артыкул «Грамада» і заметку «Арышты ў Львове». Але ж і пасля гэтага на старонках газеты з'яўляліся невялікія заметкі аб святкаванні Першамая ў Слоніме, Навагрудку, Шчучыне і іншых гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі.

27 жніўня газета надрукавала прамову пасла Ф. Валынца на абмеркаванні бюджэта Міністэрства ўнутраных спраў, якому вызначалася 108 мільёнаў злотых. Валынец смела гаварыў аб тым, што гэтыя грошы пойдуць на яшчэ большае прыцясненне народаў нацыянальных меншасцей. Ад імя клуба «Змаганне» ён прапанаваў не галасаваць за бюджэт міністэрству.

Рэдакцыя газеты БСРПК «Змаганне», бадай, упершыню ў радыкальным беларускім друку завяла спецыяльную рубрыку — «Куток моладзі». Такіх «куткоў» было выпушчана два. Другі, змешчаны ў газеце «Да працы», заняў цэлую паласу. Былі надрукаваны рэдакцыйны артыкул «Аб чым пісаць?», верш М. Васілька «Моладзь»,

артыкул, які выкрываў дзейнасць польскай фашысцкай маладзёжнай арганізацыі «Стралец».

Асабліва цяжкім у выхадзе газет клуба «Змаганне» было другое паўгоддзе 1928 года. «Слова працы» было канфіскавана 5 разоў, газета «За працу»—7. Ад 21 кастрычніка да 27 лістапада падпісчыкі не атрымалі ніводнага нумара газеты. Усе яны былі канфіскаваны.

Афіцыйныя рэдактары, як правіла, на газету не аказвалі ўплыву. Яе рэдагавалі паслы І. Дварчанін, А. Грэцкі і Ф. Валынец, у ёй супрацоўнічалі Я. Маразовіч, М. Шыла і іншыя[114].

Выдавецкая дзейнасць БСРПК «Змаганне» мела вялікае значэнне ў развіцці беларускай радыкальнай прэсы. За час існавання клуб выдаў у агульнай колькасці (без уліку надрукаваных прамоў паслоў, адозваў, зваротаў, брашур і кніг) 15 газет, у тым ліку 1 аднадзёнку.

Працоўныя чакалі газету. Вось чаму пасля выхаду газеты «Свет» ЦК КПЗБ адзначаў: «Гэта буйнае дасягненне ў нашай працы. Ужо з першага нумара відаць сувязь газеты з масамі. Шмат карэспандэнцый і наогул досыць жыва пастаўлены аддзел інфармацыі — трэба безварункова залічыць у актыў газеты»[115]. Бюро ЦК КПЗБ уважліва сачыла за гэтым выданнем. Былі падрабязна прааналізаваны першыя пяць нумароў, зроблены крытычныя заўвагі. ЦК КПЗБ указваў на неглыбокае асвятленне газетай пытання падрыхтоўкі да вайны ў Заходняй Еўропе. Указвалася на недастатковую крытыку і выкрыццё беларускіх нацыяналістаў. У артыкулах аб кааператывах, беспрацоўі, батраках, прафсаюзах не прыводзіліся канкрэтныя факты з жыцця рабочых і сялян. У газеце падчас змяшчаліся артыкулы, якія давалі няправільную характарыстыку Грамадзе, «Змаганню». Выдаўцы яе недаацэньвалі класавую дыферэнцыяцыю ў вёсцы, не бачылі росту кулацка-буржуазных настрояў у пэўнай часткі насельніцтва Заходняй Беларусі.

У Вільні ў гэты час стала немагчыма выданне дэмакратычнай газеты таму, што ўлады не давалі дазволу на выхад новых радыкальных газет, часопісаў, ды і ўладальнікі друкарань Вільні, Гродна, Беластока не хацелі рызыкаваць.

---

114 ЦДА Літоўскай ССР, ф. 53, воп. 23, сп. 2200, арк. 49, 58.
115 ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 98, арк. 299.

15 верасня 1929 года А. Буднік выдаў адзіны нумар «Нашай газеты». Яна надрукавала хроніку, некалькі артыкулаў прысвяціла выкрыццю групы Луцкевіча — Астроўскага. Нумар быў канфіскаваны.

Яшчэ адным выданнем клуба ў Вільні стала «Беларуская газета». Першы нумар штотыднёвіка з'явіўся ў свет 24 кастрычніка 1929 года, але быў канфіскаваны за перадавы артыкул «Адзіны нацыянальны фронт», матэрыялы—«Перспектывы вайны», «Праз новую здраду да новага ашуканства» і рубрыку «Мясцовая хроніка». Другі нумар выйшаў 26 кастрычніка з «белымі плямамі» замест канфіскаваных матэрыялаў. Трэці нумар ад 31 кастрычніка быў таксама канфіскаваны за артыкулы «Планы імперыялізму і сацыял-імперыялізму» і «II Інтэрнацыянал як фактар у падрыхтоўцы імперыялістычнай вайны».

У перадавым артыкуле «Адзіны нацыянальны фронт» (аўтар С. Каваль) характарызаваліся ўмовы, у якіх існавала беларуская прэса. Адзначалася, што «Беларуская газета» пачала выходзіць пасля працяглага перапынку. За гэты ж час газеты беларускіх нацыяналістаў змясцілі мноства артыкулаў з дэзарганізатарскім зместам. Газета выкрывала замаскіраваны характар паслугачоў санацыі. У артыкуле «Перспектыва вайны» (аўтар — Я. С. — Ю. Брун, член ЦК КПЗБ) гаварылася аб росце мілітарызацыі ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША. Ён заканчваўся словамі: «Як павінны адносіцца працоўныя да будучай вайны, прымаючы пад увагу, што вайна будзе толькі супраць іх — вывад напрошваецца сам сабой»[116].

Фактычна ў верасні 1929 года клуб «Змаганне» так і не змог наладзіць выпуск сваёй газеты ў Вільні. Толькі праз сем месяцаў у Варшаве стаў выдавацца штотыднёвік «На варце», апошні друкаваны орган «Змагання», але і ён існаваў нядоўга, выйшла ўсяго 4 нумары (1 і 2 канфіскаваны). Падпісваў газету С. Дзядовіч, вядомы рэдактар беларускіх радыкальных выданняў.

Штотыднёвік «На варце» выйшаў 18 сакавіка 1930 года. У перадавым артыкуле «Ад рэдакцыі» гаварылася аб тым, што беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб, адстойваючы інтарэсы працоўных мас, ведучы барацьбу

---

116 «Беларуская газета», 1929, 24 кастрычніка.

за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, пастанавіў выдаць гэтую газету, каб праз яе мацней трымаць сувязь з працоўнымі масамі Заходняй Беларусі. Разам з вялікімі тэарэтычнымі артыкуламі тут змяшчалася многа карэспандэнцый, заметак. Вось толькі назвы некалькіх рубрык: «З лагеру ворага», «Палітычная хроніка», «Наша хроніка», «З сейму», «Краёвая хроніка», «Мясцовая хроніка», «Загранічная хроніка», «З жыцця рабочых», «З жыцця вёскі», «Выбарчая хроніка».

Першы нумар быў канфіскаваны. Але паліцыя забрала толькі 477 экземпляраў, астатнія атрымалі чытачы. Другі нумар (25 красавіка) таксама быў канфіскаваны за артыкулы «Урадавы крызіс у Польшчы», «Перад кампаніяй сельскагаспадарчых і сезонных рабочых», матэрыялы з аддзела «Краёвая хроніка». Трэці нумар (28 красавіка) выйшаў з белымі плямамі.

Газета пісала аб шматтысячнай арміі батракоў. Сезонныя і падзённыя рабочыя ў сельскай гаспадарцы атрымлівалі ў Заходняй Беларусі за поўны светавы дзень ад 1 да 1,5 злотых, да 90 працэнтаў заробкаў выплочваліся натурай. Пасля работы батракоў выкарыстоўвалі ў якасці прыслугі. Яны не мелі выхадных дзён, дапамогі па хваробе, свайго прафесіянальнага саюза. У Глыбоцкім павеце, напрыклад, моладзь прымалі на работу толькі пасля таго, як яна ўступіць у фашысцкую маладзёжную арганізацыю «Стралец». Газета заклікала працоўных вёскі аб'яднацца, актывізаваць дзейнасць, дабівацца задавальнення сваіх патрабаванняў.

Штотыднёвік меў лёс многіх дэмакратычных выданняў. На чацвёртым нумары ён быў закрыт. Фактычна з гэтага часу стала немагчымым у панскай Польшчы выданне радыкальнай газеты ці часопіса.

Няўдалымі былі спробы выдання часопісаў «Левар», «Крыгалом», вось чаму з канца 1932 года ЦК КПЗБ і кіраўнікі дэмакратычных груп, што працавалі ў легальных умовах, вырашылі выдаваць газеты за мяжой, у Берліне. Гэта было штомесячнае выданне, прысвечанае нацыянальна-вызваленчаму руху,— газета «Барацьба».

Газету ў свет падпісваў нямецкі сацыяліст Пауль Дорнбергер. Распаўсюджванне яе ў Заходняй Беларусі было забаронена. Аднак кампартыя вынаходзіла ўсялякія спосабы дастаўкі яе заходнебеларускім працоўным.

«Барацьба» ставіла мэту распаўсюджвання ў Заход-

няй Беларусі вызваленчых ідэй. Разлічаная на сялянства і прысвечаная развіццю рэвалюцыйнага руху, яна карысталася папулярнасцю ў працоўных.

Пасля разгрому Грамады і «Змагання», ва ўмовах жорсткіх праследаванняў і рэпрэсій, выданне газеты дэмакратычнага напрамку ў Польшчы было зусім немагчыма. У Германіі ж да прыходу да ўлады Гітлера кампартыя дзейнічала ў адносна легальных умовах. «Барацьба» выходзіла невялікім тыражом. У Заходняй Беларусі яна мела значную колькасць карэспандэнтаў. Закрыта была пасля прыходу да ўлады нацыянал-сацыялістаў.

Як вядома, у лютым 1931 года Б. Тарашкевіч зноў быў арыштаваны. 28—29 лістапада 1932 года над ім адбыўся новы судовы працэс. Тарашкевіч атрымаў 8 гадоў астрогу. 23 лютага 1933 года апеляцыйны суд зацвердзіў спагнанне з Тарашкевіча 1200 злотых судовых выдаткаў[117].

«Барацьба» рашуча выступіла за вызваленне Тарашкевіча. Ужо ў першым нумары былі змешчаны партрэт і артыкул аб ім, у другім — артыкул «Шляхам Грамады» з лозунгам «Вырвем Тарашкевіча з крывавых лап акупантаў!»

Газета паказвала эканамічнае становішча, палітычнае бяспраўе працоўных мас Заходняй Беларусі. Рэдакцыя лічыла неабходным выкрываць здрадніцкую палітыку правадыроў беларускай нацыяналістычнай буржуазіі — Луцкевіча, Станкевіча, Ярэміча і іншых, выхоўваць беларускія працоўныя масы, гартаваць іх рэвалюцыйны дух.

Шмат месца ў газеце ўдзялялася не толькі паказу цяжкага эканамічнага становішча працоўных, але і рэвалюцыйным выступленням працоўных. У рубрыцы «З Заходняй Беларусі» змяшчаліся матэрыялы, у якіх падрабязна асвятляліся забастоўкі лясных рабочых Белавежы і Гайнаўкі. Было змешчана некалькі артыкулаў аб жыцці працоўных Савецкай Беларусі.

«Барацьба» павінна была адыграць важную ролю ў кансалідацыі рэвалюцыйных сіл. На старонках яе змяшчаліся пісьмы-прывітанні з усёй Заходняй Беларусі, у якіх выказвалася гарачая падзяка рэдакцыі газеты.

У 1929—1933 гг. выхад заходнебеларускіх дэмакра-

---

117 Антось Віленчук. Супраць расправы акупантаў над Б. Тарашкевічам. Беласток, 1933, стар. 6.

тычных выданняў польскай цэнзурай быў амаль спынены. Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне» пры падтрымцы ЦК КПЗБ рабіў усе захады, каб наладзіць выданне свайго друкаванага органа. Нягледзячы на неверагодныя цяжкасці, газеты БСРПК «Змаганне» «Свет», «Світанне», «Беларуская газета» і іншыя даходзілі да працоўных мас Заходняй Беларусі, у новых умовах заклікалі іх да барацьбы, аб'яднання і згуртаванасці.

## ЗА РОДНУЮ МОВУ, НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КУЛЬТУРУ

На працягу ўсяго перыяду акупацыі працоўныя масы Заходняй Беларусі вялі барацьбу за дэмакратычныя свабоды, у тым ліку і за школу на беларускай мове. Да акупацыі на тэрыторыі будучых «усходніх крэсаў» было каля 500 школ, у 1921 годзе — 359, 1922—47, 1923—29, 1924— ні адной[118]. Яшчэ газета «Наш сцяг» 1 жніўня 1923 года ў перадавым артыкуле «Чарговая крыўда» пісала аб тым, што на два з палавінай мільёны беларусаў у Польшчы ў 1923 годзе мелася каля двух дзесяткаў так званых «беларускіх школ», дзе беларуская мова выкаранялася.

У мэтах барацьбы за рэформу школы, родную мову і родную культуру ў Заходняй Беларусі было створана Таварыства беларускай школы (ТБШ). Заснавальнікамі яго былі прадстаўнікі розных ідэалагічных напрамкаў. Гэта дапамагала сумеснай барацьбе ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у сейм і сенат 1922 года. Статут Таварыства беларускай школы, напісаны Б. Тарашкевічам, А. Дмахоўскім і М. Кахановічам, быў зацверджаны 1 ліпеня 1921 года начальнікам адміністрацыйнага аддзела дэпартамента ўнутраных спраў. Надрукаваны ён быў у некалькіх віленскіх выданнях, у тым ліку ў рэдагаваных М. Гарэцкім «Зборніку «Беларускіх ведамасцей» (№ 1 за 1921 год) і ў газеце «Беларускія ведамасці» (№ 4, 3 кастрычніка 1921 года).

ТБШ стварыла Цэнтральную Школьную Раду (з 1926 года — Галоўная Управа), у склад якой у 1923 годзе былі абраны С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, А. Канчэўскі,

---

[118] ЦДАКР і СБ БССР, ф. 882, воп. 1, сп. 112, арк. 1.

М. Пяткевіч, М. Каханові,  Г. Багдановіч. Таварыства ставіла сваёй мэтай дапамагаць працоўным масам у беларускай асвеце. Па статуту яно мела права ствараць народныя школы, курсы для непісьменных дарослых, настаўніцкія семінарыі, школы выхаваццеляў, бібліятэкі, народныя дамы, выдаваць кнігі і падручнікі, будаваць школы, аказваць матэрыяльную дапамогу вучням і г. д.

24 кастрычніка 1921 года газета «Беларускія ведамасці» змясціла «Мемарандум Цэнтральнай Беларускай Школьнай Рады да міністра асветы Польскай Рэспублікі», у якім паказваліся ўмовы, у якіх працуюць беларускія школы.

31 сакавіка 1924 года ўрадам быў прыняты закон аб школьнай справе на тэрыторыях нацыянальных меншасцей, які распаўсюджваўся і на заходнебеларускія землі. Рабілася як быццам бы ўсё для развіцця нацыянальнай мовы, а на самой справе гэты закон прадугледжваў яшчэ большую паланізацыю насельніцтва нацыянальных меншасцей. Так, па новаму закону беларускія школы не маглі быць адкрыты ў тых гмінах, дзе жыве менш 25 працэнтаў беларусаў, хоць на тэрыторыі гміны магло быць некалькі беларускіх вёсак. Калі ж браць пад увагу падтасоўванні нацыянальнай статыстыкі, дык гэтым закон зусім закрываў школы на роднай мове.

Закон быў удакладнёны 31 ліпеня 1924 года. Па ім беларускія школы маглі адкрыцца там, дзе бацькі 40 дзяцей падалі заявы з просьбай навучання беларускай мове. Дэмакратычны друк уважліва сачыў за барацьбой працоўных за сваю школу. Асаблівая заслуга ў гэтым належала «Сялянскай праўдзе». У 7 нумары (15 кастрычніка 1924 года), 12, 19 і іншых нумарах газета пісала аб злоўжываннях, якія прымянялі ўлады, каб не падпісваць заявы, не даваць працоўным магчымасці пісаць дэкларацыі. Яны пагражалі арыштамі, штрафавалі і г. д.

2 кастрычніка прэм'ер-міністра Польшчы У. Грабскага наведала група беларускіх паслоў і сенатараў. Яны прасілі правесці ў жыццё закон аб беларускай школе, вызначыць крэдыты на арганізацыю і ўтрыманне школ, спыніць перашкоды ў правядзенні сходаў, перавесці беларускіх настаўнікаў у нацыянальныя школы, даць права ЦБШР адкрыць настаўніцкія курсы ў Вільні, субсідыраваць іх. Усе патрабаванні Грабскі прызнаў слушнымі і паабяцаў іх выканаць, але неўзабаве ў Заходняй Белару-

сі пачалі закрывацца нават старыя школы — у вёсках Яглічы і Кавалі Свенцянскага павета і іншых[119].

13 кастрычніка міністр асветы пабываў у Вільні. І зноў пасыпаліся абяцанні, якія нічога не гарантавалі.

Закон аб школе ўваходзіў у сілу з 15 кастрычніка 1924 года. Міністр асветы гэты тэрмін назваў падрыхтоўчым: маўляў, няма беларускіх нацыянальных кадраў, падручнікаў. Гэта, зразумела, была толькі адгаворка. Паводле анкеты, якую правяло ТБШ, у Вільні з канца 1923 па 19 красавіка 1924 года (даныя няпоўныя) у Польшчы заставалася 150 беларускіх настаўнікаў, з іх толькі каля 30 працавалі ў беларускіх школах, 10— у польскіх, астатнія зусім не мелі работы[120].

«Сялянская праўда» ў час прыезду міністра асветы Міклашэўскага ў Вільню ў № 8 (17 кастрычніка 1924 года) змясціла перадавы артыкул «Маніфест міністра асветы. Ніякіх ілюзій!» і артыкул «Толькі з бою! (Віленскія «рэвеляцыі» міністра асветы п. Міклашэўскага)», у якіх выкрывала дзеянні ўрада ў адносінах да беларускай школы.

ТБШ, якое першапачаткова праводзіла работу толькі на тэрыторыі Віленскага ваяводства, звярнулася да ўлад з просьбай стварыць аддзелы ТБШ і ў іншых ваяводствах. Заява была вернута назад. 14 снежня 1924 года адбыўся агульны сход членаў ТБШ у Вільні. На ім былі падведзены вынікі папярэдняй работы, абноўлены склад кіраўніцтва. Старшынёй таварыстваў быў абраны Б. Тарашкевіч, намеснікам — С. Рак-Міхайлоўскі.

У студзені 1926 года быў напісаны праект новага статута ТБШ. Ён больш акрэслена ставіў задачы перад членамі таварыства. 18 мая 1926 года статут быў зацверджаны віленскім ваяводаю, а затым міністэрствам унутраных спраў. ТБШ пачало сваю дзейнасць на ўсіх беларускіх землях.

Праўда, выдавецкай дзейнасцю ў гэты час Таварыства амаль не займалася. Яно выдала «Беларускі каляндар» на 1928 год і неабходную іншую літаратуру. Кіраўнікі ТБШ, як правіла, удзельнічалі ў радыкальнай прэсе грамадоўскага напрамку і, відаць, мелі рацыю, бо гэта аб'ядноўвала дэмакратычныя сілы.

---

[119] «Сялянская праўда», 1924, 4 кастрычніка.
[120] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ФДВ, адз. зах. 1303, стар. 52.

Карэспандэнт газеты «Воля працы» пісаў 31 сакавіка 1928 года з Беластока, што заметкі аб жыцці ТБШ, якія змяшчаюцца на старонках беларускіх газет, даюць магчымасць працоўным даведвацца аб дзейнасці арганізацыі, самім ствараць новыя асветніцкія гурткі.

У гэты час было адчынена звыш 250 народных бібліятэк-чытальняў, 100 народных дамоў. Некаторыя гурткі за час існавання паставілі па 40—50 спектакляў. ТБШ мела некалькі кнігарань, драматычных секцый, хораў, аркестраў. Кожны гурток ствараў секцыі друку і крытыкі, члены якіх актыўна супрацоўнічалі ў дэмакратычнай прэсе.

Многія гурткі мелі бібліятэкі, якія налічвалі па 1000 і больш кніг на рускай, беларускай і польскай мовах[121]. У гэты час гурткі ТБШ аб'ядноўвалі ў сваіх радах каля 30 тысяч чалавек[122].

ТБШ было шматлікай арганізацыяй. Члены Таварыства знаходзілі дарогу нават у армію. Так, штаб IX ваеннай акругі ў справаздачы аб дзейнасці ТБШ за III квартал 1928 года адзначаў: «... За справаздачны перыяд ні адна з беларускіх партый і арганізацый не праявіла актыўнай дзейнасці. Адзіным некалькі больш рухомым аказалася Таварыства беларускай школы.

Устаноўлена, што ТБШ у сваёй аснове пад відам культурна-прасветнай дзейнасці схіляецца да супрацоўніцтва з КПЗБ. Аднак работа гэта праводзіцца вельмі ўмела, і таму адміністрацыйная ўлада не можа выявіць сапраўдную пазіцыю ТБШ»[123].

Улады не толькі імкнуліся выявіць сапраўдную пазіцыю Таварыства беларускай школы, але і фашызаваць яго. Вось чаму ў ТБШ з 1926 года наглядаліся два напрамкі: радыкальны, які ўзначальвалі І. Дварчанін, І. Гаўрылік, Ф. Валынец, і нацыянал-фашысцкі — Астроўскі, Луцкевіч, Шнаркевіч і інш.

8 верасня 1926 года ў Вільні адбыўся агульны сход Таварыства, які выбраў новы склад Галоўнай Управы. Сход прыняў рэзалюцыю, у якой, прымаючы пад увагу дзеянні ўрада, рэкамендаваў адкрываць на месцах прыватныя школы, даручыўшы гэту справу Галоўнай Управе ТБШ. У склад яе ўвайшлі прадстаўнікі Грамады — Б. Тарашкевіч і С. Рак-Міхайлоўскі.

---

[121] Гл. «Летапіс ТБШ», 1936, № 13, студзень-люты-сакавік, стар. 29.
[122] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 265, арк. 47.
[123] ДА Брэсцкай вобласці, ф. 67, воп. сп. 930, арк. 21.

«Наша газета» (15 верасня 1929 года) у артыкуле «Таварыства беларускай школы» пісала: «ТБШ займае першае месца пасля Грамады — арганізацыі, якая была магутным уздымам беларускіх працоўных мас да палітычнага жыцця, да заваявання сваіх палітычных і грамадскіх правоў, паколькі ТБШ з'яўляецца такім жа ўздымам і імкненнем працоўных беларускіх мас да творчай культурнай працы, да культурна-нацыянальнага адраджэння». У 1929 годзе існавала 11 акруговых упраў, 362 гурткі, працавала 130 бібліятэк і хат-чытальняў, 40 народных дамоў.

У 1930 годзе ТБШ налічвала да 10 000 членаў[124]. Значна актывізавалася работа арганізацыі таварыства ў Косаўскім павеце, які заўсёды вызначаўся рэвалюцыйнымі традыцыямі. Толькі за студзень — люты 1930 года тут было прынята ў члены таварыства больш як 200 чалавек.

Выдавецкая дзейнасць ТБШ перыяду 1929—1933 гг. была невялікай у сувязі з пастаяннымі рэпрэсіямі і канфіскацыямі. ТБШ выдала пяць газет, у тым ліку чатыры аднадзёнкі, два часопісы. 28 лютага 1929 года з'явілася аднадзёнка «Весткі», 6 ліпеня 1932 года — «Інфармацыйны бюлетэнь ТБШ», 28 верасня —«Бюлетэнь ТБШ», 30 лістапада —«Наш бюлетэнь ТБШ». У канцы снежня 1932 года быў падрыхтаваны да друку нумар літаратурнага і навукова-папулярнага штомесячніка «Наш палетак» на 16 старонках, разлічанага ў асноўным на моладзь. У склад рэдакцыйнай калегіі яго ўвайшлі Шырма, Стэцкевіч, Марцінчык, Паўловіч і Тарас (псеўданім не расшыфраваны)[125]. Яшчэ ў гранках часопіс быў канфіскаваны. У час ад 11 да 25 снежня ТБШ выдала тры нумары газеты «Шлях». Затым рэдактар К. Чартовіч быў абвінавачаны ў камуністычнай дзейнасці і арыштаваны, а газета закрыта. Нумар 1(4) быў выдадзены толькі 12 лістапада 1933 года пасля звароту на свабоду К. Чартовіча. Выдаваўся часопіс «Летапіс Таварыства беларускай школы», культурна-грамадскі і літаратурны месячнік. Першы нумар часопіса ўбачыў свет у маі 1933 года, у гэтым годзе выйшла 6 нумароў. Існаваў ён і ў апошні

---

[124] Цыт. па кн. И. Ф. Лочмель. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов. Москва, 1940, стар. 147.

[125] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 98, арк. 375—376.

перыяд дзейнасці дэмакратычнага руху пасля закрыцця ТБШ і выходзіў пад назвамі «Летапіс», «Беларускі летапіс». Акрамя гэтага, ТБШ выдавала адозвы, лістоўкі, календары і інш. Гектарграфіраваныя лістоўкі выдавалі і акруговыя ўправы таварыства. У 1931 годзе Мірская і Віленская ўправы выдалі лістоўкі, у якіх расказвалі аб разгроме ўладамі 11 ліпеня ТБШ (па 3000 экземпляраў кожная)[126].

Прычын нерэгулярнага выхаду друкаванага органа ТБШ было многа. Асноўныя з іх — рэпрэсіі, матэрыяльныя цяжкасці. У адным з дакументаў ЦК КПЗБ гаварылася аб падрыхтоўцы трэцяга нумара «Бюлетэня» ТБШ» (маецца на ўвазе «Летапіс ТБШ»), часопіса «Наш палетак», календара ТБШ, якія доўгі час не выходзілі з-за матэрыяльных цяжкасцей. Тым не менш ТБШ са свайго месячнага бюджэту павінна было адпускаць яшчэ 250 злотых на выданне далёкіх ад радыкальнага напрамку «Сахі», «Родных гоняў», а таксама «Заранкі»[127].

Дадатным было з'яўленне штотыднёвіка палітычна-эканамічна-грамадскага зместу — газеты «Шлях». У адным з дакументаў ЦК КПЗБ ад 17 снежня 1932 года адзначалася: «Самым буйным дасягненнем з'яўляецца выданне трох нумароў «Шляху»[128]. І далей: «Чатыры артыкулы канфіскаваны, з-за якіх канфіскавана і газета. Яна пакуль не закрыта, але рэдактар арыштаваны і абвінавачваецца ў камуністычнай дзейнасці. Першыя два нумары былі шырока распаўсюджаны (нават атрыманы водгукі ад сялян з розных месц і 100 злотых на падпіску). Прадпрыймаецца спроба далейшага выдання «Шляху»[129].

Трэці нумар газеты, які выйшаў 25 лістапада, быў канфіскаваны, а рэдактар, як звычайна, быў арыштаваны. І толькі з выхадам К. Чартовіча з турмы праз год (12 лістапада 1933 года) быў выдадзены яшчэ адзін нумар «Шляху»—1 (4).

Бадай, найбольш рэгулярна выходзіў штомесячнік «Летапіс Таварыства беларускай школы», які пачаў выдавацца з мая 1933 года пад кіраўніцтвам Ф. Стэцкеві-

---

126 ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 283, арк. 16, 17.
127 Там жа, сп. 301, арк. 27.
128 Там жа, сп. 98, арк. 21.
129 Там жа.

ча. Разам з Р. Шырмай ён пісаў перадавыя артыкулы і іншыя матэрыялы.

«Летапіс Таварыства беларускай школы» быў сустрэты станоўча. «Беларуская газета» ў артыкуле «Па старонках «Летапісу» пісала ў 12 нумары (30 лістапада 1933 года), што ён за кароткі час існавання здабыў сабе папулярнасць.

«Летапіс» выходзіў нерэгулярна. Гэта было звязана з праследаваннямі ТБШ, беларускай радыкальнай прэсы, з хістаннямі ў Галоўнай Управе і, зразумела, з матэрыяльнымі цяжкасцямі. На выданне часопіса патрэбны былі сродкі, а іх не хапала. Толькі адно памяшканне рэдакцыі ў месяц каштавала 70 злотых, выпуск часопіса — 250[130]. Часта аб'ядноўваліся тры і нават чатыры нумары ў адзін.

Часопіс выдавала рэдакцыйная калегія ў складзе Ф. Стэцкевіча, С. Паўловіча, М. Танка (вёў літаратурны аддзел), Р. Шырмы і В. Тумаша, людзей розных поглядаў, але меўшых вялікі вопыт і публіцыстычнай і выдавецкай работы. Супрацоўнічаў М. Манцэвіч, член рэдкалегіі часопіса «Беларуская борць», член ТБШ. Часопіс, адзінае радыкальнае выданне, карыстаўся вялікім поспехам, аб чым сведчыла і колькасць падпісчыкаў, лік якіх быў больш за 2700 чалавек. Папулярнасць выданню надаваў удзел у ім вядомых пісьменнікаў П. Пестрака, М. Васілька, М. Машары, А. Дубровіча, А. Іверса і больш маладых — Г. Новік, Н. Тарас.

Рэдакцыя падтрымлівала платформу Народнага фронту, вяла актыўную барацьбу за развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва, папулярызавала вусную народную творчасць, асабліва песні. Крытыкаваліся ў часопісе праявы буржуазна-нацыяналістычнай абмежаванасці і налёту мадэрнізму ў заходнебеларускай культуры, літаратуры і мастацтве.

Пастановаю Віленскага староства ТБШ было закрыта 2 снежня 1936 г., але выдавецкая дзейнасць яго не была спынена. Часопіс атрымаў назву «Беларускі летапіс». У 1937 годзе было выпушчана 2 нумары, у 1938 годзе — 5, 1939—1. У гэты час часопіс не змог надрукаваць ніводнага матэрыялу, у якім выстаўлялася б тая ці іншая праблема нацыянальна-вызваленчага руху.

---

[130] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, сп. 463, воп. 1, арк. 29.

7 сакавіка 1933 года ЦК Камуністычнай партыі Польшчы звярнуўся з адкрытым пісьмом да працоўных Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з прапановай стварыць адзіны фронт сумеснай барацьбы супраць фашызму. КПЗБ адгукнулася на гэту прапанову. Па ўсёй Заходняй Беларусі пачалася кансалідацыя сіл працоўных. Адным з буйных дасягненняў гэтага перыяду стала выданне «Беларускай газеты». «Выходзячая ў Вільні «Беларуская газета»,— адзначалася ў адным з дакументаў ЦК КПЗБ,— мае вялікае значэнне. Яна з'яўляецца адначасова арганізуючым цэнтрам нацыянальна-вызваленчага руху, і сродкам агітацыі, і трыбунай барацьбы з нацыянал-фашызмам. «Беларуская газета» карыстаецца вялікай папулярнасцю ў масах і паспела завяваць сабе шырокае кола не толькі чытачоў, але і платных падпісчыкаў і карэспандэнтаў»[131].

Газета выдавалася ў час так званага «жэста ўзаемапавагі» польскіх улад да СССР пасля падпісання ў 1932 годзе пакта аб ненападзе, калі часова аслаб тэрор акупантаў на заходнебеларускіх землях. Газета фактычна з'явілася легальным друкаваным органам партыі. Рэдактарам-выдаўцом газеты («зіцрэдактарам») стаў А. Карповіч, кіравалі — прадстаўнікі ЦК КПЗБ Я. Міско (Лазар) да 6 нумара, а затым В. Таўлай (Васіль)[132], якім належалі ўсе праграмныя артыкулы, В. Эпштэйн (Даніла), А. Зубовіч (Юрка).

«Беларуская газета» стала масавым выданнем. Яна мела сваіх карэспандэнтаў па ўсёй Заходняй Беларусі.

Актыўнымі аўтарамі газеты сталі паэты М. Васілёк (М. Касцевіч), Звястун (П. Пестрак), Я. Чабор (І. Патаповіч), былы хадэцкі паэт Ф. Грышкевіч, які пагадзіўся з лініяй «Беларускай газеты», П. Граніт (І. Івашэвіч), М. Засім і інш.

Газета друкавалася параўнаўча невялікім тыражом— 2000 экземпляраў, з іх 1800 рассылалася на правінцыю, каля 100 распаўсюджвалася ў Вільні і столькі ж у Беластоку. Яна мела каля 500 платных падпісчыкаў. Такою

[131] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 98, арк. 402—403.

[132] В. Таўлай (1914—1947) у 1930—1932 гг. быў у Савецкай Беларусі, у канцы 1932 года вярнуўся ў Вільню і з верасня да арышту (чатыры месяцы) рэдагаваў газету.

лічбаю не магла пахваліцца ў гэты час ніводная беларуская буржуазная газета. «Беларускую газету» выпісвалі нават ваявода, следчы аддзел паліцыі ў Беластоку, II аддзел генеральнага штаба ў Вільні і інш.[133]

Для тэхнічнай работы — праўкі карэктуры, карэспандэнцый у рэдакцыю была запрошана А. Буднік, старэйшы член КПЗБ з Беласточчыны. Некаторую тэхнічную работу ў рэдакцыі вялі сёстры З. і Л. Асаевіч. Л. Асаевіч працавала таксама сувязной паміж В. Таўлаем, А. Зубовічам, якія жылі нелегальна, і рэдакцыяй[134]. У распаўсюджванні газеты дапамогу рэдакцыі аказвалі вучні Віленскай беларускай гімназіі.

Газета выходзіла два разы ў месяц. Сродкаў ад падпіскі хапала толькі на ўтрыманне рэдактара ды іншыя невялікія выдаткі.

Ад 8 чэрвеня да 30 студзеня 1934 года газета выйшла 17 разоў.

«Беларуская газета» смела і адкрыта выступіла ў абарону інтарэсаў працоўных мас Заходняй Беларусі. Пільнага вока яе карэспандэнтаў не прамінуў ніводзін заслугоўваючы ўвагі факт: забастоўка беластоцкіх тэкстыльшчыкаў, беспрацоўе ў Вільні, акруговы з'езд ТБШ. Многа месца яна ўдзяляла асвятленню міжнароднага становішча і асабліва выкрыццю германскага фашызму. У першым нумары «Беларуская газета» змясціла вялікі артыкул П. С — кага «У краіне свастыкі», у якім гаварылася аб росце фашызму ў Германіі і выніку першых месяцаў яго праўлення дзяржавай —7 мільёнах беспрацоўных і 170 тысячах зняволеных у турмах. Ужо тады аўтар прадбачліва пісаў, што, калі Гітлер развяжа імперыялістычную вайну,— век дзяржавы «нацыянальнага адраджэння» III Рэйха будзе кароткім. У дзесятым нумары «Беларуская газета» змясціла перадавы артыкул «Гітлер — Еўропа — мы», у якім зноў перасцерагала працоўных, заклікала іх змагацца з фашызмам. У гэты час Германія выйшла з Лігі Нацый. У нумары 12 і 13 шырока асвятляўся працэс над Г. Дзімітравым.

Але асноўная ўвага, зразумела, удзялялася справам у самой Польшчы. У другім нумары (23 чэрвеня) газета выступіла з артыкулам, у якім выкрывала ідэалогію БХД. Газета хадэкаў «Беларуская крыніца» ў адным з

---

[133] ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, сп. 463, арк. 23—26.
[134] Там жа.

артыкулаў тлумачыла прычыны эканамічнага крызісу ў Польшчы развіццём тэхнікі, аб'яднаннем вёскі і інш. «Беларуская газета» дала адпор. Яна расказала аб асноўных супярэчнасцях капіталістычнай вытворчасці, аб яе няпланавым развіцці. «Крызісы — родныя дзеці сучаснай гаспадарчай будовы,— пісала газета.— Крызісы — адзнакі, сімптомы распаду яе. Крызісы можна ліквідаваць, толькі ліквідаваўшы прычыны іх».

Буйным дасягненнем рэдакцыі «Беларускай газеты» з'явілася стварэнне адзінага фронту заходнебеларускіх пісьменнікаў. Яшчэ ў 1931 годзе І. Патаповіч (Янка Чабор) спачатку ў польскім часопісе «Месёнчнік літэрацкі», а затым ва ўкраінскім прагрэсіўным літаратурным часопісе «Вікна» (Львоў) змясціў адкрыты ліст да заходнебеларускіх літаратараў з заклікам аб'яднацца ў адзіную пісьменніцкую арганізацыю Заходняй Беларусі па прыкладу палякаў і ўкраінцаў і выдаваць свой літаратурны часопіс.

Заклік быў падтрыманы. Дапамагла ў гэтым «Беларуская газета», якая ўважліва ставілася да творчасці не толькі прафесіянальных паэтаў і пісьменнікаў, але і чытачоў. У газеце працавалі В. Таўлай, М. Танк, П. Пестрак, А. Іверс, М. Васілёк, М. Засім, П. Радзюк, А. Дубровіч, І. Патаповіч і іншыя.

У сёмым нумары рэдакцыя змясціла артыкул «Створым літаратурны цэнтр!», у якім пісала: «... па розных пунктах краіны раскіданы паэты-самародкі, якія і сваім жыццём і сваёю творчасцю неразлучна звязаны з народнымі масамі. Іх гуслі — гэта злыбеды сённяшняга жыцця народа, гэта свядомасць гора і радасць працы, гэта сны і летуценні пра лепшае заўтра. Таму іх творчасць блізкая і зразумелая масам народа, таму яна ідзе ў народ і звычайна ў форме безымянных песень-вершаў узбагачае духоўны народны скарб».

У восьмым і дзесятым нумарах «Беларуская газета» змясціла літаратурныя старонкі. Першая з іх адкрывалася артыкулам «З народам» (аўтар — Т. Свет). Аўтар пісаў, што мастацкая літаратура ў грамадстве адыгрывае вялікую ролю, з'яўляючыся магутным сродкам арганізацыі і выхавання мас, стымулам, які «варушыць мільёны, бадзёрыць, закальвае іх душы». Аднак заходнебеларускія маладыя рэвалюцыйныя паэты і празаікі не мелі ніякай магчымасці друкавацца, бо часопіс «Шлях моладзі», лі-

таратурныя куткі ў «Родным краі» з'яўляліся «толькі прыманкай маладых, несвядомых сіл у сеці ХД». Артыкул Т. Света заклікаў заходнебеларускіх літаратараў стварыць літаратурны фронт, ісці з народам.

На першай літаратурнай старонцы былі змешчаны апавяданне Рытмы «Свой хлеб», вершы Волата «Давайце збудуем будынак», М. Васілька «Я прагну» і «Я пралетар», В. Канцавога «Дуб зялёны» і інш. Не ўсе вершы ў ідэйных адносінах былі раўназначнымі. У той час, як М. Васілёк у вершы «Я пралетар» пісаў: «Ахвяру прынясу табе, мазольна праца, юнацкіх сіл пахоп складу на твой алтар — збудую для цябе з красы, з агню палацы. Я!!! — пралетар!», У. Шчыры ж пісаў: «А мы сядзелі ў цені дрэў», «казала ты кахаць гатова», «агонь не паліць больш людзей» і г. д.

На другой літаратурнай старонцы выступілі А. Рэдзька, П. Граніт, М. Васілёк, Звястун і інш. М. Танк пісаў: «Цябе вітаю, «Беларуская газета», і працы чэсць тваёй я аддаю: ты самародных узгадоўваеш паэтаў, каб песню смела грымнулі сваю». П. Пестрак (Звястун) у вершы «Зорка міргае слёзна ў небе начным», напісаным у Гродзенскай турме, выказваў пачуцці зняволенага, які сядзіць за турэмнымі кратамі.

Вершы, надрукаваныя ў «Літаратурных старонках», у жорсткіх умовах белапольскай цэнзуры, заклікалі працоўныя масы да барацьбы, да арганізацыі. Слабей былі напісаны апавяданні, замалёўкі.

У рэдакцыю прыходзіла столькі мастацкіх твораў, што друкаваць усё газета не магла. Вакол «Беларускай газеты» згрупаваўся літаратурны актыў. 10 снежня 1933 года на кватэры ў тэхнічнага работніка газеты і сувязнога кампартыі Л. А. Асаевіч нелегальна адбылася I канферэнцыя рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі. У прынятай канферэнцыяй дэкларацыі гаварылася: «Кідаючы гэты адкрыты вызаў барацьбы на літаратурна-мастацкім фронце ў нацыянальна-вызваленчым руху, мы кідаем заклік да ўсяго, што ёсць разумнага, свядомага, да працоўнага ў нашай краіне, да пісьменнікаў, выйшаўшых з асяроддзя сярмяжнага люду, да пісьменнікаў ад варштата і плуга — зразумець адказнасць сучаснага стану. Клічам вас да згуртавання вакол часопіса «Літаратурная старонка». Клічам на творчую працу для народа і разам з ім. Мы разумеем умовы, разумеем, што

перад намі цяжкасці і перашкоды, але тым з большым запалам бяромся за працу, за ажыццяўленне даўно наспелай думкі аб утварэнні каля часопіса свае ўласнае сялянска-работніцкай пісьменніцкай кагорты — арганізацыі»[135].

Стварэнне арганізацыі рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі мела вялікае значэнне. Аднак у канцы студзеня 1934 года «Беларуская газета» была закрыта, а В. Таўлай, П. Пестрак і іншыя супрацоўнікі газеты арыштаваны. Першы нумар месячніка «Літаратурная старонка», падрыхтаваны да друку В. Таўлаем, выйшаў толькі 25 студзеня 1934 года пад рэдакцыяй І. Патаповіча і адразу ж быў канфіскаваны. Рэдакцыя прадбачыла гэта, і каля 20% тыражу не трапіла ў рукі паліцыі.

Сатырычны заходнебеларускі часопіс «Асва» («Аса») з'явіўся ў свет 25 сакавіка 1934 года. Гэта было другое пасля «Маланкі» сатырычнае выданне за ўсю гісторыю развіцця заходнебеларускай радыкальнай прэсы. Рэдактарам двухтыднёвіка стаў член КПЗБ П. Радзюк, а агульнае кіраўніцтва па лініі ЦК КПЗБ ажыццяўляў В. Е. Самуцін. Тыраж часопіса складаў 1500 экземпляраў. Выданне аб'яднала вакол сябе лепшых паэтаў-сатырыкаў, фельетаністаў, карыкатурыстаў. Яно выдавалася пад лозунгам «Гумар і сатыра — зброя ў руках працоўных». У артыкуле «Ад рэдакцыі» «Асва» пісала: «Сваімі наша «Асва» лічыць усіх тых, хто мазолістай працай за варштатам і плугам здабывае сабе магчымасць існавання»[136].

Часопіс смела выкрываў польскія ўлады, падрыхтоўку да вайны, гітлерызм, змагаўся з беларускімі нацыяналістамі. У чацвёртым нумары (30 красавіка) «Асва» ў артыкуле «Адказ правакатарам-даносчыкам» пісала: «Асва» ёсць паступовы нацыянальна-вызваленчы орган гумару і сатыры беларускага народа на Заходняй Беларусі. Яна мае намер паглыблення сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці працоўных мас шляхам праўдзівага паказу падзей. «Асва» адкрыта змагаецца з беларускім буржуазным нацыяналізмам, ізалюючым беларускі народ ад народаў расійскага, польскага і інш.»[137]

---

[135] Цыт. па кн. К. Хромчанка. Піліп Пестрак. Жыццё і дзейнасць. Мінск, 1960, стар. 18.

[136] Часопіс праіснаваў пяць месяцаў. З шасці нумароў тры былі канфіскаваны.

[137] «Асва», 1934, № 4, стар. 2.

У чацвёртым нумары, прысвечаным Першамаю, змяшчалася карыкатура пад назвай «Гітлерызм святкуе», аб тым, як «святкуюць» Першамай Гітлер, лідэры II Інтэрнацыянала (Бауэр, Вандэрвельд, Каўцкі, Блюм, Недзялоўскі) і шэсць палітычных партый Польшчы, у тым ліку ППС, Бунд, Паалей Сыён.

Многія карыкатуры, як і ў «Маланцы», тут рабіў мастак Ю. Горыд.

М. Танк пісаў аб «Асве»: «Пасля «Маланкі» і «Асвы» мы амаль зусім развучыліся смяяцца...»[138] Зразумела, не таму, што не ўмелі, а таму, што не маглі.

Самым знамянальным з'явішчам у гэты час стала выданне газеты «Наша воля» (1935—1936 гг.), «беларускай незалежнай двухтыднёвай газеты». Гэты друкаваны орган быў задуманы ЦК КПЗБ як легальны камуністычны двухтыднёвік яшчэ летам 1935 года разам з двухтыднёвікам на польскай мове «Папросту». Быў падабраны штат супрацоўнікаў, якія дзейнічалі легальна. Восенню 1935 года ў Вільню быў выкліканы Я. Скурко (М. Танк). Працавалі ў газеце С. Малько, М. Бурсевіч, Р. Шырма. Агульнае кіраўніцтва па лініі ЦК КПЗБ праводзіў Т. Будкевіч (псеўданім Трахім). Рэдактарам газеты быў зацверджаны студэнт-юрыст Віленскага універсітэта В. Склубоўскі, які прымаў удзел у рэвалюцыйным руху ў 1936—1938 гг. В. Склубоўскі ўспамінае: «1936 год быў годам уздыму рэвалюцыйнага руху. У яго выніку была выдадзена «Наша воля», якая выражала рэвалюцыйную думку, паколькі гэта было ў тагачасных цэнзурных умовах магчыма і гуртавала каля сябе лявіцовых пісьменнікаў і паэтаў — асабліва прыхільнікаў КПЗБ. Яе выданне адбываецца на ўмовах найбольшага і ўзрастаючага тэрору санацыйных улад»[139].

Аднак першыя нумары газеты не былі да канца паслядоўнымі. У адным з дакументаў ЦК КПЗБ чытаем: «Выдавецтва. Выйшаў ужо адзін нумар II (шыфр, маецца на ўвазе газета «Наша воля».— *С. Г.*), легальнае выданне, якое яшчэ далёка ад таго, якое хацелася б. Але ў далейшым нам трэба яго расшырыць, даць яму наш напрамак, у якім трэба адлюстроўваць становішча на-

---

[138] М. Танк. Лісткі календара. «Полымя», 1967, № 1, стар. 69.
[139] Цыт. па пісьму В. Склубоўскага ад 23 красавіка 1967 г., якое захоўваецца ў мяне.— *С. Г.*

шай вёскі. Яны (легальная частка рэдакцыі.— *С. Г.*) згаджаюцца на гэта і аддаюцца пад наш поўны кантроль»[140].

Першы нумар газеты выйшаў 24 снежня 1935 года. М. Танк успамінае: «Ва ўсіх нас — святочны настрой. Пасля столькіх захадаў выйшаў першы нумар газеты «Наша воля»[141].

Аднак, нягледзячы на неакрэсленую праграму першых нумароў, на асветніцка-культурны напрамак газеты, яе ўсё роўна канфіскавалі і выходзіла яна з белымі плямамі. «Больш палавіны матэрыялаў на першай і другой старонках у № 11(12) зняў цэнзар. Быў канфіскаваны перадавы артыкул Паўліка (С. Малько.— *С. Г.*) «Супольнымі сіламі да супольнай мэты», артыкул Р. «Мы за абарону міру», інфармацыя П. «Як ідзе школьная справа» і мой верш»[142].

Пастунова пад уздзеяннем КПЗБ газета пачала адыходзіць ад культурніцкіх поглядаў і станавіцца на народнафрантавы шлях барацьбы за поўнае вызваленне працоўных.

Рос карэспандэнцкі актыў, умацоўвалася ідэалагічная платформа газеты. З 5(6) нумара (20 сакавіка) газета пачала выходзіць раз у месяц. Закрыта была 23 жніўня 1936 года на 12(13) нумары[143].

Газета імкнулася падтрымаць адзіны літаратурны фронт. Друкавала вершы М. Танка, М. Васілька, Я. Купалы, М. Засіма, А. Іверса, П. Праменя, М. Машары, публіцыстычныя артыкулы.

Шмат увагі «Наша воля» ўдзяляла паказу жыцця і барацьбы заходнебеларускага пралетарыяту. У 5(6) нумары газета паведаміла аб забастоўцы рабочых на шклозаводзе «Нёман», дзе працавала 1500 чалавек. Жанчыны тут за 12—18-гадзінны рабочы дзень атрымлівалі па 0,8—0,9 злотых, мужчыны — 1,1—1,5. Рабочыя шклозавода не мелі выхадных дзён.

2 сакавіка 1936 года на заводзе ўзнікла забастоўка 670 рабочых, якія патрабавалі паляпшэння ўмоў працы

---

140 ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 242, воп. 1, спр. 506, арк. 41.

141 М. Танк. Лісткі календара. «Полымя», 1967, № 1, стар. 78.

142 Там жа, стар. 102.

143 У манаграфіі «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии» (стар. 348) памылковае сцвярджэнне, што газета «Наша воля» пачала выходзіць у пачатку 1936 года.

і жыцця. Бастуючым дапамагалі рабочыя іншых прадпрыемстваў і сяляне, збіраючы грошы і прадукты.

У гэтым жа нумары газета паведаміла аб забастоўцы на Лідскай гумавай фабрыцы «Ардаль».

4 лютага «Наша воля» надрукавала карэспандэнцыю «Стрэлы ў зале Вілейскага акруговага суда», у якой паведаміла аб пакаранні С. Прытыцкім правакатара Я. Стральчука.

Перадавы артыкул газеты падводзіў вынікі барацьбы працоўных за 1935 і першую палову 1936 года. «Наша воля» пісала аб новай вайне, якая ўжо ішла на планеце (Італія ваявала супраць Абісініі, вялася падрыхтоўка да вайны ў Германіі і Японіі) і заклікала да салідарнасці ўсіх прыгнечаных і эксплуатуемых у барацьбе супраць вайны і фашызму. Газета выступала супраць прадажных беларускіх пісак, польскіх буржуазных публіцыстаў. Так, у адным з нумароў «Слова» яго рэдактар і публіцыст Цат-Мацкевіч выступіў з патрабаваннем прымусовай асіміляцыі беларусаў. С. Малько ў 10(11) нумары «Нашай волі» змясціў артыкул «Не здадзімся», за які газета была канфіскавана. Аднак улады не маглі перашкодзіць распаўсюджанню артыкула. Яго перадрукавалі многія польскія газеты, у тым ліку і віленскі дэмакратычны двухтыднёвік «Карта», які рэдагаваў Ю. Путрамент. «Карта» зрабіла прыпіску ад рэдакцыі: «Ёсць артыкулы, у якіх губляецца аўтар і гавораць мільёны... Да такіх артыкулаў належыць артыкул «Не здадзімся», надрукаваны ў 10 нумары незалежнага беларускага двухтыднёвіка «Наша воля»[144].

С. Малько з болем пісаў: «Мы любім сваю родную мову, свае песні, сваю нацыянальную культуру... Мова беларуская — гэта мова, якую ўспрыняў наш народ з вуснаў сваіх матак. На гэтай мове нашы бацькі расказалі нам аб цяжкай нядолі нашага народа, і ў гэтай мове знайшло сваё адлюстраванне змрочнае мінулае, наша барацьба і наша шчасце. Гэта мова будзе жыць так доўга, як доўга будзе жыць беларускі народ і яна не змоўкне па патрабаванню паноў мацкевічаў».

«Наша воля» і «Беларускі летапіс» былі апошнімі дэмакратычнымі выданнямі на беларускай мове. ЦК КПЗБ імкнуўся выкарыстаць легальныя выдавецкія маг-

[144] Цыт. М. Танк (Я. І. Скурко). Старонкі з успамінаў. Зб. «У суровыя гады падполля». Мінск, 1958, стар. 304.

чымасці і на перыферыі — у першую чаргу ў Беластоку. Летам 1936 года тут было наладжана выданне часопіса на польскай мове «Жыце», які падпісваў настаўнік польскай мовы П. Слуцкі. У ім прымалі ўдзел члены Беластоцкага гаркома партыі В. Найдус, члены КПЗБ Е. Каплан, А. Сахарчук і іншыя[145].

Прагрэсіўныя літаратары Заходняй Беларусі ў гэты час былі пазбаўлены магчымасці друкавацца. Ад 1933 года сядзелі за кратамі, чакаючы суда, публіцысты і кіраўнікі «Беларускай газеты», часопісаў «Літаратурная старонка» і «Асва» — В. Таўлай, П. Пестрак, А. Дубровіч (А. Рэдзька), П. Радзюк, Я. Міско, І. Патаповіч, А. Буднік і іншыя — усяго 16 чалавек. Суду ўлады прыдалі гучную назву — «працэс народнавызваленчага цэнтра Заходняй Беларусі», на якім на лаву падсудных селі разам з беларусамі палякі, літоўцы і яўрэі. Следства цягнулася два з палавінай гады. Беларускіх літаратараў абвінавачвалі ў прыналежнасці да КПЗБ, арыентацыі на Савецкую Беларусь, у спробе адарвання Заходняй Беларусі ад Польшчы.

«Працэс шаснаццаці» праходзіў з 23 па 29 сакавіка 1936 года ў Вільні. Ад імя абвінавачваемых на працэсе выступілі В. Таўлай і П. Пестрак, якія баранілі права беларускіх пісьменнікаў на стварэнне літаратурнага фронту. На абвінаваўчыя словы пракурора П. Пестрак адказваў: «Так, мы — паэзія бунту, бо мы не можам не бунтавацца. Вы стварылі такія ўмовы, што нават ксёндз Казімір Сваяк бунтуе. Вы называеце нас крамольнікамі за тое, што мы клічам на бунт. Вялікі польскі патрыёт Жэромскі, які аплакваў раны польскіх паўстанцаў, таксама ў вачах рускага царызма быў крамольнікам. Вы называеце нас імгліцай. А чым ноч цямней, тым ясней гарэць зоры»[146].

31 сакавіка быў аб'яўлены прыгавор. Па 8 год астрогу атрымалі В. Таўлай, Я. Міско, А. Карповіч.[147]

За краты былі кінуты лепшыя літаратурныя сілы Заходняй Беларусі, а тыя, хто застаўся на свабодзе, не мелі магчымасці друкавацца, вось чаму М. Танк, М. Ва-

---

[145] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, стар. 349.

[146] Цыт. па арт. Пятро Глебка. Мастацкая літаратура Заходняй Беларусі, «Полымя», 1945, № 9, стар. 105.

[147] «Słowo», 1936, 30 сакавіка.

сілёк і іншыя заходнебеларускія літаратары пачалі выступаць у выданнях польскай дэмакратычнай арганізацыі «Фронт»— «Папросту» і «Карта». Арганізацыя знаходзілася пад уплывам КПЗБ. Гэта мела вялікае значэнне, бо «Фронт», створаны ў процілегласць розным маладзёжным фашысцкім арганізацыям, паказаў, што лепшая частка польскай моладзі адыходзіла ад лагера пілсудчыкаў.

*
* *

Дэмакратычны друк Заходняй Беларусі бярэ свой пачатак ад 1922 года, калі на акупаваных панскай Польшчай землях Заходняй Беларусі ўзнікае Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя. БРА дзейнічала ў нелегальных умовах, яна была звязана з КПЗБ і ў сваіх друкаваных органах, што выходзілі ў легальных умовах, шырока прапагандавала лозунгі саюза рабочага класа і сялянства, нацыянальна-вызваленчай барацьбы, сумесных дзеянняў працоўных мас Заходняй Беларусі. Менавіта друк БРА выпрацоўваў тактыку, якую выкарыстоўвалі пазней іншыя дэмакратычныя арганізацыі і сярод іх — Беларуская сялянска-рабочая грамада.

Грамада і яе друк — прыкметная з'ява ў жыцці працоўных мас Заходняй Беларусі. Перыяд 1925—1927 гадоў — час дзейнасці БСРГ—найбольш плённы ў развіцці дэмакратычнай прэсы, якая смела выкрывала фашысцкі польскі ўрад, дапамагала палымяным словам удзельнікам стачак і забастовак, паслядоўна асвятляла жыццё рабочых і сялян і ўмацаванне брацкага саюза паміж імі, спрыяла росту самасвядомасці заходнебеларускіх працоўных мас. У час дзейнасці Грамады развівалася сатырычная дэмакратычная журналістыка, выходзілі выданні на беларускай мове, лацінскай, нараджалася масавая мастацкая літаратура.

1933—1939 гады адзначаліся шматлікімі выступленнямі рабочых, сялян, рыбакоў Заходняй Беларусі. «Беларуская газета», «Барацьба», «Наша воля» і іншыя газеты, што выходзілі ў гэты час, змагаліся за ідэі Народнага фронту, былі дзейсным сродкам у барацьбе за вызваленне палітзняволеных, за стварэнне літаратурнага фронту.

Дэмакратычныя арганізацыі і іх друк пад кіраўніцтвам КПЗБ вялі барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР у адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве.

Шматгадовая барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне закончылася ў верасні 1939 года. Хутка тут пачала развівацца прамысловасць, сельская гаспадарка, народная асвета. Ужо ў 1940 годзе ў заходніх абласцях налічвалася каля 4 тысяч школ на роднай мове, 4 інстытуты, 12 тэхнікумаў. Былі створаны 3 драматычныя тэатры, 100 кінатэатраў, у кожным раённым цэнтры і вобласці выдавалася газета на роднай ці рускай мове. Перыядычны друк стаў баявым памочнікам працоўных у барацьбе за перамогу сацыялізма, за новае шчаслівае жыццё ў брацкай сям'і народаў Савецкага Саюза.

# ПАКАЗАЛЬНІК ВЫДАННЯЎ


## А

«Амністыя»—41
«Асва»—83, 84, 87

## Б

«Бальшавік»—23, 26, 55
«Барацьба»—70, 71, 88
«Беларускія ведамасці»—72, 73
«Беларуская борць»—78
«Беларуская газета»—66, 68, 72, 78, 79, 80, 81, 82, 83, 87, 88
«Беларускі дзень»—52, 58
«Беларуская доля»—10
«Беларуская крыніца»—66, 81
«Беларускі летапіс»—77, 78, 86
«Беларуская ніва»—33, 34, 35, 36
«Беларускае слова»—58
«Беларуская справа»—36, 38, 39, 40, 41
«Бюлетэнь клуба БСРГ»—45
«Бюлетэнь ТБШ»—76

## В

«Вікна»—81
«Воля працы»—60, 75
«Вольны сцяг»—7, 14, 16, 17, 18, 19, 22, 23

## Г

«Газета варшаўска»—13
«Грамадскі голас»—14
«Глос комуністычны»—6
«Голас беларуса»—13, 25
«Голас працы»—59, 61, 67

## Д

«Дзённік віленскі»—30
«Доля працы»—60
«Думка працы»—45, 57, 58

## Ж

«Жыццё»—87
«Жыццё беларуса»—32

## З

«Зарава»—10
«Заранка»—77
«З рабочага фронту»—20
«За працу»—68
«Зара працы»—61
«За праўду»—36
«Змаганне»—13, 16, 21, 23

## І

«Інфармацыйны бюлетэнь ТБШ»—76

## К

«Карта»—86, 88
«Красавік»—60
«Крыгалом»—70
«Кур'ер варшаўскі»—35
«Кур'ер віленскі»—35, 36
«Кур'ер поранны»—37

## Л

«Левар»—70
«Летапіс»—77
«Летапіс ТБШ»—75, 76, 78
«Літаратура і мастацтва»—49
«Літаратурная старонка»—82, 83, 87

## М

«Маланка»—28, 30, 45, 46, 47, 57, 58, 83, 84
«Месячнік літэрацкі»—81

## Н

«На варце»—64, 66, 69
«Наш бюлетэнь ТБШ»—76
«Наша бацькаўшчына»—58
«Наша воля»—45, 84, 85, 86, 88
«Наш водклік»—45
«Наша газета»—64, 66, 69, 76
«Наш голас»—44, 45, 48, 49
«Наша змаганне»—23
«Народ»—58
«Народная справа»—27, 42, 48
«Народны звон»—28, 45, 47
«Наша жыццё»—10
«Наш кліч»—36
«Наш сцяг»—7, 8, 9, 10, 11, 12, 14, 15, 17, 21, 22, 23, 72
«Наша справа»—43, 44
«На прадвесні»—36
«Наша праца»—52, 53, 54, 55, 56, 62
«Наш палетак»—76, 77
«Наша праўда»—51, 52
«Новае жыццё»—10, 24
«Новая маланка»—47

## П

«Папросту»—84, 88
«Палітыка»—16
«Полымя»—84, 85
«Полымя рэвалюцыі»—49, 56
«Праца»—30, 51, 52, 66
«Пшэглёнд віленскі»—51

## Р

«Родны край»—82
«Родныя гоні»—77

## С

«Савецкая Беларусь»—66
«Саха»—57, 77
«Свет»—66, 68, 72
«Світанне»—66, 72
«Слова»—66, 77
«Слова працы»—68
«Студэнцкая думка»—57
«Сялянская ніва»—58
«Сялянская праўда»—25, 28, 73, 74
«Сын беларуса»—25

## Х

«Хрысціянская думка»—58

## Ч

«Чырвоны сцяг»—23

## Ш

«Шлях»—77
«Шлях моладзі»—82

## ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁН


### А

Араншам Л.—23
Арэхва М. С.—4
Асаевіч З. А.—80
Асаевіч Л. А.—80, 82

### Б

Бабровіч Я. (Сымон)—32, 49
Баргановіч Г.—73
Бергман А.—4, 25
Баран С.—17
Бартуль А.—50
Брун Ю.—69
Брусаў В. 52
Будкевіч Т. 84
Буднік А.—69, 80, 87
Бурсевіч М.—64, 84

### В

Валошын П. П.—18, 21, 35, 43, 44, 64
Валынец Ф. І.—59, 61, 64, 65, 67, 68, 75
Варава У.—32
Васілёк М.—46, 50, 67, 78, 79, 81, 82, 85, 87, 88
Віленчук А.—71
Война А.—28
Война Л. А.—4, 28

### Г

Гарэцкі М.—9, 72
Гаўрылік І. Е.—59, 61, 64, 65, 75
Германовіч Я.—60
Глебка П.—87
Глінская Т. Ю.—24, 59
Горыд Я.—46, 84
Грабскі У.—34, 73
Грынкевіч С.—22
Грышкевіч Ф.—79
Грэцкі І.—59, 61, 62, 68
Гурын М. (Маразоўскі)—57, 58

### Д

Дварчанін І. С.—46, 59, 61, 64, 65, 68, 75
Дзімітраў Г.—80
Дзядовіч С.—69
Дмахоўскі А.—72
Дорнбергер П.—70
Дубровіч А. (Рэдзька)—50, 78, 81, 82, 87

### З

Закржэўскі М.—45
Засім М.—50, 79, 81, 85
Зубовіч А.—79, 80

### І

Івашэвіч І. (П. Граніт)—50, 79
Ігнатовіч С.—64

## К

Каваль С.—69
Канцавы В.—82
Канчэўскі А.—6, 72
Канчэўскі І. (Абдзіралавіч)—9
Каплан Е.—87
Капуцкі А.—6
Каравацкі Ф.—31, 32
Карповіч А.—79, 87
Касяк Я.—45
Каханові́ч М.—72, 73
Кауцкі К.—84
Клімашэўская Г.—9
Колас Я.—52
Крывец С.—50
Крынчык П. С.—4, 59, 62, 64, 65
Крулікоўскі С.—17, 18, 20, 21
Купала Я. 11, 52, 85

## Л

Лагіновіч І. К. (Лаўрыновіч)—6, 9, 10, 11, 12, 14, 15, 19, 20
Ланцуцкі С.—17, 18
Ласковіч В. П.—4
Ленін У. І.—6, 7, 57
Ліс А.—46
Ліхач Т.—52
Лочмель І. Ф.—76
Луцэвіч М.—45

## М

Малько С.—84, 86
Манцэвіч М.—78
Маразовіч Я.—45, 46, 68
Марцінеўскі І.—33
Машара М.—45, 50, 78, 85
Маркс К.—21
Мацко А. М.—4
Мілюць А.—50
Міско Я.—79, 87
Міско І. Д. (А. Іверс)—50, 78, 81, 85
Міцкевіч А.—52
Мятла П. В.—21, 33, 36, 37, 41, 43, 44, 49, 64, 72

## Н

Найдус В.—87
Новік Г.—50, 78

## П

Палуян І.—50
Палуян У. А.—4, 27, 28, 29, 50
Патаповіч І. (Я. Чабор)—79, 81, 83, 87
Пачопка Я.—46
Паўловіч С.—76, 78
Паўлюкоўскі У. (Улад-Іпіцкі)—46
Пілсудскі Ю.—37, 38, 39, 42, 45, 46, 51, 52, 53, 56, 57, 64
Прытыцкі С. О.—86
Путрамент Е.—86
Пяткевіч М.—73

## Р

Радзюк П.—81, 83, 87
Рак-Міхайлоўскі С. А. (Баўтручонак)—9, 21, 28, 29, 41, 49, 64, 72, 74, 75
Родзевіч Л. І. (Юргілевіч)—6, 12, 14, 89
Рыдлеўскі Л.—9

## С

Сабалеўскі Ю.—41
Салагуб А.—49, 50, 56
Саладуха Я.—47
Самойла У.—49
Самуцін В.—83
Сахарчук А.—87
Сідаровіч В.—46
Склубоўскі В.—4, 84
Слабы К.—47
Слёзнік С.—47
Слуцкі П.—87
Стагановіч А.—59, 61, 62
Сталін І. В.—35

Сталевіч А.—41
Стральчук Я.—86
Стэцкевіч Ф.—76, 77, 78
Суліма У.—9, 24
Сушко П.—50

## Т

Танк М.—50, 78, 81, 82, 84, 85, 86, 87
Тарас Н.—50, 78
Тарашкевіч Б. А.—18, 19, 21, 24, 25, 28, 35, 41, 49, 65, 71, 72, 74, 75
Татарын С. Л.—4, 51
Таўлай В. П.—50, 79, 80, 81, 83, 87
Тумаш В.—78
Туркевіч Я.—32

## У

Умястоўскі —57, 58

## Ф

Фалькевіч К.—9, 10, 11

## Х

Хромчанка К. Р.—83

## Ч

Чартовіч К.—76, 77
Чатырка —58

## Ш

Шаўчэнка Т.—52
Шнаркевіч І.—75
Шыла М.—9, 68
Шырма Р. Р.—76, 77, 78, 84

## Э

Эйсак А.—44
Эпштэйн В.—79

# ЗМЕСТ


АД АЎТАРА . . . . . . . . . . . . . . 3

ЛЯ ВЫТОКАЎ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ . . . 5

МАСАВАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ДРУКУ Ў 1925—1927 гг. . . . . . . . . . . . . 23

ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ «ЗМАГАННЯ» . . . 60

ЗА РОДНУЮ МОВУ, НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КУЛЬТУРУ 72

ДЭМАКРАТЫЧНЫ ДРУК У 1934—1939 гг. . . . . 79

ПАКАЗАЛЬНІК ВЫДАННЯЎ . . . . . . . 90

ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁН . . . . . . . . 92

На белорусском языке

*Степан Васильевич Говин*

ПЕЧАТЬ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ
(1921—1939 гг.)

Рэдактар *А. М. Ляпіч*
Вокладка *Г. У. Важнова*
Мастацкі рэдактар *В. Ц. Лапіцкі*
Тэхнічны рэдактар *В. П. Безбародава*
Карэктары *Л. П. Марозава, Г. М. Новікаў*

АТ 06159. Здадзена ў набор 25/II 1974 г. Падпісана да друку 22/V 1974 г. Фармат $84 \times 108^1/_{32}$. Папера друкарская № 3. Фіз. друк. арк. 3. Ум. друк. арк. 5.04. Улік.-выд. арк. 5.04. Тыраж 1000 экз. Заказ 456. Цана 50 кап.

Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Мінск, вул. Кірава. 24.

Друкарня Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Мінск, вул. Кірава, 24.

50 к.